СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І II ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	III квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 МАЯ 2010 г. СЕРАДА № 95 (26703)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«РАЗВІЦЦЮ АСАБІСТЫХ ПАДСОБНЫХ ГАСПАДАРАК ГРАМАДЗЯН НЕАБХОДНА ЎДЗЯЛЯЦЬ БОЛЬШ УВАГІ»

Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе, прысвечанай разгляду гэтага пытання, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на актуальнасць праблемы і яе вялікае як эканамічнае, так і сацыяльна-палітычнае значэнне. Вядзеннем асабістых падсобных гаспадарак у той або іншай меры займаецца не менш як трэць насельніцтва краіны, гэта жыхары не толькі вёсак, але і рабочых пасёлкаў, малых гарадоў і прыгарадаў буйных цэнтраў. Прэзідэнт адзначыў, што яны ўносяць істотны ўклад у забеспячэнне харчовай бяспекі дзяржавы. Выкарыстоўваючы толькі крыху больш як 11 працэнтаў сельгасзямель, яны пастаўляюць каля 30 працэнтаў валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі. Пры гэтым не толькі забяспечваюць сябе экалагічна чыстымі прадуктамі харчавання, але і пастаўляюць іх на рынак. Важна, што ў гэтых гаспадарках вырошчваюцца найбольш працаёмкія культуры — бульба (88 працэнтаў агульнага збору), агародніна (80 працэнтаў), плады і ягады (больш як 90 працэнтаў).

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб тым, што падсобныя гаспадаркі садзейнічаюць павышэнню рэальных даходаў і дабрабыту вяскоўцаў, даючы ім істотную прыбаўку да сямейнага бюджэту. Да таго ж, на думку Прэзідэнта, такія гаспадаркі выконваюць і важную выхаваўчую функцыю. «Жыццё паказвае — там, дзе з дзяцінства прыцягваюць да працы, догляду жывёлы і агародніцтва, там менш праблем з п'янствам і іншымі негатыўнымі з'явамі», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, бываючы ў рэгіёнах, часта цікавіцца, як ідуць справы ў гэтай сферы, як мясцовыя ўлады клапоцяцца аб людзях, заўсёды нацэльвае іх на дапамогу ва ўборцы ўраджаю, арганізацыі закупкі прадукцыі, выдзяленні прыдатных зямельных участкаў і пашы. Акрамя таго, гэта тэма неаднаразова выносілася не абмеркаванне на рэспубліканскіх нарадах, даваліся канкрэтныя даручэнні ўраду і губернатарам, была распрацавана мэтавая праграма развіцця асабістых падсобных гаспадарак грамадзян на 2006—2010 гады.

Настаў час падводзіць вынікі рэалізацыі гэтай праграмы і выканання раней дадзеных даручэнняў. «Аднак па ўсім відаць, што ў гэтай сферы пахваліцца няма чым. У апошняе дзесяцігоддзе з году ў год зніжаецца вытворчасць прадукцыі, рэзка скарачаецца пагалоўе буйной рагатай жывёлы. Змяншаецца і сама колькасць падсобных гаспадарак. Так, у параўнанні з 2000 годам іх стала менш на 175 тыс., або на 14 працэнтаў. Гэта тэндэнцыя характэрна для ўсіх абласцей краіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што нельга на 100 працэнтаў пагадзіцца з той пазіцыяй, што аб'ектыўнымі прычынамі гэтага спаду з'яўляюцца скарачэнне колькасці сельскіх жыхароў, старэнне сялян, нежаданне моладзі абзавесціся падсобнай гаспадаркай. «Справа не столькі ў аб'ектыўных прычынах, колькі ў абыякавым, дакладней, у нядбайным стаўленні ў першую чаргу з боку мясцовых уладаў да клопатаў людзей, якія вядуць падсобныя гаспадаркі, — адзначыў Прэзідэнт. — Паглядзіце ж, колькі скаргаў і ў прэсе, і ў дзяржаўных органах на тое, што няма магчымасцяў гадаваць жывёлу — ні пашы, ні сенажаці, ні нармальнай арганізацыі закупак малака і іншай прадукцыі. Людзі гатовы ўкладаць сваю працу, аддаваць свой час карыснай справе, але ад нашага абуральнага стаўлення церпяць як самі сельскія працаўнікі, іх гаспадаркі, так і дзяржава ў цэлым».

Ёсць гаспадаркі і раёны, дзе кіраўнікі разумеюць важнасць гэтай праблемы і падтрымліваюць людзей, аднак у большасці раёнаў не прымаюцца канкрэтныя і эфектыўныя меры ў гэтай сферы. «Практычна ўсё кінута на самацёк, маўляў, выжывуць — дык выжывуць, а не — дык не, за прыватнікаў, здаецца, мы не ў адказе. Так нікуды не варта!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, абазначыў гэта пытанне крыху шырэй. На яго думку, на яго трэба глядзець як на работу са зваротамі грамадзян. Ён дадаў, што ў бліжэйшы час яна будзе дэталёва разгледжана на пашыранай нарадзе ў Прэзідэнта, падрыхтоўка да яе пачата ўжо: ва ўсіх рэгіёнах арганізаваны маніторынг сітуацыі, каб ведаць рэальную карціну на месцах і прымаць дзейсныя меры па вырашэнні існуючых праблем. Ад удзельнікаў нарады Аляксандр Лукашэнка чакае аб'ектыўнай ацэнкі сітуацыі і адказаў на пытанні, ці варта і далей развіваць падсобныя гаспадаркі, у якім выглядзе яны павінны існаваць, што неабходна для гэтага зрабіць.

БЕЛАРУСКІМ ЮРЫДЫЧНЫМ АСОБАМ ЗАБАРАНІЛІ НАЗЫВАЦЬ СЯБЕ ЛЕПШЫМІ І АДЗІНЫМІ

Міністэрства юстыцыі Беларусі змяніла патрабаванні да назваў юрыдычных асобаў, прыняўшы пастанову № 31 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у пастанову Міністэрства юстыцыі ад 5 сакавіка 2009 г. № 20», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў ведамстве.

Згодна з пастановай юрыдычным асобам забараняецца мець назвы, дзе ёсць словы ў найвышэйшай ступені параўнання, якія даюць магчымасць пазіцыянаваць гэту юрыдычную асобу ў якасці лідара пэўнай галіны (сферы дзейнасці). Да такіх слоў належаць «лепшы», «першы», «адзіны» і аналагічныя ім.

Акрамя таго, узгадненне назваў юрыдычных асобаў, у якіх ёсць назвы ўжо існуючых структур, будзе праводзіцца толькі з дазволу апошніх. Так, напрыклад, назва ТАА «Атлант-Брэст» будзе ўзгоднена толькі з дазволу ЗАТ «Атлант».

У Мінюсце адзначаюць, што пастанова прынята для ўдасканалення працэсу выбару назваў навастворанымі суб'ектамі гаспадарання, а таксама недапушчэння нядобрасумленнай канкурэнцыі і парушэння правоў ужо існуючых юрыдычных асобаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гусі-лебедзі ў Глінішчы

Настаўніца геаграфіі Алена МАСАЛЬСКАЯ з сынам Назарам на прыступках сядзібы ў вёсцы Глінішча Аршанскага раёна.

Некаторыя маршруты грамадскага транспарту адмяняюцца ў Мінску на летні перыяд

Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама.

З 31 мая: — аўтобусныя маршруты № 188 «ДС Захад-3 — Оперны тэатр» па будных днях; № 96 «ДС Малінаўка-4 — Сухарава — С.Кавалеўскай», № 96Д «ДС Малінаўка-4 — С.Кавалеўскай» па будных і суботніх днях; — тралейбусныя маршруты № 15 «ДС Дражня — пл. Ванеева», № 41Д «ДС Малініна — Запарожская плошча» па будных днях; — трамвайны маршрут № 11 «ДС Зялёны луг — ст.м. Плошча Перамогі».

З 1 чэрвеня: — аўтобусныя маршруты № 119 «ДС Паўднёвы захад — Масюкоўшчына» па будных днях; № 132 «ДС Дружная — Філіял БДУ» па будных і суботніх днях.

БЕЛТА.

Трагедыя

ЗАГІНУЎ ШКОЛЬНІК

17 мая ўдзень у Бабруйску загінуў 11-гадовы хлопчык. Нясшчасны выпадак адбыўся ў сярэдняй школе № 16.

— Два вучні 6-га класа, 1998 і 1997 гадоў нараджэння, у перапынку паміж урокамі знаходзіліся ў будынку школы, — паведаміла **старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці, дарадца юстыцыі Ала КУЗНЯЦОВА.** — У час сумесных гульняў адзін хлопчык пхнуў другога, які спыніўся каля аконнага праёма ў калідоры. Хлопчык упаў і ўдарыўся аб шкло, а асколкі пабітага шкла парэзалі яму грудзі. Пацярпеламу вучню медсястра аказала першую медыцынскую дапамогу, у школу выклікалі брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі, але хлопчык памёр на месцы здарэння. Па гэтым факце пракуратура праводзіць праверку.

Ул. інф.

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА БЮДЖЭТНІКАЎ У БЕЛАРУСІ ЗА САКАВІК УЗРАСЛА НА 3,1 ПРАЦЭНТА

У Беларусі намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата ў галінах бюджэтнай сферы ў студзені—сакавіку гэтага года склала Br811,4 тыс., паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Сярэдняя заработная плата бюджэтнікаў у сакавіку 2010 года была роўная Br830,3 тыс. і ў параўнанні з лютым гэтага года павялічылася на 3,1 працэнта, або на Br25,1 тыс. Рэальная заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый у студзені—сакавіку гэтага года ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам павялічылася на 4 працэнты. Гэты паказчык у сакавіку ў параўнанні з лютым 2010 года ўзрос на 2 працэнты.

У арганізацыях аховы здароўя сярэдняя заработная плата ў сакавіку склалася ў памеры Br820,4 тыс., ва ўстановах адукацыі — Br755,9 тыс. У арганізацыях навукі і навуковага абслугоўвання гэты паказчык быў роўны Br1 млн 534,5 тыс., у тым ліку ва ўстановах, вядучых навукова-даследчыя работы, — Br1 млн 511,1 тыс., з іх у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — Br1 млн 399,8 тыс. У арганізацыях культуры і мастацтва сярэдняя заработная плата ў сакавіку склала Br804 тыс. У работнікаў арганізацый фізічнай культуры і спорту сярэдні заробак дасягнуў Br1 млн. 378 тыс.

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі (акрамя суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у студзені—сакавіку гэтага года склала Br1 млн 38,3 тыс., у тым ліку ў сакавіку — Br1 млн 95,3 тыс., што на 7,8 працэнта (на Br78,9 тыс.) больш у параўнанні з лютым. Рэальная заработная плата (разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі) у студзені—сакавіку гэтага года ў параўнанні са студзенем—сакавіком 2009-га павялічылася на 5,1 працэнта. Гэты паказчык у сакавіку ў параўнанні з лютым 2010 года ўзрос на 6,6 працэнта. На прамысловых прадпрыемствах Беларусі сярэдняя заработная плата ў сакавіку гэтага года склала Br1 млн 239,7 тыс. — на 13,2 працэнта вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень аплаты працы.

Пі сваё!

МЫ П'ЁМ НЕ ТОЕ І НЕ Ў ТОЙ КОЛЬКАСЦІ

— На наш завод зусім нядаўна прыслалі на перавыхаванне алкаголіка. Нас абавязалі прыняць яго на працу, — расказвае сузаснавальнік кампаніі «Белвінгруп» (гандлёвая марка «GARSIA») Сяргей Цюшкевіч. — Гэта ж усё адно, што лісу пусціць у куратнік, але ж ён працуе — цягае скрыні. І пакуль не бачылі яго п'яным.

Можа, гэта і сапраўды кур'ёз, аднак трэба ўлічыць, што сярэдняя заработная плата на прадпрыемстве складае 1,5 мільёна рублёў, — калі чалавек не страціў апошні розум, ён зразумее, што тут ёсць за што трымацца. Нават у якасці грузчыка. Можа, і сапраўды перавыхаваецца? Тым больш, што ў Гомельскім раёне няшмат прадпрыемстваў, якія літаральна забяспечваюць жыццё і грамадзянам, і раёну, не багатаму на ўрадлівыя землі. Вытворчасць другаснага вінаробства знаходзіцца ў прыгарадным пасёлку Юбілейны. Дарэчы, і завод цяпер таксама мае назву «Юбілейны». З новымі гаспадарамі, якія выкупілі прадпрыемства са складаным лёсам год таму за мільён доларaў, пачалося і новае жыццё. У мадэрнізацыю давялося ўкласці 2 мільёны доларaў, і яшчэ столькі ж зараз інвеставана ў абаротныя сродкі.

— Да канца года яшчэ каля 1 мільёна доларaў будзе ўкладзена ў мадэрнізацыю завода, — абяцае сузаснавальнік кампаніі «Белвінгруп» Сяргей Цюшкевіч. — Укладваем сродкі ў брэнд, у навучанне людзей, у інфармацыю. Калі мы адчулі сябе ўпэўнена на беларускім рынку, вырашылі далучыцца да праграмы імпартазамяшчэння і выпускаць тыя віны, якія раней вазілі на тэрыторыю Беларусі. Такім чынам эканомяцца валютныя сродкі, на дастаўцы таксама эканомія, падаткі меншыя і цана нашмат ніжэйшая атрымліваецца.

СТАР. 2

Добры знак

ЗАКВІТНЕЛА ГІНКГА

Упершыню ў Гомельскім цэнтральным парку заквітнела мужчынскае дрэва гінкга. Калісьці самыя першыя дрэвы, якія лічацца рэліктавымі, былі пасаджаныя ў парку яго заснавальнікамі князямі Паскевічамі.

На жаль, тыя ўнікальныя дрэвы падзялілі лёс многіх жыхароў Гомельшчыны — яны былі знішчаныя ў ліхалецце Вялікай Айчыннай вайны. Узамен іх у 60-я гады былі высаджаны новыя. Прыкладна гадоў 10 таму заквітнела жаночае дрэва — маленькімі белымі кветкамі. Але ж мужчынскае дрэва было яшчэ «зусім юнаком», расказвае **загадчыца навукова-асветніцкага аддзела Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Надзея БРАГІНА:**

— Цяпер наш «юнак» стаў сапраўдным мужчынам — заквітнеў каташкамі. Упершыню мужчынскае дрэва гінкга білоба двухлопасцевага цвіце прыкладна ў 50 гадоў. Гінкга — «жывы выкапень», дрэва існавала ад 2,5 мільярда да 250 мільёнаў гадоў таму. Гэта адзіны прадстаўнік «пераходнага звяна» паміж папаратнікамі і хвойнымі раслінамі. Пры гэтым дрэва ўстойлівае да задымлення паветра, грыбковых і вірусных захворванняў і нават насякомых. Пра яго ёсць цікавыя гісторыі. Костачка дрэва ядомая — салодзенькая. Атрымліваюцца такія абрыкосікі — нездарма ж яшчэ адна назва дрэва ў перакладзе з японскай мовы — сярэбраны абрыкос. У Японіі костачку спажываюць разам з сакэ — каб не п'янець. Драўніна гінкга практычна не згарае. Расказваюць, што ў Кітаі ў 1623 годзе здарыўся пажар, дрэвы вакол загінулі, а гэтае было пашкоджана, але выжыла. Ёсць легенда, згодна з якой, мужчынскае і жаночае дрэвы гінкга — гэта юнак і дзяўчына, якія вельмі кахалі адно аднаго, але не здагадваліся пра тое, што пачуцці ўзаемныя. Дзяўчына звярнулася да Бога, каб дачакацца ўзаемнасці ад юнака, і папрасіла ператварэння ў дрэва, якое жыве на Зямлі вельмі доўга. Бог выканаў яе жаданне і даў ёй імя Гінкга. Аднойчы юнак прыйшоў да дзяўчыны, але яе не было ўжо. І ён выказаў Богу такое ж пажаданне — каб іх каханне было вечным. З тых часін на Зямлі і растуць мужчынскія і жаночыя дрэвы гінкга.

Хто ведае, можа, прыгожая легенда ўзнікла таму, што ліставая дрэва па форме аддалена нагадвае сэрца — таму яго часта называюць дрэвам кахання. Быў нядоўгі час, калі ў гомельскі парк ішлі закаханыя, каб павесіць на галіны каляровыя стужачкі. Аднак у супрацоўнікаў парку атрымалася перамагчы гэтую традыцыю. Расліны знаходзяцца ў самым сэрцы парку — ля фантана насупраць палаца Паскевічаў. Адна ад адной стаяць на адлегласці ў 20 метраў.

— Неаплодненыя костачкі да гэтага не прарасталі, — кажа Надзея Брагіна. — Мы спадзяёмся, што наша «дама-гінкга» сёлета аплодніцца ад «мужчыны-гінкга» і ў іх будуць «дзеткі».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАД ДРЭВАМ ШЧАСЦЯ

Зінаіда і Уладзімір МІРАНОВІЧЫ каля свайго дрэва шчасця.

Зінаіда і Уладзімір Мірановічы з вёскі Окана Лепельскага раёна перакананыя, што гэтая ўнікальная хвоя — дрэва сапраўднага шчасця. Яно расце амаль што на іхнім агародзе. Некалі гэта былі два дрэвы, але, зросшыся, сталі адным цэлым. Пра гэта дрэва цяпер ведаюць не толькі на Лепельшчыне. Сюды прыязджаюць аўтобусамі, каб тройчы пралезці паміж нізкіх ствалоў і загадаць жаданне.

Гэта з лёгкай рукі Зінаіды Пятроўны дрэвы атрымалі гэткую назву.

— Бачыце, як два лёсы ў адзін злучыліся, — кажа пенсіянерка, тлумачыць і паказвае, як трэба тройчы прапаўзці пад дрэвам, паляжаць, раскінуўшы рукі нібы птушка крылы, потым перахрысціцца, абняць дрэва, прытуліцца шчакою і падняць твар да неба. — Калі загадаць жаданне, то яно спраўдзіцца.

Пытаемся, колькі разоў давялося ёй вось так пралазіць пад дрэвам.

— Вельмі многа, — адказвае Зінаіда Пятроўна, — бо я паказваю гэта ўсім турыстам. А летам яны бываюць амаль штодня і зімою таксама прыязджаюць. — Уявіце, як можна зімою прапаўзці. Але хто не хоча быць шчаслівым і здаровым?!

Калі захварэў муж Уладзімір, яна кожны дзень прыходзіла да дрэва шчасця. Летась на сядзібу Зінаіды і Уладзіміра прыязджалі і замежныя турысты з Іспаніі, Швецыі, Ірландыі, Францыі, Амерыкі. Былі немцы, галандцы і шатландцы. Зінаіда і Уладзімір жывуць разам 43 гады. Кажуць, з таго часу, як убачылі гэта дзіва, паверылі, што прырода капіруе іхнія лёсы. Шчаслівыя.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Лепельскі раён.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЭКРАН» (ПРОДАВЕЦ)
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)**

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже изолированных помещений, расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167:

Лот № 1 – изолированное помещение № 2 столовой, об. пл. 1062,8 кв.м. Начальная цена с НДС – 437 640 000 бел. руб. **Лот № 2: изолированное помещение № 3 столовой**, об. пл. 1505,1 кв.м. Начальная цена с НДС – 585 360 000 бел. руб. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Первое извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2009. Аукцион состоится **15.06.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.06.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.**

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ»

ПРОВОДИТ 29 МАЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об уменьшении уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений в Устав Общества и Государственный реестр ценных бумаг.

Акционеры могут ознакомиться с материалами собрания в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 20 мая 2010 года по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 7 с 8 часов 15 минут до 17 часов, перерыв на обед с 12 часов 30 минут до 13 часов 15 минут.

Место проведения собрания: г. Минск, Велосипедный пер., 7.

Время начала проведения собрания — 11 часов.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 24 мая 2010 года.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 9 часов до 10 часов 45 минут.

Регистрация участников собрания производится по предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров — по доверенности на передачу права участия и голосования на собрании.

Совет директоров.

УНП 100092167.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЕЎРАПЕЙСКІ ПАРЛАМЕНТ ВЫДАТКАВАЎ УКРАІНЕ 500 МЛН ЕЎРА

Еўрапейскі парламент ухваліў выдаткаванне Украіне крэдыту ў памеры да 500 млн еўра для стабілізацыі эканомікі гэтай краіны ва ўмовах глабальнага фінансавага крызісу.

У прэс-рэлізе Еўрапарламента, які абнародавала Руская служба Бі-бі-сі, сказана, што крэдытная лінія будзе даступная Украіне на працягу 30 месяцаў, і пазыка павінна быць вернута на працягу 15 гадоў.

«Крэдыт... дапаможа Кіеву фінансаваць дэфіцыт аплатнага балансу і забяспечыць яго бюджэтныя патрэбы, — сказана ў заяве. — Парламент настойвае, што ўмовы пазыкі павінны прывесці да павышэння эфектыўнасці, празрыстасці і фінансавай адказнасці».

Пры гэтым еўрапейскі парламент падкрэслівае, што, паводле меркавання дэпутатаў, фінансавая дапамога ЕС прынясе плады толькі ў тым выпадку, калі «асноўныя ўкраінскія палітычныя сілы забяспечаць палітычную стабільнасць і падтрымаюць рэалізацыю неабходных структурных рэформаў».

ПАМЕР ХАБАРУ У РАСІІ ВЫРАС

«Сярэдні памер хабару ў Расіі вырас за апошнія 4 гады прыкладна ў два разы — з 5048 рублёў у 2006-м да 8887 рублёў у 2010 годзе, сведчыць апытанне, праведзенае «Левада-Цэнтрам».

Пры гэтым колькасць хабарнікаў у Расіі павялічылася — да 31 працэнта ад колькасці апытаных. Самымі «хабараёмістымі» мерапрыемствамі аказаліся рэгістрацыя фірмы і атрыманне дазволу на прадпрымальніцкую дзейнасць. З тых, хто спрабаваў аформіць адпаведныя дакументы, хабар давалі 92 працэнты», — піша Newsru.com.

ДАСЛЕДАВАННЕ: МУЖЧЫНЫ МАНЯЦЬ ЧАСЦЕЙ ЗА ЖАНЧЫН

У сярэднім мужчына кажа няпраўду тройчы ў дзень, ці 1092 разы за год; жанчына — двойчы ў дзень, ці 728 разоў у год. Да такой высновы прыйшлі даследнікі з Навуковага музея ў Лондане. Часцей за ўсё людзі хлусяць сваім маці (25 % мужчын і 20 % жанчын), піша The Daily Telegraph.

Самай распаўсюджанай хлуснёй у мужчын з'яўляецца: «Я не так шмат выпіў», у жанчын: «Усё звычайна. Я ў парадку». Мужчыны часта хлусяць, калі, напрыклад, кажуць: «Усё звычайна. Я ў парадку», «Прабач, я не чуў твайго званка», «Я стаю ў заторы», «Ты схуднела», «Гэта тое, што я заўсёды хацеў». Да фраз, якія жанчыны часта прамаўляюць няшчыра, адносяцца: «Я не ведаю, дзе гэта. Я гэта не брала», «У мяне баліць галава», «Я купіла гэта на распродажы», «Не, я не выкідала гэта».

Брытанскае выданне паведамляе таксама, што 82 % апытаных жанчын церпяць пакуты сумлення, але сярод мужчын падобныя перажыванні спасцігліся толькі 70 % паддоследных.

Каля 75 % рэспандэнтаў лічаць, што хлусня дапушчальная дзеля таго, каб аберагчы пачуцці таго, каму маняць.

ВЫКРАДАЛЬНІКІ НАСЕННЯ

Крымінал

У Магілёве затрымана злачынная групоўка, якая болей як тры гады рабавала склады сельскіх гаспадарак.

— Увогуле зладзеі зрабілі сем набегаў у Магілёўскім, Дрыбінскім, Бялыніцкім, Чавускім і Слаўгарадскім раёнах, — расказаў **карэспандэнт аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Магілёўскага УУС Юрый ШАЎЦОЎ.** — Першым пацярпеў СВК «Калгас «Дрыбін», са склада якога без слядоў зніклі 250 кілаграмаў насення канюшыны на суму 3,7 мільёна рублёў. Склад ніхто не ахоўваў, і першы крадзеж нічому не навучыў кіраўніцтва сельскай гаспадаркі: яны толькі павесілі новы замок на дзверы склада. І літаральна праз месяц уначы зламыснікі зноў скралі насення на суму болей за 22 мільёны рублёў. Увогуле пацярпелі 6 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Міліцыя выйшла на след аднаго з групы. Ім аказаўся 25-гадовы жыхар Магілёва, які нідзе не працаваў. Калі стала вядома пра яго затрыманне, два саўдзельнікі паводзілі сябе па-рознаму. Адзін, 32-гадовы беспрацоўны магілёвец, кінуўся бегчы, але не паспеў нават пакінуць Магілёў. А 33-гадовы мужчына, ужо раней асуджаны за крадзеж насення, прыйшоў у міліцыю з пакаяннем.

Алена КАЗЛОВА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.05.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША	2 995,00	1 чэшская крона	145,72	USD	30,3946
1 еўра	3 713,50	1 польскі злоты	928,24	10 UAH	38,3625
1 латвійскі лат	5 247,94	1 расійскі рубель	98,54	1000 BYR	10,1451
1 літоўскі літ	1 075,60	1 украінская грыўня	377,94	EUR	37,6224

Агенцтва Уладзіміра Грыцкова

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДПІСАЎ УКАЗ АБ ДЗЯРЖУЗНАГАРОДАХ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 17 мая падпісаў указ аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі 40 чалавек, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Ордэна Айчыны III ступені ўдастоены старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Уладзімір Зіноўскі. Ордэна «За службу Радзіме» III ступені — камандзір воінскай часці 7434 унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік Сяргей Краўчэня.

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны муляр будаўнічага ўпраўлення № 256 ААТ «МАПІД» Фёдар Русак. Ордэнам Францыска Скарыны — прафесар кафедры баяна і акардэона Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Міхаіл Солапаў.

Шэраг грамадзян удастоены медалёў «За адзнаку ў воінскай службе», «За адзнаку ў ахове грамадзянскага парадку», «За працоўныя заслугі».

Гэтым жа ўказам галоўнаму канструктару замежнага прыватнага ўнітарнага вытворча-гандлёвага прадпрыемства «Медпрамінвест» кампаніі «СУРМЕКС Сп.зо.о.» Мікалаю Стараверaву прысвоена ганаровае званне «Заслужаны вынаходнік Рэспублікі Беларусь», начальніку Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра МУС палкоўніку міліцыі Уладзіміру Аўсяннікаву — «Заслужаны супрацоўнік органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь», трэнеру-выкладчыку Барысаўскай комплекснай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы прафсаюзаў Артуру Быкаву — званне «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь».

Кватэрнае пытанне

ШАНЦЫ ЁСЦЬ

Наша сям'я (муж, жонка, дарослы сын студэнт) па дагаворы найму займае два пакоі ў трохпакаёўцы. Наймальніца трэцяга — выйшла замуж, збіраецца пераязджаць у іншы горад, так што яе пакой павінен вызваліцца. Пытанне: ці можа выканкам засяліць туды некага з чаргавікоў? Ці ёсць шанцы ў нас вылезці з камуналкі (з улікам таго, што на 1 чалавека ў нас тады будзе больш за 20 кв. м агульнай плошчы?)

В.Р. г. Магілёў.

Раней дзейнае правіла пра тое, што вызваленае ізаляванае жылое памяшканне ў кватэры, дзе пражывае некалькі наймальнікаў, павінна выдзяляцца грамадзянам, якія пражываюць у гэтай кватэры і маюць жылую плошчу менш за вызначаную норму на аднаго чалавека, не прымяняецца пасля ўваходжання ў сілу з 1 ліпеня 1999 года Жыллёвага кодэкса. Згодна з артыкулам 74 Кодэкса, выдзяленне вызваленага пакоя ў «камунальнай» кватэры аднаму з наймальнікаў не залежыць ад памеру жылога памяшкання, якое ён будзе пасля гэтага займаць.

Пры разглядзе гэтага пытання выканкам будзе таксама кіравацца нормамі Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565).

Згодна з пунктам 55 гэтага Палажэння, вызвалены ізаляваны жылы пакой дзяржаўнага жыллёвага фонду ў кватэры, у якой пражываюць некалькі наймальнікаў па дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду выдзяляецца па пісьмовай заяве аднаму з іх па дагаворы найму жылога памяшкання ў парадку чарговасці зыходзячы з часу прыняцця на ўлік асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Калі ў кватэры адсутнічаюць наймальнікі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, вызвалены ізаляваны жылы пакой выдзяляецца наймальніку, які пражывае ў кватэры па дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду і не мае патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, па яго пісьмовай заяве з улікам даты падачы такой заявы.

Віктар САВІЦКІ.

ПАД БЕЛАРУСКІМІ КРЫЛАМІ — 140 НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ

Людзей каля ста сарака нацыянальнасцяў пражывае ў Беларусі сёння. Пра гэта журналістам паведаміў **кансультант аддзела па справах нацыянальнасцяў і прававой працы, прэс-сакратар Апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Беларусі Міхаіл РЫБАКОЎ.** Паводле яго слоў, агульная колькасць — звесткі апошняга перапісу насельніцтва.

— У Беларусі няма нейкіх асобна ўзятых нацыянальнасцяў, якія маглі б адчуваць сябе стратнымі альбо абдзеленымі, — зазначыў Міхаіл Рыбакоў. — Ёсць адзіны народ Рэспублікі Беларусь — і ў прадстаўніка любой нацыянальнасці, якая ўваходзіць у склад гэтага народа, ёсць права на сваю культурную разнастайнасць. Галоўная задача ў тым, каб гэта сітуацыя захавалася і каб гэтыя традыцыі развіваліся і надалей.

— Адзін з асноўных кірункаў нашай арганізацыі — гэта праца з моладдзю, — кажа **старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Татара-башкірская спадчына «Чышма» Эльвіра ЛЯЎШЭВІЧ.** — У лютым мы зладзілі форум моладзі, куды прыехала татарская моладзь з Расіі. Адным з асноўных кірункаў форуму сталі майстар-класы па татарскай мове. Стараемся, каб моладзь не забывалася на традыцыі сваёй нацыі.

— Традыцыі падтрымліваем і мы, — дадае **намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Беларуская цыганская дыяспара» Артур ГОМАНАЎ.** — Вось толькі, калі казаць пра адмысловыя школы для цыганскіх дзяцей, то я выступаю супраць такіх школ. Калі цыганскія дзеці будуць мець стасункі толькі паміж сабой, то інтэграцыя з іншымі нацыянальнасцямі будзе праблематычнай. Больш за тое, нешматлікія прыклады ў Еўропе сведчаць пра тое, што адмысловыя цыганскія школы могуць спрыяць развіццю міжнацыянальнай варожасці. Таму я за тое, каб цыганы вучыліся ў звычайных школах.

Грэчаская мова — для беларусаў

Школьнікі і гімназісты Маладзечна ў хуткім часе змогуць вывучаць грэчаскую мову.

— Кожны год па спецыяльнай праграме мы адпраўляем настаўнікаў на моўныя курсы ў Грэцыю, — кажа **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў «Пелапанэс» Рафаэль ДЗЯЛЬЯНАЎ.** — Такая магчымасць ёсць, у асноўным, у настаўнікаў Маладзечна і ваколіц (менавіта ў Маладзечне знаходзіцца цэнтр грэчаскай дыяспары. — **І.Л.**). Пасля таго, як яны здадуць іспыты там, змогуць распачаць выкладанне грэчаскай мовы ў нашых школах і гімназіях.

Актыўна наладжаны паездкі ў Грэцыю на аздараўленне. Прычым, як адзначыў Рафаэль Дзяльянаў, такая магчымасць ёсць не толькі ў дзяцей і моладзі, але і ў пенсіянераў.

Помнік ахвярам генацыду

Як паведаміў журналістам **старшыня Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Леанід ЛЕВІН,** у хуткім часе ў Беларусі можа з'явіцца помнік цыганам і яўрэям, якія пацярпелі ад генацыду.

— Праект помніка ўжо ёсць. Вядома і тое, як ён будзе выглядаць, працаваць над ім мы запрасілі вядомага беларускага скульптара Уладзіміра Жбанава. Адкрытыя застаюцца толькі пытанні з фінансаваннем помніка і з месцам, дзе ён будзе ўсталяваны.

Ілья ЛАПАТО.

Ніна МАЗАЙ:

«Візавы рэжым у дачыненні да грамадзян Беларусі павінен грунтавацца на тых жа прынцыпах, што і для грамадзян астатніх краін»

Францыя зацікаўленая ў пашырэнні і развіцці кантактаў з Беларуссю. Пра гэта паведаміла старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ніна Мазай на прэс-канферэнцыі, прысвечанай нядаўняму візіту дэлегацыі Нацыянальнага сходу нашай краіны ў Французскую Рэспубліку.

Як расказала сенатар, дэпутаты сустрэліся з прадстаўнікамі камісіі па еўрапейскіх справах і камісіі па інфарматыцы і свабодзе Нацыянальнай асамблеі Францыі, прысутнічалі на пленарным пасяджэнні і на пасяджэнні, дзе ўрад адказваў на пытанні парламента. Акрамя таго, беларускія парламентарыі сустрэліся ў МЗС з дзяржсакратаром па еўрапейскіх справах, членам кабінета міністраў спадаром Люлюшам, і членамі падліковай палаты. Гэта першы афіцыйны візіт парламенцкай групы ў Францыю ў адказ на наведванне групы сяброўства Нацыянальнай асамблеі Францыі, якое адбылося летам мінулага года.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Анатоль Глаз, які таксама ўваходзіў у склад дэлегацыі, падкрэсліў, што шчырую зацікаўленасць Францыі ў развіцці адносінаў з нашай краінай пацвярджае гэта візіт. І прывёў наступныя лічбы: у Нацыянальнай асамблеі Францыі існуюць дамовы аб парламенцкім супрацоўніцтве са 186 краінамі, а запрашаць да сябе ў год яна можа толькі дэлегацыі 12 краін, у лік якіх і ўвайшла Беларусь. Анатоль Глаз паведаміў, візіт насіў не толькі азнаямляльны характар. Наша дэлегацыя выступіла з некалькімі прапановамі, у прыватнасці, аб правядзенні Дзён культуры Беларусі ў Францыі.

Ніна Мазай падкрэсліла, што «такія кантакты на ўзроўні рабочых груп перараслі ў актыўны двухбаковы дыялог». Яна заўважыла, што з сёлетняга студзеня аналагічнымі візітамі абмяняліся з парламенцкімі групамі Італіі і Ізраіля. Зараз у Мінску знаходзіцца дэлегацыя парламента Латвіі, працягваецца праца рабочай групы парламента Турцыі, нядаўна з Мінска вылецела група па сувязях з парламентам Сербіі. Развіваецца і шматбаковае супрацоўніцтва. У прыватнасці, беларускія парламентарыі ўдзельнічалі ў сесіі міжпарламенцкага саюза ў Бангкоку (Тайланд), плануецца ўдзел у сесіі Міжпарламенцкай асамблеі АБСЕ ў Осла (Нарвегія).

Кажучы пра эканамічнае супрацоўніцтва з Францыяй і Еўрасаюзам у цэлым, Ніна Мазай заўважыла, што больш за палову прадукцыі, якая экспартуецца, ідзе ў краіны ЕС. Нагадала сенатар і аб прамых і ўскосных інвестыцыях у эканоміку нашай краіны, і падкрэсліла, што «лічбы гэтыя больш чым пераканальныя». «Калі раней у Мінску было 2 французскія прадпрыемствы, то цяпер іх працуе каля 40», — адзначыла Ніна Мазай. Што датычыцца палітычнага супрацоўніцтва з Еўрасаюзам, сенатар падкрэсліла, што хацелася б больш хуткага руху наперад. Гэта датычыць і вяртання парламенту Беларусі статусу спецыяльнага запрошанага ў ПАСЕ, і візавых пытанняў. «Візавы рэжым у дачыненні да грамадзян Беларусі павінен грунтавацца на тых жа прынцыпах, што і для грамадзян астатніх краін. І мы выказваемся за тое, каб працэс пошуку рашэнняў і заяўленых перамоў пачынаўся як мага хутчэй», — сказала Ніна Мазай. Яна расказала, што гэта пытанне абмяркоўвалася ў ходзе візіту ў МЗС Францыі, і яго вырашэнне — справа часу. «Разуменне таго, што сітуацыя ненармальная, існуе», — заў-важыла сенатар.

Што датычыцца пытання вяртання парламенту Беларусі статусу спецзапрошанага ў ПАСЕ, то Ніна Мазай падкрэсліла, што дыялог працягваецца. Яна нагадала, што 24 мая адбудзецца чарговая сустрэча міністраў замежных спраў ЕС і краін — членаў «Усходняга партнёрства», дзе будуць абмеркаваныя вынікі працы з моманту падпісання Пражскай дэкларацыі і перспектывы далейшага супрацоўніцтва.

У парламенцкім вымярэнні праграмы «Усходняе партнёрства» павінны ўдзельнічаць толькі члены нацыянальных парламентаў, заявіла Ніна Мазай. І ўзгадала Пражскую дэкларацыю, падпісаную старшынёй Еўрапарламента, прадстаўнікамі ЕС, кіраўнікамі краін. У адным з пунктаў гэтай дэкларацыі гаворыцца, што нацыянальным парламентам прапануецца сумесна выказацца пра стварэнне парламенцкага вымярэння «Усходняе партнёрства» (ЕЎРАНЭСТ). Другая частка гэтага артыкула датычыцца стварэння грамадзянскага форуму і адносіцца да даручэння Еўракамісіі. «Таму мы зыходзім з таго, што парламенцкае вымярэнне па духу і паводле дэкларацыі павінна быць парламенцкім вымярэннем. Нацыянальныя парламенты фарміруюць свае дэлегацыі і такім чынам парламенцкае вымярэнне працуе», — заявіла Ніна Мазай.

Алена КРАВЕЦ.

Абзац

◢ Моцны вецер стаў прычынай затрымкі двух дызель-цягнікоў у Асіповіцкім раёне. На перагонах Ялізава — Асіповічы і Дараганава — Фалічы моцныя парывы ветру павалілі дрэвы на чыгуначныя пуці. У выніку дызель-цягнікі былі затрыманыя на 10 і 36 хвілін. Пацярпелых няма.

◢ **Гродзенская мытня затрымала самую буйную ў 2010 годзе партыю кантрабанды. Фура, што ехала з Германіі ў РФ, была затрыманая 17 мая на пункце мытнага афармлення «Брузгі». Згодна з суправаджальнымі дакументамі, яна павінна была везці 15 т газетнай паперы. Пры аглядзе ў фуры выяўлена стаматалагічнае абсталяванне, радыёстанцыі, відэакамеры, адзенне, цацкі і шмат чаго іншага. Ідзе разгрузка транспартнага сродку, асартымент і кошт затрыманага тавару ўдакладняюцца. Аднак, згодна з папярэдняй інфармацыяй, агульны кошт тавару можа перавысіць 1 млн еўра.**

◢ Сёлета пры падтрымцы Глабальнага экалагічнага фонду будзе запушчаны праект па ліквідацыі Слонімскага пахавання непрыдатных пестыцыдаў, паведаміў учора журналістам нам. міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Анатоль Ліс. На знішчэнне стойкіх арганічных забруджвальнікаў Беларусі выдзелена каля $5 млн.

◢ **Сур'ёзныя траўмы — адкрытую ЧМТ, страсенне галаўнога мозгу, рваную рану галавы — атрымаў пенсіянер, інвалід 1-й групы падчас буксіроўкі яго інваліднай каляскі. ДТЗ адбылося ў вёсцы Вулька-Попінская. Жыхар вёскі Асаўцы на аўтамабілі «Опель-Вектра» буксаваў на гнуткай счэпцы трохколавую інвалідную каляску, у якой знаходзіўся яе ўладальнік. Каляска перавярнулася. Вядзецца разбор. Абодва ўдзельнікі ДТЗ былі цвярозыя. Вадзіцель аўтамабіля не меў права буксаваць каляску, аднак вырашыў дапамагчы чалавеку хутчэй дабрацца дадому, бо насоўвалася навальніца.**

◢ У Мінску ў студзені—красавіку г.г. здадзена на ўтылізацыю 686 старых легкавых аўтамабіляў. За гэты ж час на вуліцах сталіцы стала больш на на 20,5 тыс. аўто. А ўсяго сёння ў Мінску на ўліку 572 тыс. легкавікоў.

Поўны абзац

◢ **Хірургі з Ніжняга Ноўгарада дасталі з сэрца пацыенткі 5-сантыметровую швачную іголку. Жанчына нават не падазравала аб атрыманай траўме. У кардыяцэнтр 43-гадовая Любоў Запрывода звярнулася са скаргамі на рэзкае пагаршэнне самаадчування. Рэнтген лёгкіх паказаў, што ў вобласці яе сэрца знаходзіцца іншародны прадмет. Іголка пашкодзіла сценку сэрца і пранікла ў поласць правага жалудачка. У выніку ў пацыенткі развілося кровацячэнне. Падчас паўтарагадзіннай аперацыі іголку дасталі. Жанчына расказала, што напярэдадні вечарам яна шыла. Адна з іголак, па яе словах, згубілася ў складках абіўкі канапы і яе не ўдалося знайсці. Аматарка рукадзелля міркуе, што іголка ўвайшла ў яе цела падчас сну.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

РАЗЗЛАВАЎСЯ МОЦНА

на сваіх сабутэльнікаў 66-гадовы жыхар Гомеля. Сярод белага дня ён і чатыры непрацуючыя «сябры» сумесна распівалі «чарнільныя» напоі пад магазінам «Дашанька», а потым узніклі спрэчка і бойка.

У выніку ўсе чацвёра трапілі ў Гомельскую абласную клінічную бальніцу з нажавымі раненнямі брушной поласці. Старэйшаму з парэзаных пенсіянерам — 50 гадоў, малодшаму — 38.

БУДЗЕ БУРЫЦЬ СВАЮ СВІДРАВІНУ?

Спецыфічнае нафтавае абсталяванне спатрэбілася невядомаму злодзею, паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама.

У лесе, у 3-х кіламетрах ад вёскі Віша Светлагорскага раёна ён зняў з нафтавых свідравін Мармовіцкага нафтавага радовішча комплекс перадачы тэхнічнай сувязі кіравання «Каскад». Страты РУП ВА «Беларуснафта» складаюць каля 1 400 000 рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МЫ П'ЁМ НЕ ТОЕ І НЕ Ў ТОЙ КОЛЬКАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пэўныя выгоды ад дзейнасці прадпрыемства для ўсёй Гомельскай вобласці бачыць старшыня камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама Эльвіра Карніцкая:

— Пасля таго, як прадпрыемства перайшло ў рукі новага ўладара, мы атрымалі больш за сотню працоўных месцаў, растуць аб'ёмы паступлення падаткаў у бюджэт. Тая дынаміка развіцця, якую можна прасачыць сёння, уплывае на эканоміку не толькі Гомельскага раёна, але і Гомельскай вобласці. Яны займаюць каля 23 % у аб'ёмах вытворчасці па Гомельскім раёне і 6 % аб'ёмаў вытворчасці па горадзе Гомелю сярод прадпрыемстваў пазаведамаснага падпрадкавання.

Яшчэ адна лічба шмат што растлумачвае: узровень заработнай платы тут на 62 % вышэйшы, чым у сярэднім па раёне. Праўда, спажыўца прадукцыі хвалююць зусім іншыя тонкасці. І першая з іх — ці сапраўды тут напоі толькі вінаградныя? На гэтае пытанне Сяргей Цюшкевіч адказвае так:

— Асабіста я да спіртных напояў стаўлюся з пэўнай доляй негатыву. Але ж трэба раздзяляць: гарэлка — гэта адно, а вінаградныя віны — зусім іншае. Глабальная задача нашай кампаніі — паспрабаваць памяняць структуру ўжывання спіртных напояў. Наша бяда ў тым, што звычайна мы п'ём не тое і не ў той колькасці. Насычаючы рынак Беларусі вінаграднымі вінамі, у любым выпадку, мы адцягваем частку пакупнікоў і ад таннага пладовага віна, і ад моцных алкагольных напояў.

Для даведкі: летась у Беларусі спажыванне алкаголю на душу насельніцтва хоць і знізілася на некалькі працэнтаў, аднак усё ж склала амаль 12 літраў абсалютнага алкаголю (гэта амаль што 100 %-працэнтны спірт). Максімальна ж дапушчальная Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя лічба — 8 літраў. Ужыванне алкаголю звыш гэтага нарматыву, на думку спецыялістаў САЗ, вядзе да дэградацыі нацыі.

Таму гэта прынцыповае пытанне — тут няма яблычна-рабінавай сыравіны для вырабу напояў тыпу «Фартуна». Увесь вінаматэрыял купляецца толькі ў сусветна вядомых пастаўшчыкоў і апрацоўваецца пад іх пільным наглядам — хто ж захоча страціць рэпутацыю вядомай маркі? Абсталяванне і тэхналогія — таксама аналагічныя тым, дзе непасрэдна вырабляюцца вядомыя «брэндавыя» вінаградныя напоі.

— Мы ажыццяўляем ліцэнзійны разліў вядомых гандлёвых марак: бяром адтуль лепшыя вінаматэрыялы, прывозім сюды і разліваем у бутэлькі, — падкрэслівае Сяргей Цюшкевіч. — Мы сертыфікавалі 66 найменняў вінаградных вінаў: Іспаніі, Італіі, Германіі, Украіны, Малдовы. Плануем у найбліжэйшы час выпуск вінаў з Партугаліі, Францыі, Венгрыі, Грузіі. 30 % ад нашага аб'ёму — гэта спецыяльныя мацаваныя паўдэсертныя, дэсертныя, і 70 % — натуральныя віны: сухія, паўсухія і паўсалодкія. Уся прадукцыя мае адпаведныя сертыфікаты.

Летась у Беларусі спажыванне алкаголю на душу насельніцтва хоць і знізілася на некалькі працэнтаў, аднак усё ж склала амаль 12 літраў абсалютнага алкаголю (гэта амаль што 100-працэнтны спірт). Максімальна ж дапушчальная Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя лічба — 8 літраў. Ужыванне алкаголю звыш гэтага нарматыву, на думку спецыялістаў САЗ, вядзе да дэградацыі нацыі.

— Зразумела, чым супрацоўніцтва з вядомымі брэндамі выгадна беларускаму боку: гэта і імпартазамяшчэнне, і падаткі ў бюджэт, і насычэнне рынку больш якасным прадуктам па меншай цане. А чым вы здолелі зацікавіць замежных партнёраў — той жа Масандраўскі вінзавод, які лічыцца самым тытулаваным у свеце, мог бы і далей спакойна завозіць сваю прадукцыю ў Беларусь? — цікавімся ў інвестараў.

— Напэўна, тут поспех ляжыць больш у галіне асабістых стасункаў — мы працуем з гэтым прадпрыемствам 15 гадоў, добра сябруем. І сам дырэктар Масандраўскага завода, натуральна, зацікаўлены ў тым, каб віны гэтай гандлёвай маркі лепш прадаваліся ў Беларусі. Зрабіць гэта можна, толькі істотна знізіўшы цану. Але «Масандра» — дзяржаўнае прадпрыемства, і на бутляваную прадукцыю ў яго вызначаныя жорсткія цэны. А пастаўляючы нам зыходны вінаматэрыял, можна вырабіць больш прадукцыі і адначасова адчувальна зменшыць цану, прыкладна на 40 %. Дарэчы, хачу заўважыць, што многія людзі каштуюць «Масандру», якую мы прывозім з Украіны і якую разліваем тут, — і нашу вытворчасць практычна заўжды ацэньваюць крыху лепш.

— Даступнасць па цане — гэта выдатна, але існуе такі спажывецкі стэрэатып, маўляў, добрае танным не бывае...

— Найперш, наша прадукцыя не такая ўжо танная — пазіцыянуем сябе ў сярэднім цэнавым дыяпазоне. Можам прадаваць і даражэй, каб падняць рэнтабельнасць вытворчасці, але ж трэба думаць і пра тое, як заваяваць рынак, і пра спажыўцоў. «Наш» спажывец — гэта чалавек з сярэднім заробкам, які не можа сабе дазволіць пакаштаваць дарагія імпартныя віны, але ўсё ж хацеў бы выбраць якасную прадукцыю. Здзяйсняючы ліцэнзійны разліў сусветна вядомых брэндаў, мы даём яму такую магчымасць.

— На жаль, у нас такі менталітэт, што беларускі прадукт па змаўчанні лічыцца горшым, чым прывазны, хоць гэта далёка не заўсёды так, — дадае эксперт-дэгустатар міжнароднага класа, намеснік начальніка аддзела тэхналогій лікёра-гарэлачнай, вінаробнай і півабезалкагольнай прадукцыі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні Карынэ Алексанян. — Па-першае, адзначу, што ў нашай краіне дзейнічаюць нашмат больш жорсткія стандарты ў дачыненні да вінаробнай прадукцыі, чым у Еўрасаюзе, і трэба вельмі пастарацца, каб прайсці ў нас сертыфікацыю. А па-другое, я перакананая, што менавіта такія метады, якія выкарыстоўвае гомельскі завод, дазволяць нам з цягам часу павысіць культуру ўжывання алкагольных напояў, дазволяць гаварыць пра тое, што ў Беларусі калі-небудзь будзе якаснае вінаробства і мы будзем ганарыцца айчынным прадуктам.

...Любому журналісту найбольш цікава паглядзець на свае вочы — адкуль, што і як яно цячэ — і перакананца, ці так насамрэч усё гладка, як распавядаюць вытворцы. Увесь завод больш нагадвае медыцынскую ўстанову, чым вытворчую — такая тут чысціня. Асобным адкрыццём стала тое, што тэрмін «сухі вінаматэрыял» — гэта зусім не нейкі парашок-канцэнтрат, а ваўкі вінаробны прадукт, які сюды трапляе ў цыстэрнах з розных краін Еўропы. «Сухой» вадкасць называецца таму, што перш чым стаць паўсухім, салодкім ці салодкім, усе віны з'яўляюцца менавіта сухімі — у сэнсе натуральнага мінімальнага ўтрымання цукру і алкаголю.

Другое адкрыццё датычылася таго, што, каб змяніць «статус», памацнець ці пасаладзець, для сапраўднага віна ніколі не выкарыстоўваецца спірт ці бураковы цукар — як звычайна ў хатніх умовах робяць мясцовыя гаспадары. У віно ўводзіцца толькі канцэнтраваны ві-

наградны сок вытворчасці Італіі.

Намеснік кіраўніка па вытворчасці Таццяна Траховіч растлумачвае:

— Мікрабіёлаг правярае кожную партыю вінаматэрылу, які трапляе на завод. Лабараторыя прадпрыемства не толькі адбірае і кантралюе кожную партыю, але і ўсе стадыі вытворчасці кантралюе. Калі вінаматэрыял знаходзіцца «на адпачынку» — кантроль. Зрабілі купаж — кантроль. Падалі на разліў — кантроль. Гатовую прадукцыю — безумоўна, таксама лабараторыя кантралюе. І — выпісвае пасведчанне якасці, якое гарантуе бяспечнасць усіх паказчыкаў. Мы выпускаем толькі «ДАСТаўскую» прадукцыю. Раней у Беларусі дазвалялася выпускаць арыгінальныя віны, з дабаўленнем цукру. Мы ад гэтага пайшлі. Таму вінаградны матэрыял спалучаецца толькі з вінаградным сокам. Каб з сухога вінаматэрыялу атрымаць паўсухое ці паўсалодкае віно, мы павінны дадаць пэўную колькасць канцэнтраванага вінаграднага соку.

Увогуле ж нюансаў і паданняў у вінаробнай прамысловасці — непачаты край. Ёсць і свае прымаўкі. Напрыклад, такая: «Віно не трывае раўнадушнасці, шэрасці і брудных рук». Можа, таму праблемы з запасамі прадукцыі пад гандлёвай маркай «GARSIA» на складах няма — не больш за 10 дзён затрымліваюцца скрыні на заводзе. І яшчэ на ўжыванне якаснага віна значна ўплывае сезон: летам продажы ўзлятаюць на 20 %. Да снежаньскіх 80 % далёка, але ж і так вельмі нядрэнна.

САМ САБЕ САМЕЛЬЕ

Каб павысіць уласную культуру ўжывання віна і па-сапраўднаму атрымаць ад яго асалоду, варта арыентавацца, як класіфікаваць высакародныя вінаградныя напоі і як правільна яго выбраць.

Паводле беларускіх ДАСТаў, па тыпах віно падзяляецца на **натуральнае** і **спецыяльнае**. У **натуральных** вінах алкагольны градус дасягаецца працэсам закісання, і ў залежнасці ад утрымання цукру яны могуць быць сухімі (3-5 грамаў цукру на літр віна), паўсухімі (5-25 г/л), паўсалодкімі (30-80 г/л). Мацунак **спецыяльных** вінаў забяспечваецца дабаўленнем спірту — вінаграднага альбо зерневага; да гэтай групы належаць сухія, моцныя, паўдэсертныя, дэсертныя і лікёрныя віны. **Сталовымі** называюць віны натуральнага закісання мацункам не больш за 14 % аб., **моцнымі** — віны з утрыманнем спірту ад 18 % да 23 % аб.

У залежнасці ад складу выходнага матэрыялу віно можа быць **гатункавым** або **купажным**. **Гатункавыя** віны вырабляюцца з аднаго гатунку вінаграду, прычым сабранага ў адной мясцовасці; **купажныя** — гэта сумесь розных гатункаў вінаграду.

Па якасці і тэрміне вытрымкі адрозніваюць **ардынарныя** віны (выпускаюцца праз 3 месяцы пасля перапрацоўкі вінаграду, без вытрымкі), **марачныя** (вытрымліваюцца ў спецыяльных бочках не менш як 1,5 года) і **калекцыйныя** марачныя (дадаткова вытрымліваюцца ў бочках або бутэльках не менш як 3 гады).

Па колеры віны падзяляюцца на **белыя, чырвоныя і ружовыя.** Важна ведаць, што чырвонае віно прынята падаваць пакаёвай тэмпературы, бо ў ахалоджаным выглядзе яно губляе букет, белыя ж і ружовыя віны, наадварот, перад падачай ахалоджваюцца да 8—12 градусаў.

Цяпер вы з лёгкасцю зможаце расшыфроўваць вінныя этыкеткі. Што да ўжывання вінаграднага віна, то правілы «белае — да рыбы і белага мяса, чырвонае — да чырвонага мяса» еўрапейскія самелье ўжо лічаць састарэлымі. Затое раяць прытрымлівацца наступных простых схемаў: супадзенне геаграфіі стравы і віна (да іспанскай кухні падбіраць віно з Іспаніі, да французскага сыру — з Францыі, і г.д.) і баланс смаку ежы і віна (напрыклад, калі да салодкага торта падабраць сухое віно, хутчэй за ўсё, вы не адчуеце смаку ні таго, ні другога). Нарэшце, варта памятаць, што да лёгкіх закусак звычайна падбіраюцца лёгкія, маладыя віны, а да «цяжкай» ежы — насычаныя, вытрыманыя. І, безумоўна, галоўнае правіла — ведаць меру!

Ірына АСТАШКЕВІЧ, Вікторыя ЗАХАРАВА. Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

КОРЕЛИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

ЛОТ 1 — на право заключения договора аренды земельного участка на 10 лет для установки пункта обмена валюты в г.п. Кореличи, ул. Гастелло, У-1, площадь участка — 0,0014 га с кадастровым номером 423355100001001319, начальная цена — 65406 рублей.

Расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, составляют 1999449 рублей + затраты на объявления в СМИ.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляются на р/с 3602518003960 ЦБУ № 411 в г.п. Кореличи ф-л № 416 г. Новогрудок «АСБ Беларусбанк», код 152101698, УНП 500105025. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 21 июня 2010 года в 15.00 по адресу: г.п. Кореличи, пл. 17 Сентября, 9, к. 58.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения до **17.00 15 июня 2010 года** по адресу: г.п. Кореличи, пл. 17 Сентября, 9, к. 81.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «Постторг»!
Открытое акционерное общество «Постторг» (г. Минск, ул. Клумова, 3)
СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.

Собрание состоится 2 июня 2010 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Уральская, 3, РДК им. Н.Ф. Шарко.

Повестка дня:

1. Приобретение акций собственного выпуска по решению Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Клумова, 3, комната 45 с 26 мая по 1 июня 2010 года с 10.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) либо 2 июня 2010 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания в день проведения собрания с 9.00 до 9.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 25 мая 2010 года.

УНП 100036531.

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ С ОБОРУДОВАНИЕМ РУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ЗАВОД ХИМИЧЕСКОГО МЕЛА»

Аукцион состоится 21 июня 2010 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Достоевского, 1, к. 11.

Номер лота, наименование здания	Площадь здания	Начальная стоимость с НДС	Задаток 10 % от стоимости	Шаг аукциона
1. Механическая мастерская с оборудованием	2111,8 м²	669 818 237 белорусских рублей	66 981 824 белорусских рубля	6 698 182 белорусских рубля

Заявления на участие в аукционе с документами в соответствии с законодательством, а также документ, подтверждающий перечисление задатка на р/счет продавца 3012204500014 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское облуправление г. Гомель МФО 151501912, УНП 400021246 принимаются организатором аукциона с момента опубликования данного извещения по адресу: г. Гомель, ул. Достоевского, д. 1, к. 12 в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по 18 июня 2010 года включительно.

Аукцион проводится без условий.

Победителем аукциона будет признан участник, предложивший наибольшую цену. Лицо, являющееся победителем аукциона, обязано оплатить приобретенный объект в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Объект продается в собственность.

За дополнительной информацией по подготовке и проведению аукциона обращаться по телефонам:

т./ф.: 8 0232 36 34 50, 8 029 613 26 44, 8 029 662 05 52.

ГАРАНТЫ 287 17 41

ЗА ПАРАТУНКАМ АД ПАТРАЎ СОТАК ДЗІКАМІ ТРЭБА ЗВЯРТАЦЦА Ў КАМІСІЮ ПРЫ СЕЛЬСАВЕЦЕ

«Вы ведаеце, што існуе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь? Добра, што ведаеце! Дык вось трэба ёй перадаць, што надышоў час ахоўваць не жывёльны свет, а чалавека ад той жывёлы бараніць! Кажу вам пра дзікоў. Яны ў нас цэлымі вывадкамі гойсаюць! Людзі плачуць, бо ад іх адна шкода. У мяне асабіста ўвосень 30 сотак азімага трыцікале «перааралі». Зараз, гляджу, ужо да бульбы і цукровых буракоў дабраліся. Дапамажыце! Ну якая карысць ад таго дзіка?!.»

Так эмацыйна выклаў сутнасць праблемы жыхар вёскі Бобрык Пінскага раёна Уладзімір Цімафеевіч Кахновіч. Заяўнік падкрэсліваў, што навала скаранула не толькі яго, але і іншых вяскоўцаў, а таксама землі сельскагаспадарчых кааператываў.

Словы чытача мы пераадрасавалі **намесніку начальніка Пінскай міжр

19 МАЯ 2010 г. СЕРАДА № 19 (15622)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Дзмітрый ШЧЭГРЫКОВІЧ, студэнт БДУ:

«ПАКУЛЬ ЗАЙМАЙСЯ ТЫМ, ШТО ПАДАБАЕЦЦА, А ЎСЁ АСТАТНЯЕ ЯШЧЭ ПРЫЙДЗЕ»

Гэта хлопец надзіва аптымістычна настроены да беларускай навукі. У той час як большасць яго аднакурснікаў лічаць аптымальным варыянтам, уладкаваўшыся ў фірму праграмістамі, называць жыццё ўдалым, ён займаецца даследаваннем лазераў. З верасня Дзіма працуе ў навукова-даследчым інстытуце імя Сеўчанкі, а ўжо ў маі яго даследаванні былі адзначаны дыпломам I ступені на міжнароднай канферэнцыі «Першы крок у навуку- 2010», арганізаванай Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Дзіму толькі дваццаць. Ён вучыцца на чацвёртым курсе факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ. Высокі, цёмнавалосы хлопец родам з вёскі Курганне Рагачоўскага раёна. Пра беларускую навуку, жыццё-быццё ў інтэрнаце, а таксама сакрэт за 24 гадзіны паспяваць усюды, Дзіма расказаў у інтэрв'ю нашай газеце.

«МОЙ НАВУКОВЫ ДАКЛАД БЫЎ ПАДОБНЫ ДА ДЭТЭКТЫВА»

— Дзіма, раскажы, з чым ты прыйшоў да навуковай канферэнцыі?

— Увогуле даследаваннямі лазераў у нашай лабараторыі займаюцца яшчэ два чалавекі: Канстанцін Уладзіміравіч Казадаеў, мой навуковы кіраўнік, а таксама Віктар Канстанцінавіч Ганчароў — загадчык лабараторыі лазернай плазмадынамікі навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем імя Сеўчанкі. А паўдзельнічаць у канферэнцыі мне параіў мой навуковы кіраўнік. Ён сказаў, што мне патрэбна набірацца досведу. Я прыйшоў з работай, прысвечанай даследаванню лазераіндуцыраваных плазменных металічных утварэнняў. Былі людзі з Украіны, Расіі, розных гарадоў Беларусі. Усяго 37 дакладаў. Мой навуковы даклад, дзякуючы маім кіраўнікам, атрымаўся вельмі ўдалым. Ён быў падобны да своеасаблівага дэтэктыва.

— А для чаго можна прымяніць ваша вынаходніцтва?

— Мы даследуем, як узаемадзейнічае высокаінтэнсіўнае выпраменьванне з рэчывам. На падставе гэтага мы можам казаць пра пэўны механізм разбурэння. Пра паводзіны рэчыва пры пэўным уздзеянні. А ўжо на падставе гэтага мы можам вызначыць практычныя галіны, у якіх гэта можна прымяняць. Гэта можа быць атрыманне нанасасціц, можа быць апрацоўка матэрыялаў, могуць быць нейкія вузкаспецыялізаваныя рэчы. А наначасціцы, напрыклад, таго ж серабра валодаюць вялікімі бактэрыцыднымі ўласцівасцямі. Можна прымяняць у медыцыне. А таксама можна атрымліваць спектральныя фільтры. Спектральныя фільтры можна прымяняць у любой сістэме рэгістрацыі чаго заўгодна.

ККДЗ АД «ГАЛОДНАГА» ПЕРЫЯДУ ВА ЎНІВЕРСІТЭЦЕ БОЛЬШЫ, ЧЫМ АД «СЫТАГА»

— Калі ты пачаў цікавіцца навукай?

— Яшчэ са школы. Я з шостага класа вучыўся ў вочна-завочнай матэматычнай школе пры БДУ, ездзіў на алімпіяды. Пасля вырашыў паступаць у ліцэй БДУ. І паступіў. Ён вельмі шмат мне даў. Тут былі настаўнікі зусім іншага плану. Не тое, каб яны былі лепшыя за настаўнікаў вясковай школы. Але яны ўсе працавалі ва ўніверсітэце, таму і прафесійны ўзровень вышэйшы. У ліцэі было шмат цікавых і вельмі таленавітых людзей, гэта прымушала самаўдасканальвацца. Першыя спробы эксперыментаў былі ўжо тут. Мы тады праводзілі самастойнае даследаванне вадзяных варонак. Пасля я адышоў ад эксперыментальнай фізікі ў матэматыку. Напісаў на трэцім курсе працу па тэорыі верагоднасці і матстатыстыцы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)



СВЯТА ПІЯНЕРЫІ

88 гадоў таму, 19 мая 1922 года, была створана першая піянерская арганізацыя

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў многіх гарадах тады яшчэ Савецкай Расіі сталі ўзнікаць дзіцячыя арганізацыі, групы і аб'яднанні. Кампартыя даручыла камсамолу стварыць адзіную дзіцячую камуністычную арганізацыю, і 19 мая 1922 года Другая Усерасійская канферэнцыя камсамола прыняла рашэнне пра паўсюднае стварэнне піянерскіх атрадаў. У кастрычніку таго ж года V Усерасійскі з'езд РКСМ пастанавіў аб'яднаць усе піянерскія атрады, арганізаваныя ў розных гарадах краіны, у дзіцячую камуністычную арганізацыю «Юныя піянеры імя Спартака».

У 1924 годзе ёй было нададзена імя Леніна. А пасля VII з'езда камсамола ў 1926 годзе арганізацыя стала называцца «Усесаюзная піянерская арганізацыя імя У.І. Леніна». Першыя піянерскія атрады працавалі пры камсамольскіх ячэйках заводаў, фабрык, розных устаноў, удзельнічалі ў суботніках, дапамагалі ў барацьбе з дзіцячай беспрытульнасцю, у ліквідацыі непісьменнасці.

На пачатку 1930-х гадоў аб'яднанні піянераў сталі стварацца ў школах. Усесаюзная піянерская арганізацыя будавалася па так званым школьным прынцыпе: клас — атрад, школа — піянерская дружына. У піянерскіх калектывах разгарнулася ваенна-абаронная работа, ствараліся гурткі юных стралкоў, санітараў, сувязістаў, праводзіліся ваенна-спартыўныя гульні.

Шырока вядомыя подзвігі піянераў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Усім вядомы імёны Марата Казея, Зіны Партновай, Валі Коціка, Лёні Голікава. Пасля ваеннага ліхалецця ў краіне арганізаваўся масавы цімураўскі рух. Піянеры дапамагалі сем'ям франтавікоў, збіралі лекавыя травы, металалом, макулатуру, дзяжурылі ў шпіталях, працавалі на ўборцы ўраджаю.

Сёння Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя займае сваю нішу ў дзіцячым руху і трывала ўтрымлівае лідарскія пазіцыі найбуйнейшага дзіцячага аб'яднання ў рэспубліцы. Арганізацыя мае сваю сістэму каштоўнасцяў, праграму дзейнасці і арганізацыйную структуру. Асноўныя паняцці, якія закладзены ў гэтых прынцыпах — справа, дабро, Радзіма, справядлівасць — адлюстраваны ў закліку БРПА: «Піянер, да справы на карысць Радзімы, да дабра і справядлівасці будзь гатовы!». Мэта Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі — садзейнічаць сацыялізацыі асобы дзіцяці ці, як запісана ў Статуце, «дапамагчы кожнаму піянеру стаць Грамадзянінам, сваімі справамі і ўчынкамі прыносіць карысць сабе, сям'і, Радзіме».

МАЛЫ І ЯГО ЦАЦКІ

З любімымі цацкамі можна прыходзіць за кніжкай

Пра Малога і Мядзведзіка напісалі шведскія пісьменнікі Юя і Томас Вісландэры. Але цяпер іх кніжку можна чытаць па-беларуску. Бо, хутчэй за ўсё, гульні і мары дзяцей у розных краінах падобныя. Цацкі — дакладна. Менавіта з любімымі цацкамі можна было прыходзіць на прэзентацыю кнігі ў Беларусі, на якую спецыяльна прыехала Юя. Бо выданне гэтай кнігі ў нашай краіне стала адной са значных падзей Дзён культуры Швецыі ў Беларусі.

Герой кнігі — Малы — калісьці стаў настолькі папулярны ў сваёй краіне, што пасля выхаду першай кніжкі ў 1990 годзе яго гісторыя стала адной з любімых у дзяцей Швецыі. Аўтары з неверагоднай увагай і павагай да асобы Малога расказваюць пра свет яго захапленняў, мараў, прыдумак і гульняў. Кніга адрасаваная дзецям, але стала карыснай чытанкай і для дарослых. А чым мы горшыя?

Аўтарка асабіста прадставіла кнігу і распавяла пра тое, як прыдумала свайго героя. Аднак зрабіць яго зразумелым для беларусаў здолела перакладчыца Надзея Кандрусевіч. Кніга шведскіх аўтараў «Малы і Мядзведзік» была выдадзена ў выдавецтве «Літаратура і Мастацтва» пры падтрымцы Пасольства Швецыі ў Беларусі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Чытаем па-беларуску

АНЁЛКА НЕ БАЧЫЛІ?..

Нібыта толькі што тут лётаў, а магчыма, ужо пайшоў адпачываць — у кніжку

Яе прыдумаў Арцём Кавалеўскі. Не, не прыдумаў, а хутчэй прызнаўся: «Мой сябра анёлак». Цяжка ўявіць, дзе і як яму ўдалося пасябраваць з анёлкам? Дзе ён яго ўбачыў? Але, магчыма, анёлкі проста любяць тых, хто піша вершы па-беларуску, бо чалавек, які стварае, можа ўзняцца на крылах сваіх вобразаў, нібыта на аблоках, вельмі высока. А там глядзіш — і анёлкі карагод танчаць. Што ім рабіць у такім выпадку? Напэўна, запрасіць паэта ў сваё кола, каб пазнаёміцца.

Адзін — анёлак-ахоўнік, ёсць анёлак-музыкант, мастак, турыст, ёсць нават вулкан-анёлак, а ёсць філосаф... Іх шмат. Пра кожнага цяпер можна прачытаць асобны верш: і дарослым, і дзецям. Адным з першых чытачоў, дарэчы, быў спявак і музыкант Зміцер Вайцюшкевіч, якому так спадабаліся гісторыі анёлкаў, якія распавёў Арцём Кавалеўскі, што ён напісаў на вершы музыку. А потым стварыўся цэлы музычны альбом, у якім з задавальненнем паўдзельнічалі розныя музыканты і спевакі. Тых, хто падчас калядных святаў альбом паслухаў, не трэба пераконваць, што анёлкі існуюць і сапраўды ахоўваюць самых безабаронных і чыстых істот на зямлі — дзетак. І тых дарослых, якія вераць у іх існаванне.

А тыя, хто пакуль не чуў песень, маюць магчымасць пазнаёміцца з анёлкамі праз кніжку «Мой сябра анёлак». Вершыкі з яе можна пачытаць нанач — цудоўныя сны забяспечаныя.

«Наўрад ці хто з нас бачыў анёлкаў, а таму мы ўяўляем іх па-свойму — так, як падказвае нам фантазія... Але якія б абліччы нам не мроіліся, важна тое, што анёлкі жывуць і дзейнічаюць сярод нас, і вельмі шкада, калі мы — асабліва дарослыя — забываем пра гэта», — лічыць Арцём Кавалеўскі.

Мой сябра анёлак
Зламаў свае крыльцы.
Да самага золку
Анёлку не спіцца.

Шукае іголку
Анёлак-нябога
І крыльцы сшыць зноўку
Ён просіць у Бога.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«MINIMAL слухайце, а пад ELECTRO — танчыце!»

Чалавек у наш час кожны дзень сустракаецца з нечым новым, неардынарным, своеасаблівым і ў нейкай ступені запазычаным ці то з іншай культуры, ці то з грамадскай сістэмы, ці проста з поглядаў, думак і меркаванняў. І ва ўсёй гэтай сукупнасці яму проста неабходна вызначыцца, што бліжэй ляжыць да душы і вартае таго, каб на яго звярнулі ўвагу. Гэта датычыцца як поглядаў і меркаванняў, так і новых увядзенняў у сферы прафесій, творчага выяўлення асобы.

Сёння варта разгарнуць газету з абвесткамі аб запрашэнні на працу і падзівіцца, колькі існуе новых, па назве наогул незразумелых прафесій: мерчандайзер, фрылансер, менеджар, прамоўтар, агент і гэтак далей. На першы погляд словы здаецца, і вядомыя, бо на слых траплялі неаднаразова. Але вось пра сутнасць іх неяк не было нагоды задумацца. Прычым назва, можа, і новая, але спецыфіка працы засталася нязменнай. Змянілася толькі мода на замежны манер, і таму ўзровень запазычанняў узрос. Ды і гучаць пасада стала неяк больш прэстыжна, і на слых кладзецца лёгка.

Выбару ў прафесіях цяпер хапае. Варыянтаў і перспектыў на будучыню таксама. Наўрад ці нашы бабулі з дзядулямі могуць пахваліцца тым, што працавалі ў сферы сеткавага маркетынгу ці з'яўляліся членамі ПРОМА-групы і адказвалі за рэкламнае афармленне таго ці іншага мерапрыемства. Затое цяпер некаторыя з іх актыўна зганяюць чорныя плямы ў адукацыі і спрабуюць самаўдасканальвацца праз інтэрнэт або з дапамогай спецыяльных семінараў і трэнінгаў. Актыўна жыць не забароніш! Тым больш, калі існуе магчымасць.

Гэта ж датычыцца і сучаснай моладзі. Нехта можа пра іх сказаць, што пакаленне NEXT само не ведае, чаго хоча атрымаць ад жыцця. Таму і спрабуюць сябе адразу ўсюды і ў адзін час. Мне падаецца, што калі чалавек шукае, то ў выніку ён нешта знойдзе. Галоўнае — даць час і магчымасць. Многія падлеткі шукаюць падпрацоўку там, дзе не патрэбныя асаблівыя навыкі. Там, дзе галоўным з'яўляецца жаданне працаваць і шырокае кола зносінаў, а таксама жывы, прыемны характар. Я маю на ўвазе начную сферу, клубнае жыццё, якое менавіта яны і спрабуюць развіваць і ўдасканальваць. І самая распаўсюджаная прафесія, якую выбіраюць хлопцы і дзяўчаты, — гэта праца ў ПРОМА-групах. Звычайна ў абавязкі прамоўтараў уваходзіць раздаванне запрашальнікаў (флаераў) на мерапрыемствы клуба, а таксама іх распрацоўка і ўвасабленне ў жыццё. Абвесткі з запрашэннем на такія вакансіі можна як знайсці ў інтэрнэце, так і пачуць ад сяброў або непасрэдна ў клубе атрымаць патрэбную інфармацыю. Ад новых, крэатыўных, актыўных і творчых супрацоўнікаў клубы звычайна не адмаўляюцца, а толькі з задавальненнем супрацоўнічаюць за пэўную аплату. У кожнага клуба яна свая...

Андрэй Крамнік — герой майго матэрыялу — працуе **прамоўтарам** ужо год з паловай (гэта ўлічваючы, што цяпер яму толькі **19** і, здавалася б, усё яшчэ наперадзе: і праца, і турботы). Сёння ён **старшыня ПРОМА-групы**. Абавязкаў у яго спісе хапае, але турботы ад іх толькі прыемныя.

Пачынаў з клуба «Рэактар», — кажа Андрэй, — дзе і планую працаваць далей. Хоць трапіў сюды я выпадкова, і намеру заставацца не было. Але, калі з'явілася магчымасць, то чаму б яе не выкарыстаць. Праца ў ПРОМА мне спадабалася, дзякуючы чаму я паступова перайшоў да арганізатарскай дзейнасці. Цяпер я старшыня, але гэта не азначае, што такім чынам я стаў вышэй за іншых. Не. Павага — гэта асноўнае, што павінна прысутнічаць на такой пасадзе.

Так, кожная праца патрабуе таго, каб за яе плацілі. У сферы ПРОМА свае стаўкі, а таксама ўмовы, пры якіх можна і адпачнуць як след, і зарабіць на гэты самы адпачынак. Клуб ад клуба адрозніваецца, значыць і сумы таксама.

Нашы прамоўтары атрымліваюць па **500 беларускіх рублёў** за кожны флаер (запрашальнік), які прывёў людзей у клуб. Вярнулася 20 тваіх запрашальнікаў, значыць атрымаеш 10 000. Гэта ўлічваючы тое, што флаераў кожны тыдзень прамоўтар атрымлівае па 50—70. Магчымасць зарабіць прысутнічае. Галоўнае — не ленавацца. Плюс да ўсяго ў нас ёсць магчымасць атрымаць **ад 5 да 40 %** ад вечарыны, якую мы самі ж арганізуваем і праводзім. А гэта немалыя грошы. Безумоўна, турбот шмат. Затое няма часу сумаваць, і ёсць магчымасць самаўдасканальвацца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Абітурыент-2010!

Конкурс у Ліцэй БДУ — 6,5 чалавека на месца

У Ліцэі БДУ распачалася прыёмная кампанія. Жадаючых навучацца ў гэтай прэстыжнай навучальнай установе сёлета пажадалі 1379 чалавек, якія цяпер здаюць уступныя іспыты.

Найбольшая колькасць заяў (650) паступіла ад жадаючых навучацца ў фізіка-матэматычных класах, такім чынам конкурс склаў 7,5 чалавека на месца.

На паступленне ў хіміка-біялагічныя класы зарэгістраваліся 325 абітурыентаў, у філалагічныя — 250 чалавек, а на грамадазнаўчы профіль — 154 чалавекі. Агульны конкурс у Ліцэй БДУ склаў 6,5 чалавека на месца (летась — 4,2).

Усяго ў гэтым годзе ў Ліцэй БДУ запланавана прыняць у 10-ы клас 240 навучэнцаў, з якіх будуць сфарміраваныя 12 класаў па 20 чалавек. Пераможцы рэспубліканскай алімпіяды (уладальнікі дыпломаў I, II і III ступеняў), якая праводзілася Міністэрствам адукацыі ў гэтым годзе, залічваюцца ў Ліцэй БДУ без папярэдніх іспытаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Прыёмная кампанія-2010

Аляксандр ЖУК:

«ПРЫНЦЫП «АДНАГО АКНА» ПАВІНЕН ДЗЕЙНІЧАЦЬ І ДЛЯ ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ»

«Паспяховае правядзенне ўступнай кампаніі з'яўляецца залогам поспеху будучых пазітыўных перамен у лёсе не толькі абітурыентаў, але і саміх навучальных устаноў: ад таго, наколькі якасным будзе набор, у многім залежыць і «якасць» на выхадзе, — заявіў на нарадзе адказных сакратароў прыёмных камісій першы намеснік міністра адукацыі нашай краіны Аляксандр ЖУК. — Фарміраванне паўнавартаснага кантынгенту студэнтаў, арыентаваных на будучую прафесійную дзейнасць, здольных засвоіць адпаведныя адукацыйныя праграмы і паспяхова адаптавацца ва ўмовах рынку, — вось галоўная задача, якую ў чарговы раз трэба будзе выканаць».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Аляксандр Жук падкрэсліў, што вынікі ўступных кампаній папярэдніх чатырох гадоў пацвердзілі поўную абгрунтаванасць дзейных Правілаў прыёму. Дзякуючы назапашанаму вопыту ўсе этапы ўступнай кампаніі праходзяць у спакойнай і добразычлівай рабочай абстаноўцы. У гэтым годзе Правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы не змяніліся, аднак ёсць некалькі прынцыповых момантаў, якія закрануць правядзенне ўступнай кампаніі ў 2010 годзе. Менавіта на іх Аляксандр Жук спыніўся асобна.

Аляксандр Жук паведаміў, у прыватнасці, што эксперымент па залічэнні абітурыентаў у Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі і Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў будзе падоўжаны. Як вядома, на цэнтралізаваным тэсціраванні абітурыенты творчых спецыяльнасцяў здаюць дзве дысцыпліны — адну з дзяржаўных моў і гісторыю Беларусі. Плюс іх чакаюць творчыя іспыты непасрэдна ў навучальнай установе. «Вага» дзвюх дысцыплін цэнтралізаванага тэсціравання ў агульнай суме балаў, зароблены на ўступных іспытах, раней была вельмі істотная. І нярэдка нават выдатныя музычныя, артыстычныя ці мастацкія здольнасці не маглі стаць для адораных маладых людзей пропускам у кола студэнтаў. Таму ў парадку эксперымента летась было вырашана павялічыць «вагу» творчых дысцыплін: залічэнне ў гэтыя дзве ВНУ ажыццяўлялася на падставе агульнай сумы балаў, падлічанай па выніках правядзення трох этапаў уступных іспытаў па прадмеце «творчасць», сярэдняга бала сумы балаў, атрыманай па выніках ЦТ, і сярэдняга бала дакумента аб адукацыі.

У апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца ў 15 гадзін. У абітурыентаў будуць тры гадзіны, каб канчаткова вызначыцца з выбарам спецыяльнасці і ВНУ.

Эксперымент атрымаў станоўчую ацэнку, таму было прынята рашэнне яго падоўжыць. Праўда, на студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў ён так і не распаўсюдзіўся. Тлумачэнне простае: калі ў Акадэміі музыкі і Акадэміі мастацтваў рыхтуюць выключна творчую і музычную эліту і план набору там мінімальны, то ва Універсітэце культуры вядзецца падрыхтоўка кадраў з педагагічным ухілам. А для будучых педагогаў значэнне мае не толькі іх талент, але і ўзровень іх агульнай падрыхтоўкі.

Разам з тым ёсць адно істотнае дапаўненне: ва ўсіх ВНУ на спецыяльнасцях, дзе прадугледжаны экзамен па прадмеце «творчасць», схема залічэння на ўмовах аплаты змянілася. У першую чаргу залічвацца будуць абітурыенты, якія здалі ўступныя іспыты па прадмеце «творчасць» у гэтай ВНУ, а на месцы, што засталіся — абітурыенты, якія здавалі іспыты па творчасці ў іншай ВНУ. Такім чынам былі рэалізаваныя прапановы членаў Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў, якія звярнулі ўвагу на неўрэгуляванасць парадку залічэння на творчыя спецыяльнасці на платныя месцы. Узровень патрабаванняў на экзаменах істотна адрозніваецца ў розных навучальных установах і па працягласці, і па методыцы правядзення іспытаў, але высокія балы, атрыманыя ў больш «лёгкай» ВНУ, давалі абітурыентам неапраўданыя перавагі пры паступленні на платную форму навучання ва ўстановах з больш высокімі патрабаваннямі да абітурыентаў. Многіх такі парадак не задавальняў, таму гэты прабел было вырашана ліквідаваць.

Яшчэ адзін праблемны момант, на які звярнулі ўвагу члены дзяржаўнай камісіі, тычыўся правядзення прафесійнага адбору абітурыентаў. Як вядома, для паступлення на асобныя спецыяльнасці неабходна яшчэ вясной прайсці прафесійную гутарку. Але ў Акадэміі МУС замест гутаркі праводзіцца свой так званы прафесійны адбор. Некаторыя з абітурыентаў, якія паступалі летась у акадэмію на спецыяльнасць «правазнаўства» і прайшлі прафадбор, не змаглі пазней прайсці там па конкурсе. Тэарэтычна яны маглі б паспрабаваць паступіць на «правазнаўства» ў іншую ВНУ, але ім было адмоўлена на той падставе, што яны праходзілі «не тую гутарку». Таму ў гэтым годзе былі ўнесены змены ў Інструкцыю аб парадку правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі: з 2010 года абітурыентам, якія не прайшлі па конкурсе на спецыяльнасці «правазнаўства», «эканамічнае права» і «судовая экспертыза» ў ВНУ, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў для Узброеных сілаў, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, а таксама для органаў унутраных спраў, гэтымі ВНУ будуць выдавацца рэкамендацыі ўстаноўленага ўзору для ўдзелу ў конкурсе ў грамадзянскіх ВНУ па спецыяльнасцях «правазнаўства» і «эканамічнае права». Такую рэкамендацыю, у адрозненне ад грамадзянскіх ВНУ, будзе падпісваць не старшыня камісіі па правядзенні прафесійна-псіхалагічнай гутаркі, а старшыня прыёмнай камісіі ВНУ.

Самая вострая праблема, з якой даводзіцца сутыкацца членам прыёмных камісій, гэта праблема апошняга дня падачы дакументаў. Напэўна, яна будзе вырашана толькі тады, калі будзе распрацавана электронная аўтаматычная сістэма падачы заяў і залічэння ў ВНУ. Над гэтай задачай ужо працуюць Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, БДУІР і іншыя зацікаўленыя ўстановы. Але пакуль што апошні дзень падачы дакументаў застаецца самым нервовым. Аляксандр Жук праінфармаваў, што ў Палажэнне аб прыёмнай камісіі ВНУ былі ўнесены змены, якія тычацца рэжыму яе работы ў перыяд прыёму дакументаў, здачы ўступных іспытаў і залічэння абітурыентаў.

Ва ўсіх ВНУ на спецыяльнасцях, дзе прадугледжаны іспыты па прадмеце «творчасць», схема залічэння на ўмовах аплаты змянілася.

Ва ўстаноўленыя Правіламі прыёму тэрміны прыёмная камісія будзе працаваць з панядзелка па суботу з 9.00 да 18.00. Калі апошні дзень прыёму дакументаў, здачы ўступных іспытаў ці залічэння абітурыентаў прыпадае на нядзелю, прыёмная камісія працуе ў гэты дзень з 9.00 да 18.00. Такім чынам, **у 2010 годзе прыёмныя камісіі ВНУ МНС, МУС і Міністэрства абароны будуць працаваць па суботах 10, 17 і 24 ліпеня. Прыёмныя камісіі ВНУ Міністэрства культуры будуць працаваць па суботах 10, 17, 24 ліпеня, а таксама па нядзелях 18 і 25 ліпеня (18 ліпеня прыпадае на правядзенне ўступных іспытаў у ВНУ, а 25 ліпеня — апошні дзень прыёму дакументаў на завочную бюджэтную форму навучання).**

Прыёмныя камісіі ВНУ другога патоку будуць працаваць па суботах 17, 24, 31 ліпеня і па нядзелях 25 ліпеня (апошні дзень прыёму дакументаў на ўсе формы навучання за кошт сродкаў бюджэту) і 1 жніўня (залічэнне на дзённую бюджэтную форму навучання). Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца штодня кожныя тры гадзіны: у 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00. Але ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца ў 15 гадзін. У абітурыентаў будуць тры гадзіны, каб канчаткова вызначыцца з выбарам ВНУ або спецыяльнасці. У апошні дзень прыёму дакументаў допуск абітурыентаў у будынак навучальнай установы, у якой размешчана прыёмная камісія, завяршаецца ў 18 гадзін. Прыёмная камісія ў 18 гадзін спыняе выдачу абітурыентам дакументаў з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць, пры гэтым забяспечвае прыём дакументаў ад усіх абітурыентаў, што паспелі трапіць у будынак да таго, як дзверы на ўваход зачыніліся.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

«ПАКУЛЬ ЗАЙМАЙСЯ ТЫМ, ШТО ПАДАБАЕЦЦА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Навошта табе займацца навукай?

— Што значыцца «навошта»? — здзіўляецца Дзіма. — Заняткі навукай — гэта вельмі цікавая рэч, асабліва, калі чалавек досыць цікаўны. Ён заўжды знойдзе, чым заняцца. Ён будзе задавацца пытаннем, а што рабіць, калі так, а што, калі вось так. Раз — і атрымалі цэльную мадэль працэсу.

— А грошы?

— Пакуль малады, вядома ж, хочацца паболей. Пакуль мне дапамагаюць бацькі. Але нейкі заробак ад паловы стаўкі ў інстытуце ёсць, плюс стыпендыя. Можна нешта думаць. Можна паціху злазіць з шыі бацькоў. Але самае галоўнае, што маеш стасункі з такімі аксакаламі, якія пабачылі вельмі шмат. І ты атрымліваеш вялікі досвед: цябе вучаць, як, што і дзе. І гэта найбольш каштоўна. Так, аднагодкі ідуць і зарабляюць 300, 500 тысяч. І ганарацца гэтым. Але яны не маюць стасункаў з такімі людзьмі. У рэшце рэшт мы ўсе выйдзем на пэўны ўзровень заробку. І як там кажуць: «Займайся тым, што падабаецца, а грошы прыйдуць». А пасля паглядзіш на гэты «галодны» перыяд і ўбачыш, што ККДз ад яго большы, чым проста ісці і працаваць.

— Людзі навукі, з якімі ты часта бачышся, яны паспяховыя?

— Так. Людзі, якія паспяховыя ў адным, паспяховыя ва ўсім. Калі нешта недзе пайшло, пасля яшчэ недзе, то абавязкова пойдзе ва ўсім. Таму што поспех акрыляе чалавека, а акрылены чалавек здольны зрабіць крыху больш, чым неакрылены. Тут ідзе ланцуговая рэакцыя па спіралі ўверх.

«КАЛІ ТЫ ЎЛЮБЁНЫ Ў ЛАЗЕРНУЮ ПЛАЗМАДЫНАМІКУ, НАЎРАД ЦІ ХТО ЦЯБЕ НАРМАЛЬНЫМ НАЗАВЕ»

— Ці хапае часу на ўласнае жыццё, на іншыя «адцягнутыя» рэчы?

— Хапае... Я, не забывай, яшчэ ва ўніверсітэце вучуся. Увесь навучальны год наведваў курсы нямецкай мовы і ў мяне было шмат спартыўных трэніровак. А яшчэ я хадзіў у навукова-даследчы інстытут і там шмат працаваў. І яшчэ час застаецца, у прынцыпе. Чым больш робіш, тым болей паспяваеш. Было б жаданне.

— Як у цябе на ўсё хапае часу? Колькі ты спіш? А як адпачываеш?

— Восем гадзін на сон. Я кладуся спаць у гадзіну ночы. Устаю на першую пару, іду на заняткі. Пасля трох-чатырох параў ты ўжо вольны. 13.30. Ідзеш на абед, з 14.00 да 18.00 у мяне праца ў НДІ. У 18.27 аўтобус на нямецкую. Прыязджаю я з нямецкай, і да сну ў мяне застаецца тры гадзіны. І тут можна рабіць усё, што заўгодна: ад прабежкі, партыі ў валейбол, тэніс да прагляду якога-небудзь класнага фільма. З сябрамі я размаўляю падчас працы над вылічэннямі. Плюс я жыву ў інтэрнаце, тут куды ні кінься, абавязкова на размову патрапіш.

— Вучоных часта лічаць крыху шалёнымі...

— Трэба проста любіць тое, што ты робіш. А калі ты ўлюбёны ў лазерную плазмадынаміку, наўрад ці хто цябе нармальным назаве.

З'ЯЗДЖАЦЬ ЦІ НЕ З'ЯЗДЖАЦЬ? ВОСЬ У ЧЫМ ПЫТАННЕ

— Ты шукаеш перспектыву тут? Ці хочаш з'ехаць за мяжу?

— Вось такой установкі, якая ёсць у Беларусі, больш нідзе няма. Увогуле нідзе. Усе сышлі ў іншыя дыяпазоны. Мы — адзіныя, хто ідзе на такія даследаванні ў гэтай канкрэтнай галіне, для канкрэтных імпульсаў і магутнасці. Так, нехта нешта падобнае робіць, але не тое.

— Ты досыць часта ездзіў на аздараўленне ў Германію. Не хацеў ніколі там застацца?

— Як можна з'ехаць у Германію, калі ты вырас у вёсцы? Я з дзяцінства прывучаўся да працы на зямлі. У нашай вёсцы ёсць шмат азёраў, дарэчы, мяркуюць, што на адным з іх Васняцоў і намаляваў сваю Алёнку. Тут у лесе сустрэнеш, бывае, жывога дзіка, а там не адзін дзясятак гадзін паходзіш і нічога, а каб каго-небудзь убачыць з жывёл, патрэбна не адзін дзясятак дазволаў атрымаць....

Добра там, дзе нас няма. Усе кажуць, што ў Амерыцы добра, ці яшчэ дзе-небудзь. Так, па ўзроўні жыцця яны нас апярэджваюць, так, магчыма, ёсць плюсы, але там жа і мінусы ёсць. І вось тут пачынаецца выбар, што для цябе больш важна: тыя плюсы, на якіх можна выйграць, альбо тыя мінусы, на якіх ты дакладна згубіш. І ці акупіцца тое, што ты набудзеш пасля ўліку гэтых мінусаў. Я пакуль лічу, што не.

Настасся ЗАНЬКО.
Фота з уласнага архіва Д. Шчэгрыковіча.

Не прапусціце!

УПЕРШЫНЮ Ў БЕЛАРУСІ ПРОЙДЗЕ РАЛІ МІЖНАРОДНАГА ЎЗРОЎНЮ

На працягу двух дзён, 21 і 22 мая, звыш 50 экіпажаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы і Латвіі будуць паказваць сваё майстэрства на трасе Браслаўшчыны. Відавочцам «Славянскага кубка» можа стаць кожны ахвотны — уваход для гледачоў вольны. Больш за тое, самых актыўных прыхільнікаў чакаюць памятныя прызы ад спонсараў спаборніцтваў.

— Чаму месцам правядзення аўтаралі выбралі менавіта Браслаўскі раён?

— Браслаўшчына вядомая не толькі сваімі азёрамі, але і першакласнымі ралійнымі спецучасткамі, якія не саступаюць лепшым трасам Прыбалтыкі, — адзначыў **старшыня ралійнага камітэта Беларускай аўтамабільнай федэрацыі Сяргей АЎЧЫННІКАЎ**. — Да ліку перавагаў браслаўскага ралі трэба аднесці роўнае пакрыццё, кампактны маршрут, высокі ўзровень бяспекі. Акрамя таго, вялікае значэнне мае месцазнаходжанне — Браслаўскі раён мяжуе з Літвой і Латвіяй, таму ўдзельнікам з гэтых краін вельмі зручна дабірацца.

— Назавіце асноўныя асаблівасці «Славянскага кубка»?

— Гонка падобнага маштабу — для нашай краіны беспрэцэдэнтная падзея, — пераканаў **арганізатар ралі Аляксандр ЗАЙЦАЎ**. — Па-першае, таму, што ў межах «Славянскага кубка» пройдзе не толькі чарговы этап беларускага ралійнага чэмпіянату, але і выязны этап Адкрытага чэмпіянату Расіі і Трафея Расійскай аўтамабільнай федэрацыі па ралі-2010. Па-другое, агульная працягласць маршруту складзе без малога 400 кіламетраў, з іх на хуткасныя спецучасткі (з трамплінамі, віражамі) прыпадае ажно 155 кіламетраў. На спаборніцтвах, якія праводзіліся ў нас раней, працягласць спецучасткаў не перавышала 132 кіламетраў. Месцамі вельмі хуткасныя, месцамі вельмі тэхнічныя, яны патрабуюць не толькі высокага індывідуальнага майстэрства пілота, але і зладжанай работы ўсяго экіпажа. Па-трэцяе, за званне лепшага будуць змагацца не 20 і не 30 экіпажаў, а больш за 50.

— А колькі з іх будуць выступаць за нашу краіну?

— Звыш 10 экіпажаў. Праўда паспрабуюць сілы яны толькі ў нацыянальных класах спаборніцтваў. Гэта абумоўлена тым, што пакуль няма дастатковай колькасці машын, якія б цалкам адпавядалі патрабаванням міжнародных стандартаў.

Для беларускіх гоншчыкаў, лічаць арганізатары аўтаралі, міжнародныя спаборніцтвы будуць карысныя тым, што можна будзе параўнаць сябе з моцнымі замежнымі спартсменамі, сярод якіх чакаюцца чэмпіёны Расіі і ўдзельнікі чэмпіянатаў свету. Больш за тое, у складзе адной з расійскіх камандаў плануецца выступленне экіпажа са Швецыі.

— За два дні гоншчыкі павінны праехаць 385 кіламетраў. Каб сачыць за барацьбой на трасе, зразумела, трэба ў вызначаны час знаходзіцца ў вызначаным месцы? Як нам, гледачам, зарыентавацца?

— На самых цікавых адрэзках трасы, а гэта, як правіла, хуткасныя спецучасткі, будуць абсталяваныя глядацкія месцы, — супакоіў **прэс-сакратар Беларускай аўтамабільнай федэрацыі Даніла ДАЛМАТАЎ**. — Як дабрацца да гэтых месцаў, падкажа маршрут-легенда, які мы распрацоўваем спецыяльна для гледачоў. З ім можна будзе напярэдадні гонкі азнаёміцца ў інтэрнэце. Людзей, якія па нейкіх прычынах не змогуць спампаваць карту, пастараемся забяспечыць ёй на месцы. Дарэчы, стартаваць і фінішаваць спартсмены будуць у самім райцэнтры, горад не вялікі, зарыентавацца ў ім не складана, тым больш што паўсюль будуць афішы.

Арганізатары «Славянскага кубка» ўпэўненыя, што спаборніцтвы не толькі будуць цікавымі для спартсменаў і гледачоў, але і прынясуць выгаду эканоміцы Браслаўскага раёна.

— У Браслаў прыедзе шмат замежных гасцей, якія будуць траціць грошы на харчаванне, пражыванне ў мясцовых гасцініцах, санаторыях і прафілакторыях, а таксама будуць набываць паліва для сваіх аўтамашын, якія неабходна тэсціраваць і настройваць перад спаборніцтвамі, — патлумачыў Сяргей Аўчыннікаў. — Толькі з Расіі, мяркуецца, прыедзе не менш як 500 чалавек.

— Падрыхтоўка да аўтаралі ідзе не першы месяц, — дадаў **намеснік старшыні цэнтральнага савета ДТСААФ Пётр ЛЕБЕДЗЕЎ**. — Будзем старацца, каб усё было на самым высокім узроўні, каб усім усяго хапала і ўсе засталіся задаволенымі. Адзін з самых важных момантаў арганізацыі спаборніцтваў — гарантыя бяспекі. А паколькі для аўтаралі будуць выкарыстоўвацца не толькі спецыяльныя трасы, але і дарогі агульнага карыстання, то на некаторы час іх вызначаныя ўчасткі будуць перакрытыя з дапамогай службаў МУС.

За ходам спаборніцтва і яго арганізацыяй будзе сачыць спецыяльны назіральнік ад Расійскай аўтамабільнай федэрацыі. Па выніках гонкі будзе адпраўлены ліст у Міжнародную аўтамабільную федэрацыю з мэтай, каб разглядаць Беларусь у якасці пляцоўкі для правядзення падобных ралійных спаборніцтваў і ў будучыні. І арганізатары ралі спадзяюцца, што пасля поспеху «Славянскага кубка» Беларусь атрымае права прыняць удзельнікаў аднаго з этапаў чэмпіянату Еўропы.

Надзея ДРЫЛА.

«ПРЫНЦЫП «АДНАГО АКНА» ПАВІНЕН ДЗЕЙНІЧАЦЬ І ДЛЯ ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Аляксандр Жук паведаміў, што летась некаторыя ВНУ ў парушэнне Правілаў прыёму ўнеслі карэктывы ў лічбы прыёму на навучанне на ўмовах аплаты ўжо пасля іх зацвярджэння. Такія дзеянні справакавалі скаргі з боку бацькоў у розныя інстанцыі, таму згодна з прапановай дзяржаўнай камісіі, пачынаючы з 2010 года, усе прыватныя ўстановы адукацыі абавязаны ўзгадняць з Міністэрствам адукацыі планы прыёму студэнтаў на 1 курс. І змяняць гэтыя лічбы пазней забараняецца.

Цяпер колькі слоў пра мэтавы набор. Першы намеснік міністра адукацыі расказаў, што летась адзін з медыцынскіх універсітэтаў сутыкнуўся з сітуацыяй, калі абітурыентка, што пражывала ў сельскім населеным пункце, закончыла ліцэй у Гомелі (гэта зона радыеўтыўнага забруджвання) і прэтэндавала на ўдзел у конкурсе на мэтавую падрыхтоўку. Прыёмная камісія ВНУ спрабавала адмовіць абітурыентцы ва ўдзеле ў конкурсе на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, матывуючы тым, што абітурыентка была дапушчана да ўдзелу ў конкурсе на мэтавую падрыхтоўку.

— Майце на ўвазе, што з абітурыентамі, якія пражываюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва менш за 20 тысяч чалавек або ў населеных пунктах у сельскай мясцовасці не менш за два гады і якія закончылі агульнаадукацыйныя ўстановы ў гарадах, размешчаных у зоне радыеактыўнага забруджвання, цалкам правамерна заключаць дагаворы на мэтавую падрыхтоўку, паколькі захоўваюцца наступныя абавязковыя ўмовы: пражыванне ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва менш за 20 тысяч чалавек ці ў сельскай мясцовасці і навучанне ва ўстановах адукацыі ў зоне радыеактыўнага забруджвання, — падкрэсліў А. Жук.

Аляксандр Жук звярнуў увагу сакратароў прыёмных камісій на недапушчальнасць невыканання нормаў, якія ўтрымліваюцца ў любых нарматыўных прававых дакументах, што рэгулююць пытанні прыёму, не кажучы ўжо аб Правілах прыёму.

— Адказныя сакратары прыёмных камісій і іх намеснікі абавязаны дасканала ведаць Правілы прыёму і адназначна іх трактаваць у адносінах да ўсіх абітурыентаў, а ў выпадку звароту абітурыентаў і іх бацькоў па пытаннях прыёму самім разбірацца і тлумачыць пытанні і праблемы, што ўзнікаюць, а не пераадрасоўваць і не накіроўваць іх у вышэйшыя інстанцыі, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Калі вы ў чымсьці сумняваецеся, патэлефануйце ў Міністэрства адукацыі, удакладніце інфармацыю і патлумачце яе заяўніку. Але ў нас, на жаль, здараюцца выпадкі, калі чалавек тэлефануе ці прыходзіць у міністэрства і паведамляе, што на яго пытанне ў прыёмнай камісіі ВНУ адказаць не змаглі і парэкамендавалі звярнуцца за тлумачэннямі ў міністэрства. Памятайце, што прынцып «аднаго акна» дзейнічае ў тым ліку і для прыёмных камісій. Людзі не павінны губляць свой час і сродкі для таго, каб атрымаць тую інфармацыю, якая можа быць дадзена ім на месцы.

У цэлым Аляксандр Жук даў высокую ацэнку рабоце членаў прыёмных камісій і з задавальненнем канстатаваў, што дзякуючы ім у апошнія гады назіралася скарачэнне колькасці зваротаў у міністэрства па пытаннях паступлення ў ВНУ. Напрыклад, колькасць зваротаў на «гарачую» лінію для абітурыентаў у міністэрстве скарацілася ўдвая: з 3-х да 1,5 тысячы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Ведай нашых!

МАТЭМАТЫКА ЯК МАСТАЦТВА

Выхаванцы Цэнтра прафарыентацыйнай работы факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ сталі пераможцамі IV Міжнароднага конкурсу па матэматыцы і інфарматыцы «Матэматыка і праектаванне» ў Маскве. У фінале спаборніцтваў узялі ўдзел 140 прадстаўнікоў з Расіі, Казахстана, Балгарыі, Беларусі і Германіі.

У складзе беларускай пяцёркі выступалі вучні 8-10 класаў сярэдніх школ. Усе вярнуліся дамоў з высокімі ўзнагародамі. Дыпломамі першай ступені ў намінацыі «Электронны тэматычны часопіс» былі адзначаны дзесяцікласніца Дзяржынскай СШ № 4 Аляксандра Дубовік і васьмікласнік мінскай СШ № 30 Ігар Штурмак, «Геаметрычныя мініяцюры» — вучань 10 класа СШ № 2 з Мар'інай Горкі Іван Шавель.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАРЫСНА ЖЫЦЦЁ ПРАЖЫВІ!

ПАЧАЛОСЯ ТРОХГАДОВАЕ СВЯТКАВАННЕ СТАГОДДЗЯ ГАЙДЫНГУ

Сёння гэта самы буйны жаночы рух у свеце, які аб'ядноўвае больш за 10 мільёнаў удзельніц са 145 краін свету. Дзяўчынкі і жанчыны, якія мараць рэалізаваць сябе як асобу, развіць свае лідарскія якасці, дапамагаць людзям і клапаціцца пра іх, актыўна праяўляць сваю дабрыню і спагадлівасць, далучаюцца да руху гайдаў. Аднак мала хто ведае пра існаванне арганізацыі, якая дапамагае здзяйсняць гэтыя задумкі, і таму мары застаюцца марамі. Ці не крыўдна?..

З гісторыі жаночага руху

Гайдынг — рух, накіраваны на фарміраванне ў дзяўчынак і дзяўчын уменняў і ведаў, неабходных у жыцці. Ён з'явіўся ў Англіі ў 1910 годзе. Ідэя стварэння гэтага руху належала генералу англійскай арміі лорду Роберту Бадэну-Паўэлу. Ён заснаваў рух бойскаўтаў, які хутка распаўсюдзіўся ў іншых краінах. 1928 год — год стварэння Сусветнай Асацыяцыі дзяўчынак-гайдаў і дзяўчынак-скаўтаў.

На тэрыторыю нашай краіны гайдынг прыйшоў у 1992 годзе. Гэта было штосьці надзвычай цікавае і абсалютна новае. Рух пачаў развівацца паралельна ў Мінску і Гомелі. Вельмі вялікую падтрымку яго развіццю аказалі гайды Вялікабрытаніі і Кіпра. У тым жа годзе Сусветная Асацыяцыя прыняла рашэнне аб развіцці гайдынгу і ў краінах СНД.

Рух гайдаў на тэрыторыі Беларусі прадстаўляе Дзіцячае грамадскае аб'яднанне «Асацыяцыя беларускіх гайдаў» (АБГ). 5 чэрвеня 1993 года яна была афіцыйна зарэгістраваная. Першымі членамі арганізацыі былі педагогі: іх гэта вельмі цікавіла. Сёння ў арганізацыі 1460 чалавек з горада Мінска, а таксама з Мінскай, Гомельскай, Віцебскай, Гродзенскай вобласці, з якіх 1325 дзяцей. У апошнія гады адзначаецца рост колькасці арганізацыі прыкладна на 5 працэнтаў штогод.

Хто такія гайды?

Асацыяцыя гайдаў — толькі для прадстаўніц жаночага полу. Хлопцаў там рады бачыць: яны дапамагаюць у валанцёрскай дзейнасці, але дзяўчынкі іх у свае шэрагі запісваць не спяшаюцца — такая спецыфіка аб'яднання.

Дзяўчынкі-падлеткі і маленькія «гайдачкі» атрымліваюць своеасаблівае дадатковае навучанне, якое дапамагае развіваць лідарскія якасці і дае магчымасць адчуць сябе карыснай. Практычныя жаведы набываюцца падчас паходаў, акцый і простых заняткаў. Лідары выкарыстоўваюць методыкі работы, якія значна адрозніваюцца ад школьных. Адна з такіх методык — патрульная сістэма. У арганізацыі дзейнічаюць патрулі па 5-6 чалавек наступных узроставых груп: птушачкі (7—10 гадоў), гайды (11—14 гадоў), рэйнжары (15—18 гадоў) і лідары атрадаў (старэйшыя за 18 гадоў). Тое, што аб'ядноўвае ўсе ўзросты — актыўнасць, аптымізм, ініцыятыўнасць і, безумоўна, любоў да гайдынгу. Галоўнае ж не ўзрост, а ўнутранае адчуванне. Кожная з груп займаецца па пэўнай праграме, у якой дзяўчынкі атрымліваюць неабходную інфармацыю. Праводзяцца трэнінгі па шматлікіх тэмах: ад падрыхтоўкі да летніх лагераў, ад выкарыстання макіяжу да правоў дзіцяці, аховы навакольнага асяроддзя, праблем ВІЧ і СНІДу, экалогіі. Кожная з дзяўчынак можа знайсці цікавы для сябе занятак, развівацца як асоба і дапамагаць іншым у гэтым.

Дзяўчыны, старэйшыя за 18 гадоў, і жанчыны, якія зацікавіліся рухам гайдаў, вучаць на базавым трэнінгу асноўныя прынцыпы дзейнасці і методыкі работы для новых лідараў. Для лідараў атрадаў праводзяцца семінары па менеджменту, правах чалавека, канфлікталогіі, эфектнай камунікацыі, здаровым ладзе жыцця. Пасля базавага трэнінгу лідар набірае атрад. Аднак ёсць выпадкі, калі атрады фарміруюцца па ініцыятыве дзяцей. Лідар у гайдынгу — гэта не начальнік, а сяброўка, з якой можна падзяліцца сваімі праблемамі, расказаць, што хвалюе, атрымаць добрую параду.

Навучанне праз дзеянне — яшчэ адзін метад работы з дзяўчынкамі. Напрыклад, гайды выконваюць практыкаванні па тэме аховы навакольнага асяроддзя, прапаноўваюць свае варыянты рашэння праблем. Яны вучацца на сваім жа вопыце, які набываюць на занятках. Сярод найбольш распаўсюджаных методык — актыўнае супрацоўніцтва дзяцей і дарослых, служэнне людзям, дапамога ўсім без выключэння, дзейнасць на прыродзе.

Пазнаць дзяўчынак-гайдаў вельмі проста па форме — зялёная кашуля і гальштук. У кожнай узроставай групы — свой. Фіялетавы з жоўтымі бераж-камі прызначаны для рэйнжараў, зялёны з жоўтай палосачкай — для гайдаў і жоўты з зялёнай — для «птушачак». На форму прышываецца сімволіка САГГГС, АБГ ці Сусветных гайдаўскіх цэнтраў, а таксама робяцца нашыўкі, якія даюцца за пэўныя дасягненні. У арганізацыі ёсць свой традыцыйны поціск рукі і салют. І яшчэ шмат розных звычаяў. Як і кожная арганізацыя, гайды маюць свае прынцыпы і законы. Іх дзесяць, і заснаваны яны на агульначалавечых каштоўнасцях, якія, калі коратка, заключаюцца ў словах: «Гайд высакародная ў думках, словах і справах».

Пры ўступленні ў гайдаўскія рады не абысціся без клятвы. Звычайна гэтая цырымонія праводзіцца на масавых гайдаўскіх мерапрыемствах — у лагеры альбо падчас святкавання Дня разважанняў. Гэтую клятву-абяцанне кожны гайд дае перш за ўсё сама сабе, і гучыць яно так: «Гонарам сваім абяцаю служыць сваёй Радзіме — Рэспубліцы Беларусь, Богу і найвышэйшым духоўным ідэалам, заўсёды дапамагаць людзям, выконваць законы гайдаў». Аднак займацца ў атрадах дзяўчынкі могуць і да гэтага святочнага моманту. Вельмі важна, каб яны асэнсавалі і зразумелі ўсю важнасць абяцання. Нельга абяцаць не задумваючыся, толькі дзеля ўступлення ў шэрагі гайдаў.

Дзіцячае грамадскае аб'яднанне «Асацыяцыя беларускіх гайдаў» — незалежная, нерэлігійная, непалітычная, добраахвотная арганізацыя для дзяўчынак, дзяўчын і маладых жанчын. Яе мэта — спрыяць духоўнаму, інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю, удасканальваць характар, адаптаваць дзяўчынак у свеце, які ўвесь час змяняецца. У 2002 годзе арганізацыя стала членам WAGGGS — Сусветнай Асацыяцыі дзяўчынак-гайдаў і дзяўчынак-скаўтаў. WAGGGS — адна з найбуйнейшых у свеце непалітычных і нерэлігійных арганізацый дзяўчын і жанчын.

Добрае сэрца — візітная картка гайдаў

Дзяўчынкі вучацца спачуваць іншым і цаніць тое, што самі маюць. Па сваіх магчымасцях дапамагаюць бедным. У арганізацыі ёсць сусветнае гайдаўска-скаўцкае свята — Дзень разважанняў. Ён адзначаецца 22 лютага ў дзень нараджэння заснавальніка гайдынгу і скаўтынгу Роберта Бадэн-Паўэла. Апошнія некалькі гадоў тэмай разважанняў з'яўляюцца мэты развіцця тысячагоддзя. У гайдаў ёсць традыцыя скарбонкі Дня разважанняў, у якую збіраюцца грошы, каб пасля адправіць тым, каму яны больш за ўсё патрэбныя. У гэтым годзе ў скарбонку трапілі грошы для пяці краін з пяці рэгіёнаў Сусветнай Асацыяцыі дзяўчынак-гайдаў і дзяўчынак-скаўтаў, у якіх найбольш востра стаяць праблемы беднасці. У Еўрапейскім рэгіёне — гэта Грузія, у Арабскім — Судан, у Афрыканскім — Зімбабве, у Азіяцка-Ціхаакіянскім — Мальдывы, у Заходнім паўшар'і — Гаіці. Грошы пералічваюцца ў еўрапейскі камітэт Сусветнай Асацыяцыі, які іх пасля размяркоўвае. Перыядычна праводзяцца акцыі, па якіх у людзей складваецца пэўнае ўражанне пра гайдаў. Самым яскравым прыкладам дапамогі з'яўляецца акцыя «Падаруй радасць дзецям», якая стала ўжо традыцыйнай. Дзяўчынкі-гайды збіраюць падарункі для дзяцей з сацыяльна-педагагічных прытулкаў, а пасля вязуць іх дзецям, гуляюць і гутараць з новымі сябрамі. Увогуле добраахвотная дапамога ўключае ў сябе не толькі глабальную дапамогу ўсяму сусвету, але і дапамогу сваім бацькам, сябрам і проста незнаёмым людзям.

Праекты гайдаў

Арганізацыя ажыццяўляе мноства розных праектаў, накіраваных на паляпшэнне сітуацыі ў той ці іншай сферы. Адзін з іх — экалагічны праект «Зялёны вострай — зялёны свет». Дзяўчынкі і малявалі, і праводзілі даследаванні, і дапамагалі прыбіраць ад смецця тэрыторыі — на што толькі хапала фантазіі. Праект па здаровым ладзе жыцця — «Здаровая дзяўчынка — здаровая нацыя». У рамках праекта «Медыябум» гайды вучыліся пісаць артыкулы і браць інтэрв'ю. «Памяці герояў будзем вартыя» — праект, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, праводзіўся ў гонар 60-годдзя Перамогі. Дзяўчынкі вышывалі на гальштуках імёны сваіх родных, якія прымалі ўдзел у ваенных падзеях, а пасля змацоўвалі гэтыя гальштукі і рабілі доўгую стужку. Дзяўчынкі атрадамі наведвалі таксама помнікі герояў ВАВ.

Супрацоўніцтва па-за межамі

Гайдынг — міжнародны рух, таму «Асацыяцыя беларускіх гайдаў» актыўна супрацоўнічае з гайдамі і скаўтамі з іншых краін. З 2007 года рэалізуецца сумесны праект «Падтрымка валанцёрскай работы дзяўчынак і дзяўчын Беларусі» з Асацыяцыяй гайдаў і скаўтаў Даніі. Накірункамі гэтага праекта з'яўляюцца развіццё валанцёрскага руху ў Беларусі і развіццё рэгіянальных аддзяленняў Асацыяцыі беларускіх гайдаў.

«Дзіцячы тэатр» — гэта адзін з праектаў, які здзяйсняецца пры падтрымцы гайдаў Даніі. Дзяўчынкі-гайды разам з дзецьмі з сацыяльна-педагагічных прытулкаў вывучаюць тэатральнае майстэрства, разам ходзяць у тэатр, рыхтуюць аматарскія тэатральныя пастаноўкі. Гэта дапамагае развіваць творчыя здольнасці. Праект «Фотавыстава» праходзіць паралельна ў Беларусі і Даніі. Спачатку ён планаваўся як спосаб знаёмства датчан з жыццём нашай краіны, яе культурай. Цяпер фотавыстава з поспехам праходзіць у Даніі. Значным лічыцца тое, што яе наведала нават дацкая прынцэса Бенядыкта. Выстава ўжо прайшла ў Светлагорску, Гомелі, Барысаве, Жодзіне, цяпер знаходзіцца ў горадзе Дзятлава, пасля паедзе ў Шуміліна, Маладзечна, Мінск і іншыя гарады Беларусі. Што датычыцца «PR-праекта», то ён накіраваны на папулярызацыю гайдынгу на тэрыторыі Беларусі.

Супрацоўніцтва вядзецца з гайдамі розных краін. Сёлета ў госці да гайдаў нашай краіны завітала дэлегацыя з Вялікабрытаніі. Беларускія гайды сябруюць з гайдамі і скаўтамі з Аўстрыі, Швецыі, Італіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Грузіі, Украіны, Германіі... Беларускія гайды адпачываюць у летніках за мяжой і запрашаюць да сябе на адпачынак. З гайдамі гэтых краін рэалізуюцца сумесныя праекты, аказваецца пры неабходнасці ўзаемадапамога. Кожны раз у міжнародных летніках, на трэнінгах і канферэнцыях члены «АБГ» наладжваюць новыя сувязі і знаёмствы з гайдамі іншых краін.

Адпачыць — разам!

Гайдынг — гэта свет прыгод і падарожжаў. Дарэчы, падарожнічаюць дзяўчынкі не толькі па Беларусі, але і за мяжой. Кожны год арганізоўваюцца некалькі летнікаў у розных кутках нашай краіны. Кошт пуцёўкі часткова датуецца дзяржавай, астатняе даплачваюць бацькі. Па жаданні дзяўчынак лідар іх атрада можа самастойна арганізоўваць паездку. Новыя веды і досвед, рост асобы, дэмакратычныя прынцыпы, мноства сяброў — вось яны, перспектывы! Таксама гайды і скаўты з іншых краін запрашаюць да сябе ў госці: у лагеры, а пасля і ў сем'і. Лідары атрадаў удзельнічаюць у міжнародных трэнінгах, а таксама працуюць у якасці валанцёраў у сусветных цэнтрах: Pax Lodge у Англіі, Our Chalett у Швейцарыі, Our Kabana у Мексіцы і Sangam у Індыі.

На свята да гайдаў!

На сённяшні дзень у планах гайдаў — святкаванне стагоддзя жаночага руху, Дня абароны дзяцей, а 5 чэрвеня — Дня нараджэння Асацыяцыі беларускіх гайдаў. Святкуюць стагоддзе гайдынгу ва ўсіх краінах, дзе ён распаўсюджаны. У 2010 годзе ў нашай краіне свята будуць адзначаць у атрадах, а ў 2011 годзе — на рэгіянальным узроўні. Гэта гульні, конкурс малюнкаў, прысвечаны стагоддзю гайдынгу, і яшчэ шмат цікавага. Дзяўчынкі адпраўляюць віншаванні гайдам з іншых краін, здзяйсняюць акцыі, звязаныя з лічбай 100. Напрыклад, гэтая лічба выстаўляецца з дзяўчынак і робяцца фотаздымкі, ці яны выконваюць 100 добрых спраў, робяць магчымае, каб змяніць свет у лепшы бок.

Мабыць, няма нічога лепшага, чым атрымліваць асалоду ад зробленых добрых спраў, ад слоў падзякі і прытуленай да дзіцячых грудзей новай цацкі. Шчасце ад падараваных усмешак, ад справы, якая робіць гэты мір больш светлым і лагодным, можа прыйсці толькі да самаадданых і шчырых людзей. І колькі б ім ні было — 10 альбо 25 гадоў — пачуццё такое затрымціць у кожным сэрцы...

Таццяна БОЛТУЦЬ,
Інстытут журналістыкі.

«DZЕЦІ БЕЛАРУСІ: ініцыятыва, творчасць, пошук»

Нацыянальны дзіцячы форум «Дзеці Беларусі: ініцыятыва, творчасць, пошук», прысвечаны Міжнароднаму дню абароны дзяцей, пройдзе ў Мінску 21 і 22 мая.

Удзел у форуме возьмуць прадстаўнікі органаў вучнёўскага самакіравання, члены дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў і ініцыятыў з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама прадстаўнікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, міністэрстваў і іншых органаў дзяржаўнага кіравання.

У праграме форуму — прэзентацыя эфектыўна дзеючых сацыяльных праектаў і рэгіянальных ініцыятыў, правядзенне ток-шоу «Дзіцячае самакіраванне: рэальнасць ці міф?», абмеркаванне ўзаемадзеяння дзяцей і дарослых у працэсе прыняцця рашэнняў, што напрамую закранаюць іх жыццё, на адкрытай камунікацыйнай пляцоўцы «Лідар у кожным з нас».

Надзея НІКАЛАЕВА.

«MINIMAL слухайце, а пад ELECTRO — танчыце!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Звычайна грошы, якія зарабляюцца ў клубе, Андрэй пускае на свае асабістыя патрэбы. Праўда, бывае такое, што частка заробку застаецца на працы. Гэта значыць, што і адпачыць ПРОМА таксама мае магчымасць.

У прыдачу да грошай прамоўтар мае магчымасць бясплатна праходзіць на ўсе мерапрыемствы, якія праводзяцца непасрэдна ад клуба. Сярод іх даволі шмат цікавых канцэртных праграм. А таксама на начныя дыскатэкі нашым крэатыўным супрацоўнікам даюцца так званыя **«ПЛЮСЫ»** — права правесці з сабою бясплатна сябра. Аднаго ці двух — вырашае адміністрацыя. У залежнасці ад таго, наколькі эфектыўна, якасна працаваў прамоўтар.

У перспектыве працу ПРОМА-групы Андрэй бачыць больш дасканалай, з высокай арганізацыйнай сістэмай, што зможа падняць клуб на новы ўзровень. Ён лічыць, што прамоўтары існуюць для таго, каб змагацца за кожную творчую ідэю і магчымасць увасобіць яе ў жыццё. І гэта не датычыцца толькі аднаго клуба. Не. Да гэтага павінны імкнуцца ўсе супрацоўнікі ўстаноў падобнага тыпу. Канкурэнцыя цяпер высокая. Таму толькі самыя актыўныя, творчыя і смелыя могуць заняць пазіцыю лідара. А асабіста для сябе гэтую самую перспектыву ён бачыць у магчымасці навучыцца працаваць больш прафесійна, а ў будучыні стварыць сваю ПРОМА-групу з поўным калектывам. Гэта значыць, што зоны працы ў ім будуць падзеленыя для таго, каб прамоўтары адзін аднаму не замінялі і маглі выконваць кожны свой абавязак. Нехта раздае запрашальнікі, а нехта працуе над стварэннем вечарыны.

Наогул, ідэальная ПРОМА-група павінна працаваць па-сяброўску, усе разам, жыць агульнымі ідэямі, якія могуць узнікнуць нечакана. Таму трэба сачыць за творчай рэалізацыяй. Безумоўна, павінен быць старшыня, чалавек, які будзе сачыць за ўсім і сам генерыраваць ідэі. Але і без дызайнера не абысціся, а таксама без літ. супрацоўніка, творчай каманды. Мне падаецца, што загадзя трэба вызначыцца з месцам раздачы запрашальнікаў. Увесь горад павінен быць размеркаваны, каб флаеры даваліся не толькі знаёмым. Наогул, прамоўтар — пазітыўны чалавек, які можа і ўмее размаўляць з людзьмі, зацікавіць іх мерапрыемствам. Важна таксама ўмець стварацьпіяр-акцыі і ўвасабляць іх у жыццё.

У цяперашнім калектыве Андрэю працуецца лёгка. Выключэнне складаюць выпадкі асабістага плана. Гэта і зразумела: усе мы людзі!

Здараюцца выпадкі, калі мы затрымліваемся з вырашэннем той або іншай праблемы, або запрашальнікі не далі ў патрэбны тэрмін. Бывае, што і прамоўтары не асабліва слухацца хочуць. У кожнага сваё. Але мы прывыклі да аператыўнага вырашэння праблемы: не можаш рашыць — звыкніся. Хапае закавырак. І ўзнікаюць яны, мне падаецца, з-за ляноты некаторых людзей, з якімі мы асабіста нічога зрабіць не можам.

Раней здараліся выпадкі, калі сябры Андрэя спрабавалі пав

КАБ НАВАЛЬНІЦА НЕ НАРАБІЛА БЯДЫ

Найбольш небяспечнай прыроднай з'явай у Беларусі ў цёплы перыяд года лічыцца навальніца. Менавіта з мая па верасень у нашых шыротах бывае звыш 99 працэнтаў навальніц. У апошнія гады на еўрапейскім кантыненце ўсё часцей назіраюцца анамальныя з'явы, звязаныя з рэзкімі зменамі надвор'я. Сёлета навальніц у нашай краіне стала значна больш. Што трэба ведаць, каб гэта сінаптычная з'ява не нарабіла бяды? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае **начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ**.

— Як хавацца ад навальніцы, калі яна напаткала чалавека на адкрытай прасторы?

— У час навальніцы трэба неадкладна спыніць рух і шукаць укрыцце. Лепш навальніцу перачакаць у лагчыне, канаве ці яме. На вуліцы, у парку ці лесе не трэба хавацца пад вялікімі дрэвамі, а таксама пад кронамі адзінокіх раслін. Верагоднасць пападання маланкі ў канкрэтнае дрэва прама прапарцыянальная яго вышыні. Ад высокіх дрэў, слупоў і адзінокіх пабудоў лепш знаходзіцца на адлегласці не менш як 30—50 метраў. У лесе лепш хавацца сярод густога кустоўя. Заўважана, што ў пэўныя дрэвы маланкі б'юць часцей, а нейкія ўвогуле не чапаюць. Больш за ўсё «баявых шрамаў» заўважана ў дуба. Даволі часта маланкі ўдараюць па таполях, елках і соснах; менш — па бярозах, клёнах і ліпах, а арэшыну амаль не чапаюць.

— Дзе перачакаць навальніцу ў населеных пунктах?

— У горадзе трэба пастарацца як мага хутчэй трапіць у краму ці жылы дом. Яны маюць надзейную маланкаабарону, а вось на прыпынках грамадскага транспарту яна значна слабейшая. Калі да такога прыстанішча далёка, то лепей прыгнуцца, каб быць не вышэй за бліжэйшы ландшафт; ногі трымайце разам і зніміце ўсе металічныя рэчы з галавы і цела. Не раяць спецыялісты класціся на зямлю. Калі валасы дуба сталі ці вы пачулі гудзенне з боку буйных камянёў, агароджы, іншых прадметаў, то неабходна адразу перайсці ў іншае месца.

— Што рабіць, калі маланка заспела ў транспарце...

— Аўтамабіль з'яўляецца бяспечным прытулкам, таму ў навальніцу яго лепш не пакідаць. Трэба зачыніць вокны, апусціць аўтамабільную антэну, спыніць рух і перачакаць непагадзь на ўзбочыне ці аўтастаянцы, але далей ад высокіх дрэў. У час навальніцы ў машыне не трэба дакранацца да металічных частак і не набліжацца да іх. А вось веласіпед і матацыкл, наадварот, — небяспечныя сродкі. Іх трэба пакласці на зямлю і адысці не менш чым на 30 метраў. Мацней за ўсё прыцягвае маланку трактар у адкрытым полі.

— Што рабіць з мабільнікам?

— Сотавы тэлефон на вуліцы лепш адключыць. Былі выпадкі, калі ўваходны званок прыцягваў да сябе маланку. Пры выкліканні службы экстраннай дапамогі трэба гаварыць толькі па сутнасці і як мага карацей.

— У навальніцу часам «нараджаюцца» шаравыя маланкі...

— Пры сустрэчы з гэтым электрычным шарыкам трэба захоўваць спакой і спыніць любы рух. Не трэба набліжацца да яго, дакранацца чым-небудзь, бо можа адбыцца выбух. Лепш не ўцякаць ад шаравой маланкі, бо з патокам паветра яна пацягнецца за вамі.

Пры навальніцах у сетцы будынкаў можа ўзнікнуць электрычнае перанапружанне, якое распаўсюджваецца па лініях электрапередач і часам прыводзіць да перагарання электрапрыбораў. Раю закрыць заглушкамі электра- і радыёразеткі, коміны, вентыляцыйныя адтуліны, форткі, бо ў іх можа заляцець шаравая маланка. Спецыялісты не рэкамендуюць карыстацца стацыянарным тэлефонам, стаяць каля акон і дзвярэй і дакранацца да водаправодных кранаў. Выключыце ўсе электрапрыборы, прасачыце, каб у памяшканні не было скразнякоў, разам з якімі можа заляцець шаравая маланка. Не трэба паліць печ і камін, бо дым мае вялікую электраправоднасць, таму верагоднасць удару маланкі ў трубу павялічваецца. У навальніцу не трэба стаяць пад парасонам, не трымайце ў руках вуду ці іншыя падобныя прадметы. Лепш трымацца далей ад высокіх металічных канструкцый.

Сяргей КУРКАЧ.

ГАЛОДНЫ МОЗГ, або Як атрымаць дадатковую порцыю O_2 «закладнікам» горада?

Прыміце да ведама

ЧАМУСЬЦІ ў штодзённым жыцці мы пастаянна забываем пра тое, што нашаму мозгу патрабуецца рэгулярнае паступленне кіслароду — галоўнай крыніцы энергіі жыцця, без якой ён проста не можа існаваць. І звяртаючыся да ўрача са скаргамі на пагаршэнне памяці і зніжэнне ўвагі, наўрад ці ўсведамляем, з чым гэта можа быць звязана.

Між тым кіслароднае галаданне (паніжанае ўтрыманне кіслароду ў крыві) практычна штодзень звядвае кожны гарадскі жыхар. Усё яго жыццё як быццам спецыяльна накіравана на павелічэнне фактараў рызыкі. Праца ў неправетраных офісах, гадзіны, праведзеныя ў душным транспарце, стаянне ў заторах з удыханнем прадуктаў гарэння, стрэсы — усё гэта непасрэдна ўплывае на функцыі мозга. Як вынік — апатыя, стомленасць, галавакружэнне і галаўны боль, шум у вушах, санлівасць. Стан, які ў народзе характарызуюць «нібы пыльным мяшком ударылі». Гэтаму можа папярэднічаць непатрэбная раздражняльнасць, невытлумачальная трывога, мітуслівая блытаніна думак, няпамятлівасць.

Вельмі часта ў такой сітуацыі мы самі сабе ставім дыягназ: «ператамленне» і са спакойнай душой кладзёмся як мага раней спаць, не падазраючы, што насамрэч гэта наш мозг такім чынам сігналізуе пра недахоп кіслароду для нармальнай работы. Калі не звяртаць увагі на праблему, наступствы могуць быць самымі рознымі — ад зніжэння ўвагі, парушэння абменных працэсаў да ішэмічнага інсульту.

Чым жа падкарміць «галодны» мозг, забяспечыўшы яму рэгулярныя пастаўкі жыццёва неабходнага рэчыва?

І напіцца, і надыхацца

Праблема кіслароднага галадання шматгранная, таму і шляхі яе вырашэння, якія прапануе сучасная індустрыя здароўя, — самыя разнастайныя.

Так, пачалі адкрывацца кіслародныя бары, дзе цалкам паспяхова гандлююць... паветрам. Наведвальнікаў пояць незаслужана забытымі кіслароднымі кактэйлямі і даюць падыхаць праз спецыяльную трубачку чыстым або абагачаным кіслародам з водарамі мяты, лаванды, эўкаліпту і г. д. Дарэчы, раней лічылася, што кіслародныя кактэйлі павышаюць працаздольнасць і супакойваюць нервовую сістэму. Насамрэч жа карысці значна больш! Трапляючы ў арганізм чалавека, кісларод насычае клеткі. А значыць, ліквідуе праявы гіпаксіі, паляпшае абмен рэчываў у тканках. Ёсць звесткі, што пры традыцыйным паступленні кіслароду ў арганізм (г.зн. праз лёгкія) у тканкі трапляе ў дзесяць разоў менш кіслароду, чым пры прыёме кіслароднага кактэйлю. Такім чынам, гэты напой не толькі змагаецца са стомленасцю і стрэсам, але і садзейнічае вывядзенню таксінаў, паляпшае сон, нармалізуе мікрафлору страўніка, паляпшае нырачны кровазварот і раўназначны заняткам спортам на паветры. (Увага! Перш чым прымаць кіслародны кактэйль, варта пракансультавацца ў свайго лечачага ўрача.)

Знайшла сваё прымяненне кіслародная тэрапія і ў касметалогіі. У салонах прыгажосці яе прымяняюць як амалоджвальную працэдуру. Аказваецца, нашы скура і валасы таксама пакутуюць ад кіслароднага недаядання. Каб «накарміць» іх і прывесці ў прытомнасць, выкарыстоўваюцца спецыяльныя прыстасаванні, так званыя кіслародныя канцэнтратары. Наведвальнік садзіцца ў зручнае крэсла і проста дыхае пажыўным 30-працэнтным O_2. Спецыялісты сцвярджаюць, што пасля 10 сеансаў разгладжваюцца дробныя зморшчыны, знікаюць пігментныя плямы, на твары з'яўляецца румянец, а валасы становяцца, як з рэкламнага роліка. Безумоўна, эфекту пластычнай аперацыі ад такой працэдуры чакаць не трэба, але ў цэлым яна вартая ўвагі, калі ўлічваць, што ўсё адбываецца без скальпеля і хімічных сродкаў.

Для ліквідацыі наступстваў кіслароднага галадання прымяняюцца і медыкаментозныя сродкі, якія ўмоўна можна падзяліць на дзве групы. Першая — карэктары мазгавога кровазвароту. Гэтыя прэпараты закліканы расшырыць сасуды і палегчыць крываток. Некаторыя з іх здольныя нават перашкаджаць утварэнню мікраскапічных тромбаў у дробных сасудах. Другая група — наатропы. Апошнія паляпшаюць увагу, памяць, павышаюць устойлівасць мозга да недахопу кіслароду. Пры іх прымяненні паляпшаецца абмен рэчываў у тканках, што садзейнічае праходнасці нервовых імпульсаў.

Прэпараты абедзвюх груп павінны выбірацца і прызначацца толькі ўрачом, паколькі яны маюць шэраг пабочных эфектаў. Спецыяліст таксама парэкамендуе, як лепш чаргаваць курсы розных лекаў для дасягнення станоўчага выніку.

Заслугоўваюць увагі і прэпараты на раслінай аснове (напрыклад, экстракт з лісця дрэва гінкга білоба). Іх актыўныя кампаненты садзейнічаюць нармалізацыі сасудзістага тонусу, паляпшаюць мікрацыркуляцыю, ахоўваюць клеткі ад пашкоджанняў, выкліканых недахопам кіслароду і свабоднымі радыкаламі.

Ну, а лепшым спосабам прафілактыкі кіслароднага галадання па-ранейшаму застаюцца працяглыя прагулкі і заняткі спортам на свежым паветры. Прычым у цёплую пару года можна ўдала спалучаць і першае і другое. Некалькі энергічных практыкаванняў, зробленых у парку ці ў лесе за горадам, насыцяць кіслародам органы і тканкі. Пры гэтым важна правільна дыхаць. Для таго каб паветра абнаўлялася цалкам, неабходна пры дыханні расшыраць не грудную клетку, а мышцы дыяфрагмы і брушнога прэса (менавіта так дыхаюць прафесійныя спевакі). У такім выпадку кісларод глыбей пранікае ў лёгкія, а затым і ў кроў.

Пазяхайце на здароўе

Многія, пэўна, прыкмячалі, што часам напрыканцы цяжкага працоўнага дня нас, як па камандзе, пачынае адольваць пазяханне. Вучоныя высветлілі, што гэта таксама сігнал аб кіслародным галаданні мозга. Ён сведчыць пра стомленасць і пагаршэнне работы сэрца і сасудаў і пра тое, што ў мозгу працэсы тармажэння пачынаюць пераважаць над працэсамі ўзбуджэння. Міжвольнае пазяханне ж у гэтым выпадку выконвае функцыю стымулятара кровазвароту. У гэтым простым рэфлекторным дзеянні насамрэч удзельнічаюць асноўныя сістэмы арганізма: мышачная, сасудзістая, дыхальная, нервовая і г. д.

Глыбокі ўдых, які ўзнікае падчас пазяхання, насычае кроў кіслародам і садзейнічае павелічэнню хуткасці крыватоку ў сасудах. З арганізма выдаляюцца адпрацаваныя прадукты, вуглякіслы газ. У выніку кровазабеспячэнне клетак мозга паляпшаецца, і працэсы абмену ў іх ідуць больш актыўна. У мозг паступае больш пажыўных рэчываў, што дазваляе вярнуць агульны тонус арганізма. Таму пазяханне — патрэбны і карысны чалавеку фізіялагічны працэс. І спецыялісты раяць не стрымліваць сябе. Калі хочацца пазяхаць — пазяхайце на здароўе. Так вы зможаце зняць стомленасць, псіхічную нагрузку і абнавіць паветра ў лёгкіх.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Краіна здароўя

Выпуск № 17 (186)

Па чутках і кампетэнтна

СЭКС НЕ ЗАГІНЕ!

ЭКА сэксу не канкурэнт

ІНТЭРНЭТ падкідвае інфармацыю пра тое, што Джон Ёвіч, доктар з Універсітэта Мэрдака (Аўстралія) мяркуе: на працягу літаральна найбліжэйшых дзесяці гадоў пары перастануць займацца сэксам з мэтай зачацця дзяцей. Натуральны спосаб поўнасцю замяніць экстракарпаральнае апладненне, паведамляецца далей.

Гаворыцца, што трыццацігадовыя будуць у асноўным разлічваць на штучныя метады апладнення, паколькі чалавечая рэпрадукцыя даволі ненадзейная і малаэфектыўная. Атрымліваецца, што ў будучыні сэкс стане не больш чым сродкам атрымання задавальнення. Калі ацэнкі доктара Ёвіча акажуцца слушнымі, дзеці, як у фантастыцы, будуць вырошчвацца ў інкубатарах. Глабальнае выкарыстанне ЭКА можа прывесці і да актыўнага выкарыстання яўгенікі — вучэння аб спадчынным здароўі віду і шляхах паляпшэння яго спадчынных вартасцяў. Падчас ЭКА, як вядома, магчыма выбіраць пэўныя характарыстыкі будучага дзіцяці.

Джон Ёвіч мяркуе, што ЭКА дапаможа лягчэй дыхаць парам, якія доўгі час адкладвалі з'яўленне дзіцяці па прычыне арыентаванасці на кар'еру. Усё ж такі працэдура ЭКА больш эфектыўная. Нават у маладых людзей шанцы зачаць натуральным чынам ацэньваюцца як 1:4, а ў тых, каму за 35 гадоў, — 1:10. ЭКА, як лічыцца, будзе даваць у найбліжэйшыя 10 гадоў стапрацэнтны вынік (цяпер названы метад дае 50 працэнтаў паспяховага выніку).

...Для таго, хто хоць крыху ўяўляе, што такое экстракарпаральнае апладненне, і каментарый не патрабуецца. Бо з першых слоў становіцца зразумелым: вышэйнапісанае, мякка кажучы, — глупства. Тым не менш, многія з нас слепа давяраюць інтэрнэту. А ў гэтым выпадку не варта было б. ЭКА, кажучы простай мовай, — гэта крайнія захады лячэння бясплоднасці, гэта вышэйшыя на сёння медыцынскія тэхналогіі, прычым тэхналогіі не танныя для таго, каму ўрачы прапануюць імі скарыстацца. Словам, ЭКА нельга зрабіць толькі таму, што нехта так захацеў і, безумоўна, нельга лічыць такі спосаб апладнення «звычайным» метадам планавання сям'і.

Ала КАМЛЮК, загадчык аддзялення планавання сям'і і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» кажа з гэтай нагоды:

— У кожнай пары — свой шанц наступлення цяжарнасці. Што да ЭКА, то яно рэкамендуецца вельмі невялікаму працэнту людзей. Метад экстракарпаральнага апладнення — гэта спосаб наступлення цяжарнасці ў шлюбных пар, для якіх іншыя метады лячэння бясплоднасці аказаліся неэфектыўнымі. Да таго, як адважыцца на такі спосаб лячэння, пацыентам спачатку трэба даведацца, што ён сабой уяўляе, пацікавіцца адпаведнай інфармацыяй. Пары, якая апынулася на гэтым шляху, прызначаецца абследаванне, улічваюцца ўсе паказанні і супрацьпаказанні, пасля чаго жанчына «ўступае ў праграму» і ёй даводзіцца трываць адпаведную агрэсіўную медыкаментозную нагрузку. Пацыентка штодня ін'екцыйна ўжывае дарагія гарманальныя прэпараты паводле спецыяльнага пратакола стымуляцыі. Потым у аперацыйнай з анестэзіялагічным дапаможнікам выконваецца хірургічны забор яйцаклетак, па-за арганізмам жанчыны ажыццяўляецца апладненне і, нарэшце, эмбрыён пераносіцца ў поласць маткі. Для падтрымкі такой цяжарнасці патрабуецца далейшае медыкаментознае суправаджэнне.

Можа быць і такая сітуацыя, калі жанчына здаровая, а ў мужчыны не вельмі добрая спермаграма. Нізкая якасць спермы, нізкая рухомасць сперматазоідаў, іх малая колькасць таксама з'яўляюцца паказаннем да ЭКА. У такім выпадку прымяняецца дадатковая методыка апладнення, калі выконваецца ін'екцыя сперматазоіда ў яйцаклетку. Метад гэты складаны і дарагі, прызначаецца толькі па жорсткіх паказаннях. Асноўная ж нагрузка ў памянёнай сітуацыі ўсё адно, зразумела, кладзецца на жанчыну.

Супрацьпаказанні да ЭКА — тыя ж , што і да цяжарнасці ў прынцыпе. Размова ідзе дзесьці пра больш як 140 пунктаў. Гэта ў тым ліку пухліны маткі, вялікія міёмы, анатамічна зменены матачныя трубы і г.д. У немалой колькасці выпадкаў для правядзення паспяховага экстракарпаральнага апладнення неабходна яшчэ і хірургічная падрыхтоўка.

Наўрад ці нават праз дзесяць гадоў жанчыны будуць хацець трапіць на такую працэдуру. Яны ўсяляк будуць імкнуцца абысціся такімі метадамі лячэння, якія дазволяць надысці цяжарнасці натуральным шляхам. Натуральнае апладненне або магчымасць натуральнага апладнення з дапамогай нават нейкіх метадаў лячэння — адназначна найбольш аптымальны шлях зачацця. Малаверагодна, каб праз дзесяць гадоў метад ЭКА стаў татальным у справе апладнення, паколькі пара, якая згаджаецца на такі спосаб, інфармуецца аб усіх магчымых пабочных эфектах і ўскладненнях. На сёння эфектыўнасць метаду складае 35-40 працэнтаў. Прыкладна так яно і ў свеце. Безумоўна, навука рухаецца ў кірунку дасягнення больш высокага выніку.

Што датычыцца выбару характарыстык, то селекцыя полу забаронена пры выкарыстанні дапаможнай рэпрадукцыі. Адзінае, што эмбрыёны сапраўды ацэньваюцца па якасці і адбіраюцца лепшыя.

Бясплатных спробаў прымянення ЭКА ў Беларусі няма. У нашым цэнтры пацыентам выпісваецца рэцэпт, па якім яны набываюць у аптэцы неабходныя прэпараты. Для кожнай пацыенткі дзейнічае індывідуальны медыкаментозны пратакол — свае дозы, свая колькасць прэпаратаў, таму і сума, у якую абыдзецца ЭКА, для кожнай пары будзе індывідуальнай.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВІРУСНЫЯ ГЕПАТЫТЫ ІДУЦЬ У «КОНТРАТАКУ»

ПРЫЦЯГНУЦЬ увагу сусветнай супольнасці да праблемы распаўсюджанасці вірусных гепатытаў і павысіць інфармаванасць насельніцтва аб гэтым захворванні закліканы Міжнародны дзень барацьбы з гепатытамі, які адзначаецца на планеце 19 мая. Спецыялісты Міжнароднага альянсу па барацьбе з гепатытамі, які аб'ядноўвае больш як дзве сотні асацыяцый хворых па ўсім свеце, канстатуюць, што дасведчанасць насельніцтва па праблемах парэнтэральных гепатытаў не ідзе ні ў якае параўнанне з узроўнем інфармаванасці людзей аб ВІЧ-СНІДзе, туберкулёзе і малярыі. Хоць па хуткасці свайго распаўсюджвання гепатыты В і С істотна перавышаюць распаўсюджванне ВІЧ-інфекцыі.

Па дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, **вірусам гепатыту В** інфіцыравана каля двух мільярдаў чалавек у свеце, каля 350 мільёнаў маюць хранічную інфекцыю і каля 600 тысяч чалавек штогод паміраюць ад вострай ці хранічнай формы гепатыту В. У Беларусі штогод выяўляюцца ад 7 да 10 тысяч чалавек з рознымі формамі вірусных гепатытаў. Каля 70 працэнтаў выяўленых хворых і носьбітаў гепатытаў інфіцыраваныя вірусам гепатыту С, больш чым у 90 працэнтах выпадкаў захворванне працякае ў форме вірусаносьбіцтва ці хранічнай форме.

Для прафілактыкі інфіцыравання гепатытам В у Беларусі прымяняецца вакцынацыя. Да слова, Беларусь адна з першых краін у СНД, яшчэ ў 1996 годзе, арганізавала выбарачную імунізацыю насельніцтва па эпідэмічных паказаннях, а з 2000 года імунізацыя супраць гепатыту В уключана ў Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак. Працэнт ахопу абавязковых кантынгентаў, якія падлягаюць імунізацыі ў Беларусі, нават перавышае стандарт Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і дасягае 96-99 працэнтаў. Гэта дазволіла знізіць узровень захворвання ў краіне вострым вірусным гепатытам В амаль у 10 разоў. Імунізацыя таксама радыкальна паўплывала на эпідэмічную сітуацыю сярод дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў: у апошнія гады рэгіструюцца толькі адзінкавыя выпадкі захворвання вострым вірусным гепатытам В у гэтай узроставай групе, прычым пераважна сярод непрышчэпленых дзяцей.

Спецыялісты тлумачаць, што часцей за ўсё вірусы гепатытаў распаўсюджваюцца сярод маладых людзей падчас сэксуальных кантактаў і выкарыстання ін'екцыйных наркотыкаў. Вірус утрымліваецца ва ўсіх біялагічных вадкасцях крыніцы інфекцыі — крыві, сперме, вагінальным сакрэце. У меншай канцэнтрацыі вірус утрымліваецца ў сліне, мачы, грудным малацэ і поце. Для заражэння дастаткова найдрабнейшай кроплі крыві (0,0005 мкл), нябачнай простым вокам. Небяспека гепатыту заключаецца ў схільнасці да развіцця хранічнай інфекцыі, пры якой вірус захоўваецца ў арганізме дзясяткі гадоў і паступова разбурае печань, прыводзячы да цырозу ці першаснага раку печані.

Вірусы могуць таксама перадавацца ад інфіцыраванай маці плоду і пры ўнутрысямейных кантактах. Посуд, ручнік, зубная шчотка, прыборы для галення, манікюрны набор, нажніцы, мачалка, грабянец, пасцельная і нацельная бялізна павінны быць у хворага і ў кожнага члена сям'і асабістыя. Не пашкодзіць ведаць, што пры пакаёвай тэмпературы на прадметах і паверхнях інфекцыйнасць віруса захоўваецца ад 3 да 6 месяцаў, а ў замарожаным выглядзе — ад 15 да 25 гадоў.

Для работнікаў аховы здароўя рызыка інфіцыравання гепатытамі з'яўляецца адной з прафесійных рызык. Дарэчы, прышчэпкі супраць **гепатыту С** пакуль не існуе, таму застрахавацца ад гэтай смяротна небяспечнай хваробы можна толькі з дапамогай выключэння рызыкоўных паводзінаў, выкарыстання аднаразовых медыцынскіх інструментаў і жорсткага кантролю за прэпаратамі пералівання крыві і ўсімі біялагічнымі прэпаратамі, што выкарыстоўваюцца ў медыцыне.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У ЯПОНІІ ЯШЧУР. УВОДЗЯЦЦА АБМЕЖАВАННІ

З 15 мая ўведзены часовыя абмежаванні на ўвоз на тэрыторыю Беларусі з Японіі адчувальных да яшчуру жывёл, усіх відаў жывёлагадоўчай прадукцыі, уключаючы гатовыя вырабы, а таксама кармоў жывёльнага паходжання і іншых сыравіны і вырабаў, атрыманых ад забою адчувальных да яшчуру жывёл.

Такое рашэнне Галоўнага ўпраўлення ветэрынарыі з дзяржаўнымі ветэрынарнай і харчовай інспекцыямі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання абумоўлена атрыманай з Міжнароднага эпізаатычнага бюро (г. Парыж) інфармацыяй пра тое, што ў Японіі зарэгістраваны выпадак захворвання жывёл на яшчур.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КОММУНАЛЬНОЕ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «ЛИОЗНЕНСКОЕ»
(Витебская область, п.г.т. Лиозно, ул. Добромыслянская, 11), находящееся в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве),

ПРЕДЛАГАЕТ К РЕАЛИЗАЦИИ СЛЕДУЮЩЕЕ ИМУЩЕСТВО:

Стоимость без учета налога на добавленную стоимость (УСН без НДС) в белорусских рублях за одну единицу

ОБОРУДОВАНИЕ

1. Автоклав АГ (1шт.) — 545 000
2. Автоклав Б5-КАВ-110 (8 шт.) — 4 500 000
3. Автоматическая конденсаторная установка АКУ 0.4-200 (2 шт.) — 7 200 000
4. Барабан для протирочной машины (2 шт.) — 2 500 000
5. Варочный котел МЗС-244 (1 шт.) — 2 200 000
6. Вентилятор Ц-4-75 (4 шт.) — 1 300 000
7. Вертикально-сверлильный станок 2Н-150 (1 шт.) — 2 200 000
8. Дробилка (1 шт.) — 3 400 000
9. Закаточная машина БУ КЗК-109 (1 шт.) — 5 600 000
10. Закаточная машина КЗК-110 — 5 600 000
11. Машина для склеивания пленки (1 шт.) — 500 000
12. Реактор МЗС-320 (2 шт.) — 5 460 000
13. Резервуар 10 м куб. эмалир. (3 шт.) — 2 800 000
14. Смеситель Ш12-ККЛ/15 (1 шт.) — 4 100 000
15. Таль электрическая (2 шт.) — 2 195 000
16. Термотепель Универсал УМ-2-2 — 100 000
17. Шинковальная машина (1 шт.) — 5 800 000
18. Насос шестеренчатый 2 ШН-7-К-18,5 (2 шт.) — 1 600 000
19. Станок фрезерный — 4 100 000
20. Просеиватель (1 шт.) — 1 200 000
21. Хим. водоподготовка для винного цеха (1 шт.) — 2 400 000
22. Электронная система учета выпускаемой продукции ЭСУ-М (2 шт.) — 1 600 000
23. Охладитель (1 шт.) — 1 100 000
24. Реактор горизонтальный эмалированный 16 м куб. (3 шт.) — 4 500 000

ТРАНСПОРТ

1. Автомобиль ГАЗ 3110 — 4 700 000
2. Автомобиль ЗИЛ 130 — 7 800 000
3. Автомобиль КамАЗ 5320 — 4 700 000
4. Автомобиль ГАЗ 3110 — 1 700 000
5. Погрузчик ПЭ-08-06 — 3 900 000
6. Прицеп бортовой-8926 — 5 600 000
7. Автомобиль ГАЗ-53 (молоковоз) — 7 600 000

Для реализации также предлагается имущество материального склада, линии по производству: вина, сока картофельного концентрированного и сухого картофельного полуфабриката.

Контактные телефоны: тел/факс: 8 (02138) 4 94 92; МТС 8 029 297 44 71, 8 029 295 35 41.

ЗАО «РРБ-Банк» сообщает, что 17 мая 2010 г. Правлением ЗАО «РРБ-Банк» (Протокол № 32 от 17.05.2010) УТВЕРЖДЕНЫ ИЗМЕНЕНИЯ № 1 В ПРАВИЛА ОРГАНИЗАЦИИ ОБСЛУЖИВАНИЯ СЧЕТОВ КЛИЕНТОВ БАНКА – ЮРИДИЧЕСКИХ ЛИЦ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ, КОТОРЫЕ ВСТУПАЮТ В СИЛУ ЧЕРЕЗ ПЯТЬ БАНКОВСКИХ ДНЕЙ С МОМЕНТА ПУБЛИКАЦИИ.

Прамая лінія

ПРОСІЦЬ СЭРЦА РАДАСЦІ

На вашы пытанні адказалі загадчык інфарктнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталля ПАЛЯЎКОВА і ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына ГРЫШЫНА. ***(Працяг. Пачатак у нумары за 18 мая.)***

☎— Лепель, Аксана Фёдараўна. Парокі сэрца абавязкова небяспечныя?

— Парокі сэрца трэба назіраць ва ўрача, бо яны могуць прагрэсаваць. Як мага раней трэба праводзіць адпаведную карэкцыю, што цяпер вельмі добра ажыццяўляецца. Парокі могуць быць рознымі па ступені, па прагнозе, але ўсё адно імі трэба займацца.

☎— Мінская вобласць, Вера. Мне 29 гадоў. Ведаю, што ў мяне нізкі ціск. Даўно, праўда, не мерала... Скажыце, чым пагражае такі стан?

— Гіпатанія — гэта парушэнне рэгуляцыі сасудаў, пры якім варта назірацца ў спецыяліста, паколькі з узростам гіпатонікі рэзка становяцца гіпертонікамі. За ціскам трэба абавязкова сачыць, выконваць спецыяльныя практыкаванні, а можна пахадзіць і на фізіяпрацэдуры.

— Чым падняць ціск, калі адчуваеш павышаную слабасць, кружыцца галава?

— Можна дадаць чайную лыжку кан'яку ў кубак кавы, калі няма супрацьпаказанняў, напрыклад, выражанай тахікардыі.

— А якія прэпараты могуць прызначацца ў такім выпадку?

— Адаптагены — жэнь-шэнь, радыёла руковая, элеўтэракок. Яны прымаюцца ў першай палове дня, каб потым не было бяссонніцы.

☎— Віцебская вобласць, Аляксандра Юр'еўна. Які танометр лепей набыць?

— Электронныя апараты розных фірмаў, прапанаваных на нашым рынку, вельмі зручныя, напрыклад, для пажылых людзей. Прычым гэтыя апараты павінны быць менавіта на плячо — верхнюю частку рукі, паколькі склероз сасудаў на запясці можа з цягам часу перашкаджаць атрымліваць правільныя значэнні.

— Ці можна памераць ціск у паліклініцы, проста зайсці, калі мне зручна і без талона да ўрача праверыцца?

— Калі ласка, звяртайцеся з гэтай мэтай у даўрачэбны кабінет.

☎— Кобрын, Алена Уладзіміраўна. Ці можаце вы параіць эфектыўныя народныя сродкі ад ціску? Можа быць, ёсць травы, якія зніжаюць ціск...

— Травы, якія прымаюць пры гіпертаніі — арніка, барвінок, дзевясіл, суніцы, каляндула, амела, стрэлкі, палын, ныркавы чай, сардэчнік, сушаніца. З агародніны і садавіны — гэта авакада, грэйпфрут, цыбуля, вінаград, буракі, масліны, фасоля, кроп. Аднак не ўсе стадыі артэрыяльнай гіпертэнзіі можна лячыць аднымі травамі. Травы могуць быць добрыя ў спалучэнні. Ёсць і такі момант: гіпертонікам становіцца лягчэй, калі яны проста выязджаюць на дачу. Тады дазіроўку прэпаратаў некаторыя істотна зніжаюць. Добра адбіваецца на самаадчуванні змена абставінаў, адсутнасць тэлевізара, умераная фізічная работа.

— Чытала, што ў зялёным чаі шмат кафеіну...

— Больш чым у чорным. Каву і чай трэба абмяжоўваць, калі вы заўважылі, што ў вас пры гэтым з'яўляецца сэрцабіццё. Піце зялёны чай толькі адзін раз на дзень. Аддавайце перавагу соку, кампоту, матэ, адварам з лекавых раслін — чабору, мяты, мелісы ў спалучэнні з мёдам.

— БАДы і вітамінныя комплексы — не адно і тое ж?

— Не. БАДы не прайшлі клінічных іспытаў, і таму не з'яўляюцца лекамі, а вітаміны — гэта лекі. Цяпер у нас, як і ва ўсім свеце, націск робіцца на доказную медыцыну, а ў дачыненні да біялагічна актыўных дабавак доказнай медыцыны няма.

— Якія вітаміны вы параіце ўжываць пры гіпертаніі?

— Перш-наперш патрэбны такія мікраэлементы, як калій і магній. Можна прымаць, напрыклад, магній В6. Гэты прэпарат рэкамендуюць нават дзецям. Добра падыходзяць для сардэчнай мышцы і прэпараты, якія ўтрымліваюць калій. Прыём такіх прэпаратаў акажацца сапраўды эфектыўным, калі будзе кантралявацца ўрачом.

☎— Смаргонскі раён, Алена Мікалаеўна. Дачцэ 27 гадоў. У яе вось ужо разы тры за гэты год нямела правая частка цела. Кардыяграма добрая. У Смаргоні кажуць, што гэта ад стомленасці. Дзе ў Мінску можна абследавацца, каб высветліць прычыну пагаршэння самаадчування?

— Вашай дачцэ неабходна звярнуцца да неўролага па месцы жыхарства. Можна папрасіць накіраванне да неўролага ў Гродзенскі абласны дыспансэр або пад'ехаць туды на платную кансультацыю. Можна трапіць на прыём да неўролага і ў нашай 10-й мінскай бальніцы. Тэлефон рэгістратуры: 8 (017) 345 32 71.

☎— Івацэвічы, Людміла Мікалаеўна. 40 гадоў. Ціск скача — 140/90, 110/90, тахікардыя. Не аднойчы было кровазліццё ў вока. Прымаю эгілок, анапрылін. Эналапрыл — курсам. Ёсць яшчэ аўтаімунны гіпатырэёз. Куды мне трэба звярнуцца па дапамогу?

— Можна меркаваць, што ў вас адбываецца гарманальная перабудова. Сасуд у воку мог лопнуць на фоне крызу. Гэта ўскладненне гіпертаніі. Вашымі праблемамі павінны займацца тры спецыялісты — кардыёлаг, эндакрынолаг і афтальмолаг. Спачатку трэба звярнуцца да тэрапеўта або кардыёлага, які вырашыць, да каго вас яшчэ накіраваць. Абследаванне варта пачаць у саміх Івацэвічах. Калі ўзнікне неабходнасць, вас накіруюць у Брэсцкі абласны клінічны дыспансэр... Эгілок і анапрылін разам не прымаюцца, аднак пры паталогіі шчытападобнай залозы іх рэкамендуюць.

☎— Шаркаўшчына, Ірына Аляксандраўна. 80 гадоў. Дыягназ — ішэмія, параксізмальная форма мігальнай аритміі. П'ю амеадарон, метапралол па 1 таблетцы, палакард. У сакавіку пралячылася тыятрызалінам. Прымала ўколы і ў капсулах. Яшчэ на тры месяцы прызначалі лавастацін. Прыступы амаль спыніліся, але з'явіліся кароткія перабоі сэрца і слабасць. Як лячыцца далей?

— Трэба кантраляваць электракардыяграму, перыядычна хадзіць да ўрача. Кароткія збоі могуць быць прадвеснікам новага зрыву рытму. Каб яго папярэдзіць, трэба падысці да ўрача і, магчыма, павялічыць дозу прэпаратаў — аміядарону або метапралолу.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

Ну і ну!

ВЫПІЎ, СЕЎ ЗА РУЛЬ, ЗАТРЫМАЛІ...

І так — тры дні запар

Неверагодна, але факт: на працягу трох дзён запар кіроўцу тройчы затрымлівалі за рулём у нецвярозым стане. А яшчэ праз чацвёра сутак — зноў. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік аддзела дазнання Кастрычніцкага РАУС г. Гродна Уладзіслаў ПІКУЛІН.

Упершыню гродзенец Алег Шаўчэнка, 1988 года нараджэння, быў затрыманы супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі летась у чэрвені. На аўтамабілі айчыма «Рэно Меган Сцэнік» ён рухаўся па абласным цэнтры, не маючы права на кіраванне транспартным сродкам. Мала таго, супрацоўнік ДАІ, выявіўшы пах спіртнога, прапанаваў кіроўцу прайсці медыцынскі агляд у цэнтры «Псіхіятрыя — наркалогія». У выніку быў устаноўлены факт алкагольнага ап'янення, які Шаўчэнка патлумачыў тым, што выпіў тры келіхі піва ў кавярні на АЗС. Пастановай суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна гэта правапарушэнне каштавала яму штрафу ў памеры 1 мільёна 225 тысяч рублёў (35 базавых велічыняў). Падзейнічала?

Праз паўгода Алег атрымлівае вадзіцельскае пасведчанне на права кіравання транспартным сродкам катэгорыі «В», а затым купляе па рэкламнай абвестцы аўтамабіль «Мазда-626», на якім сёлета 29 сакавіка разам з двума сябрамі накіроўваецца ў Ліду ў госці да дзяўчат. Увечары, на зваротным шляху ў Гродна, кампанія робіць прыпынак у прыдарожнай кавярні. Гарбата ці кава хлопцаў, напэўна, не зацікавілі. Шаўчэнка, згодна з яго версіяй, ужывае адзін келіх моцнага піва «Арсенальнае» і — зноў за руль. Але ў Гродне машыну спыняе супрацоўнік ДАІ, а далей — як у леташнім выпадку з тым жа вынікам: алкагольнае ап'яненне. У кіроўцы забіраюць вадзіцельскае пасведчанне і талон да яго, выдаюць часовы дазвол, а аўтамабіль дастаўляецца на штрафстаянку.

Аднак не прайшло і сутак, як Шаўчэнка зноў аказваецца за рулём нападпітку. Забраўшы машыну са штрафстаянкі, ён нібыта паехаў рамантаваць яе ў гараж да сябра Аляксандра, дзе яны ўдвух выпілі паўтара літра піва. А затым, каб праверыць аўтамабіль пасля рамонту, Алег сядае за руль. І зноў спыняецца на дарозе, на гэты раз супрацоўнікамі спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла». Шаўчэнка адмаўляецца ад праходжання медагляду, і ў дачыненні да яго складаецца адпаведны адміністрацыйны пратакол. Ён адхіляецца ад кіравання машынай, якая агданяецца знаёмым у вышэйзгаданы гараж. Туды ж неўзабаве вяртаецца і Алег і — зноў за сваё. Выпіўшы, паводле яго слоў, адзін літр джын-тоніку і адзін літр піва, Шаўчэнка вырашае ехаць дахаты... на сваім, толькі што прыгнаным са штрафстаянкі аўтамабілі, паколькі «было позна». І ўначы, ужо 31 сакавіка, у чарговы, трэці за апошнія трое сутак, раз затрымліваецца Дзяржаўтаінспекцыяй. Медыцынскі агляд з дапамогай індыкатарнай трубкі пацвердзіў факт алкагольнага ап'янення.

Пасля гэтага Шаўчэнка застаецца без «колаў», але што за праблема... «Выручае» сябар Аляксандр, які 4 красавіка пазычае яму свой аўтамабіль «Аўдзі-100» для вырашэння «асабістых спраў». І ўначы гэта паездка зноў спыняецца супрацоўнікамі ДАІ, а ўжо добра вядомы ім кіроўца праходзіць чарговы медагляд, пасля чаго складаецца чарговы адміністрацыйны пратакол за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення. Як сцвярджае Шаўчэнка, ён выпіў паўтара літра піва.

Прыгавор суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна ў дачыненні да Алега Шаўчэнкі — пазбаўленне права кіравання ўсімі відамі транспартных сродкаў на пяць гадоў і штраф у памеры трохсот базавых велічыняў (10,5 мільёна рублёў). Пакаранне, безумоўна, сур'ёзнае. Аднак калі і гэта мера не перавыхавае, то наўрад ці хто з прыстойных удзельнікаў дарожнага руху быў бы супраць нормы заканадаўства, якая наогул пазбаўляла б падобных асобаў права на кіраванне транспартам. Пажыццёва. Няхай сабе п'юць піва, колькі хочацца. Аднак не выязджаюць пасля гэтага на дарогі, пагражаючы не толькі сабе, але і іншым.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«Трагедыя пра Макбета» на руінах замка Вітаўта

СПЕКТАКЛЬ тэатра лялек «Трагедыя пра Макбета» на руінах замка Вітаўта завяршаў у суботу вечарам праграму ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, прысвечаную Міжнароднаму дню музеяў.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

А пачыналася з прэзентацыі ў Сенатарскай зале выставы новых экспанатаў і дэфіле вясельнай моды. Затым наведвальнікаў запрасілі ў падарожжа па залах Старога і Новага замкаў і, акрамя таго, яны маглі далучыцца да выступленняў клуба славянскіх адзінаборстваў «Арыдан».

У нядзелю ў музеі гісторыі рэлігіі адбыўся баль з удзелам артыстаў Гродзенскай капэлы, трыа Cantabele і групы «Фалюш-балет», у музейным дварыскавае вырабы прапанавалі народныя майстры, а аркестр абласнога ўпраўлення МНС выступіў з марш-парадам і канцэртам. Дарэчы, пра пачатак і заканчэнне свята паведамілі трубачы з размешчанай побач з музеем гісторыі рэлігіі пажарнай каланчы, дзе цяпер таксама музей — гісторыі пажарнай службы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«КАЛОЖСКІ БЛАГАВЕСТ: ЭПІЛОГ»

У радасці свая вясна,
і калі стане вясновай душа —
народзіцца радасць.
М. СТРАЛЬЦОЎ.

Так ужо ўладкавана наша жыццё, што шчасце — не перманентны стан чалавека, а толькі асобныя моманты, імгненні і эпізоды. Шчасце нельга купіць, але кожны з нас у стане падзяліцца сонечным настроем з тым, хто знаходзіцца побач. І зведаць пры гэтым ні з чым не параўнальнае пачуццё радасці. Думаю, пад гэтымі словамі маглі б падпісацца ўсе прадстаўнікі дэлегацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, якая днямі наведала Ждановіцкі дашкольны дзіцячы дом, каб падарыць яго жыхарам кавалачак шчасця.

Нагодаў для такой сустрэчы было больш чым дастаткова. Па-першае, мы прывезлі з сабой падарунак — тэлевізар. Але, як адзначыла прарэктар па вучэбнай, выхаваўчай і сацыяльнай рабоце С. Копцева, ён не зусім звычайны: зводны хор БДПУ «Натхненне» (кіраўнік — Ларыса Ядлоўская) атрымаў гэты тэлевізар за ўдзел у IX Фестывалі праваслаўных спеваў «Каложскі благавест», што праходзіў у Гродне. У горад над Нёманам з'ехалася сорак харавых калектываў з шасці краін свету, а ў складзе журы былі прадстаўнікі пяці краін. У намінацыі «Свецкія хары» мы занялі трэцяе месца і прывезлі дадому не проста падарунак, а сімвал дабрыні, душэўнай цеплыні і спагады. Ідэя перадачы тэлевізара ў дзіцячы дом выспела ў самых студэнтаў, была падтрымана рэктаратам і ўзгоднена з начальнікам упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Т. Данілевіч. А ганаровая місія ўскладзена на народны ансамбль беларускай музыкі і песні «Ярыца», які да таго ж падрыхтаваў свой уласны сюрпрыз. Выступленне ансамбля стала для дашкалят сапраўдным святам: ужо пасля першай песні многія сталі падпяваць і падтанцоўваць, а пад задзірыстую і вясёлую польку з прыпеўкамі, забыўшыся пра сарамлівасць, разам з дзяўчатамі ў нацыянальных строях пусціліся ў скокі. У вачах дзяцей свяцілася непадробная радасць — тая самая, вясновая і шчырая — і гэта, у сваю чаргу, стала падарункам для нас, прысутных.

Дырэктар дзіцячага дома Тамара Красоўская выказала ўдзячнасць і артыстам, і рэктарату БДПУ за тое, што адным шчаслівым момантам у жыцці дзетак стала больш. «Самае важнае для нашых выхаванцаў (а ўсе яны сацыяльныя сіроты) — стасункі з новымі людзьмі, атмасфера радасці і весялосці. Прыязджайце да нас часцей, дзеці будуць вас чакаць».

Дарэчы, многія супрацоўнікі дзіцячага дома — нашы выпускнікі, ды і сама Тамара Васільеўна мае ажно тры (!) дыпломы БДПУ. Яна з такой любоўю расказвала пра сваю працу, сваіх выхаванцаў, што я ў чарговы раз упэўнілася: наша alma mater можа ганарыцца спецыялістамі, якім дае дарогу ў прафесію. А яшчэ я зразумела, што ўсе мы робім адну вельмі важную справу: дапамагаем зрабіць свет дзяцінства яркім і непаўторным.

Вераніка МАНДЗІК.

белагропромбанк
традиции будущего

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Жукова, 3

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	5
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	5.1.1.	284 714,2	230 441,2
3	Средства в Национальном банке	1102	5.1.2.	109 600,5	253 710,1
4	Ценные бумаги:	1103	5.1.3; 6.	472 872,0	1 383 898,9
	для торговли	11031		-	-
	удерживаемые до погашения	11032		5,8	4,4
	в наличии для продажи	11033		472 866,2	1 383 894,5
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	5.1.4.	83 554,7	193 140,3
6	Кредиты клиентам	1106	5.1.5; 6.	17 839 436,6	12 758 045,8
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	5.1.6.	50 808,2	715,6
8	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
9	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1108	5.1.7; 6.	722 426,5	540 925,5
11	Деловая репутация			-	-
12	Прочие активы	1109	5.1.8.	208 363,1	172 861,4
13	**ИТОГО активы**	**110**		**19 771 775,8**	**15 533 738,8**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1202	5.1.9.	2 554 477,1	1 013 053,3
16	Кредиты и другие средства банков	1205	5.1.10.	3 658 447,0	1 872 756,8
17	Средства клиентов	1206	5.1.11; 6.	8 547 662,4	7 894 365,7
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	5.1.12.	194 308,4	198 237,9
19	Прочие обязательства	1209	5.1.13; 6.	211 884,1	160 366,9
20	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**15 166 779,0**	**11 138 780,6**
21	**КАПИТАЛ**				
22	Уставный фонд	1211	5.1.14.	3 878 600,0	3 828 598,5
23	Эмиссионный доход	1212		-	-
24	Резервный фонд	1213	5.1.15.	85 504,8	41 862,5
25	Накопленная прибыль	1214	5.1.16.	391 268,3	291 428,2
26	Фонд переоценки статей баланса	1215	5.1.17.	248 313,9	232 500,1
27	Доля изменений в капитале зависимых юридических лиц			-	-
28	Доля изменений в капитале совместно контролируемых юридических лиц			-	-
29	Всего капитал, принадлежащий собственникам головной организации - банка			4 603 687,0	4 394 389,3
30	Доля меньшинства		5.1.18.	1 309,8	568,9
31	**ВСЕГО капитал**	**121**		**4 604 996,8**	**4 394 958,2**
32	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**19 771 775,8**	**15 533 738,8**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011	5.2.1; 6.	2 120 655,7	1 001 198,8
2	Процентные расходы	2012	5.2.1; 6.	1 431 672,5	721 422,5
3	Чистые процентные доходы	201	5.2.1.	688 983,2	279 776,3
4	Комиссионные доходы	2021	5.2.2; 6.	234 797,1	188 697,1
5	Комиссионные расходы	2022	5.2.2; 6.	36 550,6	19 376,3
6	Чистые комисионные доходы	202	5.2.2.	198 246,5	169 320,8
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	5.2.3; 6.	(-96278,6)	94 369,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	5.2.4; 6.	(-378,8)	767,8
9	Доход в форме дивидендов	205	5.2.5; 6.	34,5	36,6
10	Чистые отчисления в резервы	206	5.2.6; 6.	363 528,9	63 207,0
11	Прочие доходы	207	5.2.7; 6.	438 008,9	98 801,9
12	Операционные расходы	208	5.2.8; 6.	574 640,8	360 229,7
13	Прочие расходы	209	5.2.9; 6.	61 734,6	59 196,2
14	Налог на прибыль	210	5.2.10.	81 510,8	42 460,8
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		147 200,6	117 979,4
16	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			-	-
17	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
18	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)			147 200,6	117 979,4
19	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая собственникам головной организации - банка			146 730,5	117 610,8
20	Доля меньшинства в прибыли (убытке)			470,1	368,6
21	Базовая прибыль на простую акцию (в рублях)		5.2.11.	76,64	115,24
22	Разводненная прибыль на простую акцию		5.2.12.	-	-

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Символ	Наименование статей капитала							
			уставный фонд	эмиссионный доход	резервный фонд	накопленная прибыль (убыток)	фонды переоценки статей баланса	всего капитал, принадлежащий собственникам головной организации-банка	доля меньшинства	всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
Раздел 1. За год, предшествующий отчетному										
1	Остаток на 1 января 2008 г.	3011	1878600,0	-	30725,9	195691,3	182178,9	2287196,1	174,6	2287370,7
2	Изменения статей капитала, в том числе:	3012	1949998,5	-	11136,6	95736,9	50321,2	2107193,2	394,3	2107587,5
2.1	совокупныйдоход	30121	x	x	x	117610,8	50316,8	167927,6	368,6	168296,2
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	x	11136,6	(-11136,6)	x	-	x	-
2.3	операции с учредителями (участниками)	30123	1949998,5	-	x	(-63,0)	x	1949935,5	x	1949935,5
2.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	1950000,0	-	x	x	x	1950000,0	x	1950000,0
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(-63,0)	x	(-63,0)	x	(-63,0)
2.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	(-1,5)	x	x	x	x	(-1,5)	x	(-1,5)
2.7	перераспределение между статьями капитала	30125	-	-	-	-	-	-	x	-
2.8	прочие изменения	30126	-	-	-	(-10674,3)	4,4	(-10669,9)	25,7	(-10644,2)
	Приобретение дочернего юридического лица		x	x	x	x	x	x	-	-
3	Остаток на 1 января 2009 г.	3013	3828598,5	-	41862,5	291428,2	232500,1	4394389,3	568,9	4394958,2
Раздел II. За отчетный год										
4	Остаток на 1 января 2009 г.	3011	3828598,5	-	41862,5	291428,2	232500,1	4394389,3	568,9	4394958,2
5	Изменения статей капитала, в том числе:	3012	50001,5	-	43642,3	99840,1	15813,8	209297,7	740,9	210038,6
5.1	совокупный доход	30121	x	x	x	147200,6	15813,8	163014,4	486,1	163500,5
5.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	x	43642,3	(-43642,3)	x	-	x	-
5.3	операции с учредителями (участниками):	30123	50001,5	-	x	(-1766,8)	x	48234,7	x	48234,7
5.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	50000,0	-	x	x	x	50000,0	x	50000,0
5.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(-1766,8)	x	(-1766,8)	x	(-1766,8)
5.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	1,5	x	x	x	x	1,5	x	1,5
5.7	перераспределение между статьями капитала	30125	-	-	-	-	-	-	x	-
5.8	прочие изменения	30126	-	-	-	(-1951,4)	-	(-1951,4)	234,8	(-1716,6)
	Приобретение дочернего юридического лица		x	x	x	x	x	x	20,0	20,0
8	Остаток на 1 января 2010 г.	3013	3878600,0	-	85504,8	391268,3	248313,9	4603687,0	1309,8	4604996,8

КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Прибыль за отчетный период	301211		147200,6	117610,8
2	Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период, в том числе:	301212		15813,8	50316,8
2.1	переоценка основных средств	3012121		15243,0	48981,9
2.3	переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования	3012122		570,8	1334,9
2.4	переоценка инструментов хеджирования	2012124		-	-
2.5	переоценка прочих статей баланса	3012125		-	-
	Доля в совокупном доходе, принадлежащая собственникам головной организации-банка			163014,4	167927,6
	Доля меньшинства в совокупном доходе			486,1	368,6
3	ИТОГО совокупный доход за отчетный период	30121	5.3.	163500,5	168296,2

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	**Потоки денежных средств от операционной деятельности**				
2	Полученные процентные доходы	7010		2 131 686,8	1 008 105,8
3	Уплаченные процентные расходы	7011		-1 439 365,8	-705 403,9
4	Полученные комиссионные доходы	7012		232 787,5	190 304,4
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		-34 191,5	-18 998,4
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		82 188,6	119 495,1
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		-378,8	767,8
8	Доход в форме дивидендов	7016		34,5	36,6
9	Прочие полученные доходы	7017		329 683,5	122 376,1
10	Прочие уплаченные расходы	7018		-446 016,7	-396 627,1
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		-87 175,4	-50 966,9
12	Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах	701		769 252,7	269 089,5
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		69 919,8	-94 923,6
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	7021		908 486,6	-839 986,2
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках	7022		45 018,3	-42 522,5
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	7023		-4 956 163,1	-6 126 141,6
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		42 029,4	-143 324,2
18	Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов	702		-3 890 709,0	-7 246 898,1
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030		1 541 731,9	461 184,9
20	Чистый прирост (снижение) денежных средств в форме кредитов и других средств банков	7032		1 512 531,9	654 724,3
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		247 693,6	3 978 017,5
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		-16 955,8	102 667,9
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		-60 517,8	80 762,3
24	Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств	703		3 224 483,8	5 277 356,9
25	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		103 027,5	-1 700 451,7
26	**Потоки денежных средств от инвестиционной деятельности**				
27	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	7110		-226 616,7	-134 768,9
28	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	7111		-4 851,6	-662,8
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7112		-58 692,6	-1 403,3
30	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7113		-	-
31	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7114		-41,8	-23,5
32	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7115		32,2	32,2
33	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		-290 170,5	-136 826,3
34	**Потоки денежных средств от финансовой деятельности**				
35	Эмиссия акций	7211		50 320,0	1 950 000,0
36	Выкуп собственных акций	7212		-	-1,5
37	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213		1,5	-
38	Выплата дивидендов	7214		-1 822,1	-90,9
39	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		48 499,4	1 949 907,6
40	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73		55 332,4	6 067,8
41	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74	5.4.1.	-83 311,2	118 697,4
42	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740		x	400 387,2
43	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741	5.4.2.	317 076,0	x

Председатель Правления **С.Н. Румас**

Главный бухгалтер **М.А. Шаповалова**

Дата подписания «5» мая 2010 г.

ПЕРЕЧЕНЬ УЧАСТНИКОВ БАНКОВСКОГО ХОЛДИНГА:

- ОАО «Белагропромбанк» – головная организация банковского холдинга, место нахождения: г. Минск, пр-т Жукова, 3;
- ЧУП «Озерицкий-Агро», место нахождения: Минская область, Смолевический район, д. Слобода, ул. Центральная, 7;
- ОАО «Агролизинг», место нахождения: г. Минск, ул. Ольшевского, 24, офис 907;
- Частное предприятие «Агробизнесконсалт», место нахождения: г. Минск, ул. Ольшевского, 24, офис 902/2;
- ОАО «Туровщина», место нахождения: Гомельская область, Житковичский район, д.Озераны, ул. Молодежная, 1.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

Общество с дополнительной ответственностью «Владаудит»

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 21 сентября 2000 г. № 1081, УНП 190147255
220005, г. Минск, ул. Смолячкова, 9-302

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ № 1-4/43

по консолидированной финансовой отчетности открытого акционерного общества «Белагропромбанк» за период с 1 января по 31 декабря 2009 года

г. Минск 7 мая 2010 г.

Председателю Правления
ОАО «Белагропромбанк»

Румасу С.Н.

Мы, аудиторская организация – общество с дополнительной ответственностью «Владаудит» ***(специальные разрешения (лицензии), выданные: Министерством финансов Республики Беларусь – №02200/0495306, срок действия 15.02.2009–15.02.2014 (решение № 432 от 19.12.2008) и Национального банка Республики Беларусь – № 8, срок действия 14.11.2005–14.11.2010 (решение № 11 от 14.11.2005))***, провели аудит прилагаемой консолидированной финансовой отчетности открытого акционерного общества «Белагропромбанк» и его дочерних юридических лиц (далее – Холдинг) ***(220036, г. Минск, пр. Жукова, 3, зарегистрировано решением Национального банка Республики Беларусь от 3 сентября 1991 г., № 20, УНП 100693551),*** состоящей из консолидированного бухгалтерского баланса по состоянию на 1 января 2010 года, консолидированных отчетов: о прибыли и убытках; об изменении капитала; о движении денежных средств за 2009 год, пояснительной записки.

Руководство Холдинга несет ответственность за подготовку и представление консолидированной финансовой отчетности в соответствии с законодательством, нормативными актами, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки консолидированной финансовой отчетности банками Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной консолидированной финансовой отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности», Инструкции о регулировании аудиторской деятельности в банках, небанковских, кредитно-финансовых организациях, банковских группах и банковских холдингах, утвержденной Национальным банком Республики Беларусь, Инструкции по составлению консолидированной финансовой отчетности банками Республики Беларусь, правил аудиторской деятельности, утвержденных Министерством финансов Республики Беларусь, правил аудиторской деятельности ОДО «Владаудит», которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной консолидированной финансовой отчетности.

В ходе аудита нами выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации о консолидированной финансовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения консолидированной финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения консолидированной финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Холдинга с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, но не для выражения мнения относительно эффективности функционирования самой системы внутреннего контроля.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления о консолидированной финансовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения по данной консолидированной финансовой отчетности.

По нашему мнению, прилагаемая консолидированная финансовая отчетность Холдинга достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение открытого акционерного общества «Белагропромбанк» и его дочерних юридических лиц на 1 января 2010 года, результаты их деятельности и движение денежных средств за 2009 год, сформирована в соответствии с требованиями законодательства, нормативных актов, регулирующих порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности банками Республики Беларусь.

Директор **В.Д. Михаленя**

Руководитель группы аудиторов **С.Н. Протащик**



ДЗЕ НАША НЕ ПРАПАДАЛА

Гэта гісторыя адбылася амаль сто гадоў таму, але крылатае: «Глядзі, а то выйграеш, як Сібіракова жонка» не-не ды і ўспомніцца...

Як яна выйграла? Раскажу.

У 1916 годзе тры нашыя вяскоўцы (і, дарэчы, браты...) ўкраліся ў казённы лес ля Давыд-Гарадка і тамака ўпалявалі казулю. На гора... Бо на стрэл тут жа на конях прымчаліся егер і два ахоўнікі, сталі складаць акт, патрабаваць, каб браты здалі зброю. Ну каму гэта спадабаецца?! Нікому! Разгарэўся канфлікт, і скончыўся ён вельмі трагічна: егер быў смяротна паранены, над братамі адбыўся суд і аднаго з іх — Міхала — прыгаварылі да ссылкі ў Сібір — на катаргу. А ён на той час быў зусім малады, нядаўна жанаты, і, што важна, на вяселле яму цесць падарыў кажушок — новенькі, цёплы...

Міхал у тым самым падарунку сядзеў у зале суда, потым яго сталі выводзіць...

А жонка не ў слёзы, не! І не тое каб кінуцца адвітацца... Падышла і сказала:

— Аддай кажушок, не хачу, каб бацькаў падарунак дзесь у Сібіры прапаў... Разам з табою.

Што было рабіць чалавеку: паглядзеў на жонку, і, раз яна загадвае, скінуў апратку, аддаў...

А праз год была рэвалюцыя, і Міхал вярнуўся дамоў, да сваіх бацькоў.

Першы ж візіт, які ён нанёс, быў да жонкі, да Мані. Зайшоў у хату, даў ёй «Дзень добры», агледзеўся, пацікавіўся кажушком. Жонка, радая, дастае яго з шафы, кажа:

— Вось... Ніхто не насіў: новенькі, чысценькі...

— Гэта добра, — мужык ёй сказаў, — з ім цяпер і жыві...

Сам жа (у вёсцы яму мянушку далі — Сібірак) неўзабаве пабраўся з другой дзяўчынай. Выгадаваў з ёй двух сыноў і дачку, шмат унукаў, потым, як і належыць, сышоў (у лепшы свет)... Але памяць пра сябе пакінуў. У тым ліку і крылатым «Выйграеш, як Сібіракова жонка».

Сцяпан НЕФІДОВІЧ,
в. Любань, Лунінецкі раён.

АБОЕ РАБОЕ

Не ведаю, як іншых, мяне ў студэнцкім інтэрнаце нішто не «даставала» больш, чым мыццё падлогі. Цэлы тыдзень! З дня ў дзень!.. Суседзям па пакоі — Віктару і Андрэю — гэта што раз плюнуць, іх армія прывычыла: анучку ў рукі і пайшлі — праціраць стол, падаконне, ножкі крэслаў, ложкаў, потым — усе куточкі падлогі... Калі ж прыходзіла мая чарга, то ўсё, што я мог — гэта размазаць бруд больш-менш раўнамерна. «За такое ні адзін нарад у войску ўляпілі б!» — казалі суседзі. Мне... А тут...

Чарга прыбірацца была за Віктарам. Што ён і рабіў... А Андрэй, пад руку яму, вазьмі ды і ляпні: «Чысцей трэба мыць, рыжык! — Віця напраўду быў рыжым — А то бруд застаецца».

Той не стрымаўся, сказаў: «Ты лепей за сабой глядзі...»

Слова за слова — разгарэлася спрэчка. Прычым не на жарт! І стрэліла ж камусьці ў галаву паклікаць мяне(!) у «арбітры».

— Скажы, Лёня, я ж лепей прыбіраю? — насядаў адзін.

— Не, ты праўду кажы, — наступаў другі. — Чысцей прыбіраю я?

А мне што заставалася?

Анекдот, на шчасце, успомніў пра тое, як два п'яных прычапіліся да цвярозага: скажы, маўляў, што гэта свеціць — сонца ці месяц? А таму, беднаму, і адно скажы — атрымаеш і другое. Пакумекаў ён ды і гаворыць: хлопцы, прыезджы я. Толькі з цягніка. Што ў вас тут свеціць, не разабраў яшчэ...

Вось і я змікіціў. Кажу:

— Каторы з вас лепш прыбірае, не ведаю... Але ж што абодва горш за мяне — факт!

Сцэна была, як у Гогаля ў «Рэвізоры», потым грымнуў смех:

— Ой, трымайце мяне! Ён прыбірае лепш?! — рагатаў адзін з хлопцаў.

— Вой, зараз лопну! — заходзіўся другі. Потым, ледзь жывыя, яны прызналі:

— Ты, Лёня, правільна сказаў...

Болей канфліктаў у нас не было. Жылі дружна.

Леанід Раманавіч КАРОТКІН,
в. Вярэнькі, Пастаўскі раён.

«НЕСОЗНАТЕЛЬНЫЙ»

Было гэта ў пачатку 60-х гадоў, калі планавалася літаральна ўсё, нават прыём у кампартыю. У сэнсе — колькі чалавек трэба прыняць увогуле, колькі з іх рабочых, колькі служачых і гэтак далей. План, само сабою, закон. Значыць, Богу душу аддай, але выканай! Інакш — вымовы, ганенні, непрыемнасці: аж да зняцця з пасады, аж да адлічэння з радоў. А ўжо гэта па тым часе — кранты, свайго роду воўчы білет.

То неяк пагроза атрымаць яго павісла над маладым калгасным парторгам: не дацягваў ён трохі да плану. Што рабіць? У чарговы раз перабраў, апытаў вяскоўцаў і такі ж вылучыў вартага! Ён і вайну прайшоў ад званка да званка (узнагароды ё), і ў мірным часе прыкладам служыць... Вось толькі ўпіраўся, бядак, не хацеў. Але пасядзелі (дарэчы, за чаркай) пагаварылі, рашылі разам, што не страшней жа ў той партыі, чым на перадавой...

Потым на цвярозую галаву, мужык, казалі, адумаўся, але ж слова сваё стрымаў: як і належыць, вывучыў статут, адбыў кандыдацкі стаж, павезлі яго ў райкам — ужо ў члены КПСС прымаць, сталі задаваць пытанні. І ён адказваў. Як быццам добра, правільна. Спачатку. У канцы адзін інструктар дастаў — прычапіўся з роспытам пра ўмовы жыцця, пра побыт.

— Ну, побыт як побыт, — адказваў кандыдат (якім яму, таму побыту, быць, калі пашпартоў вяскоўцам не давалі, а ў калгасах яшчэ нядаўна працавалі за палачкі)...

А таму інструктару, бач, дэталі патрэбны:

— Ну, вось скажыце, — чапляецца, — на чым вашы дзеці спяць?

— Мае? — не вытрымаў франтавік, — На саломе. Гэта вы сваім, можа, пярыны сцелеце.

...Час быў іншы крыху, рэпрэсій за выпад, за праўду кандыдат не зведаў, але і ў партыю яго не ўзялі, сказалі: «несознательный».

«Сознательный», трэба разумець, проста павінен быў умець... хлусіць.

Соф'я КУСЯНКОВА,
в. Лучын, Рагачоўскі раён.

ДАЛЁКАЕ? БЛІЗКАЕ!

Прыгожы касцёл у Вялікай Бераставіцы!..

Пры ім — дыхтоўны двухпавярховік плябаніі.

Падчас вайны менавіта яго аблюбаваў нямецкі ваенны камендант. А пасля, калі фашыстаў выгналі, тут часова размясціўся ваенкамат.

Займаўся ён рознымі справамі, у тым ліку і прызывам у войска. А трэба сказаць, што яно і тады нехта з маладых ішоў на службу з падскокам, а нехта хацеў «адкасіць». А ўжо як?

Янка вырашыў прыкінуцца, мякка кажучы, глухаватым. Трымаўся асабняком, ні з кім не размаўляў, ці не апошнім зайшоў у пакой, дзе працавала камісія. Паглядзела яна яго, паслухала, — моцны хлопец, як дуб! Сталі правяраць слых — развялі рукамі: недачувае бядак, трэба адпускаць дадому.

— Трэба дык трэба, — падміргнуўшы доктару, уздыхнуў капітан і ціхенька дадаў, — зараз яшчэ раз праверым.

Следам за Янкам яны выйшлі з кабінета, падаліся ў бок лесвіцы, пачакалі, пакуль хлопец спусціцца да сярэдзіны пралёту. А далей... Капітан узяў пустую сметніцу і пусціў яе ўслед па лесвіцы.

Што тут было! Янка падскочыў, прапусціў вядро паміж ног, стаў на прыступку, палахліва азірнуўся па баках.

— Які адменны слых! — усклікнуў доктар.

— А галоўнае — якая рэакцыя! — не хаваючы ўсмешкі, зазначыў капітан. — Гэты прызыўнік — сапраўдная знаходка для пагранічных войскаў!

У выніку наш Янка, які так хацеў адсядзецца дома, апынуўся на мяжы, на Далёкім Усходзе.

М. МАСКАЛЬЧУК, *г.п. В. Бераставіца.*

З-ПАД ПАЛКІ

Вёсачка, дзе я нарадзіўся і вырас, цяпер лічыцца неперспектыўнай. А тады, у 70-х, яна ўмоўна дзялілася на дзве — па колькасці статкаў, у кожным з якіх налічвалася па трыццаць і больш рагуляў. Ды што там каровы! Амаль гэтулькі ж было дзяцей!

Яны, як і трэба было чакаць, таксама дзяліліся — на «канцы». І варагавалі — то жартам, а то і ўсур'ёз. Часцей жа проста каманда на каманду гулялі ў футбол.

...Так атрымалася, што ў нашым канцы было сваё футбольнае поле, свае сапраўдныя футбольныя вароты. Таму гульні, як правіла, праходзілі на нашай пляцоўцы.

Што нам, на жаль, не памагала, бо «фанацелі» ад гэтага віду спорту толькі двое старэйшых дзяцей — Генік і Віцька. Астатнюю драбнату трэба было далучаць яшчэ, выхоўваць. І, відаць, зусім не так, як гэта рабілі «фанаты».

Яны пасля кожнай гульні ладзілі «разбор палётаў»: крычалі, зневажалі (а то і распускалі кулакі), паказвалі, як пасаваць, як біць вуглавыя...

Згодны, цвічыць нас, можа, і трэба было, але далікатней. А так...

Аднойчы надвячоркам мы ўзбунтаваліся, ссеклі... футбольныя вароты, зацягнулі ў лес і схавалі.

Па факце «вандалізму» было праведзена «следства», і ўсім «удзельнікам акцыі пратэсту» паступіў загад зрабіць як было.

Узрадаваныя тым, што абышлося без пабояў, мы дружна ўзяліся за справу, і неўзабаве новыя вароты былі на месцы.

Генік з Віцькам тут жа прапанавалі іх абнавіць. Яны ўдвух стварылі адну каманду, мы — другую. Гулялі так: адны стаяць на воротах, другія б'юць па мячы.

Розніца ў ліку была велізарная! Вядома ж, не ў нашу карысць. Пасля чаго «фанаты» зноўку паставілі нас на вароты. На гэты раз... задам да гульнёвага поля. І тую ж розніцу ў ліку прабілі — па тых месцах, якія таксама маюць па два паўшар'і, але не думаюць.

Пасля таго выпадку мы з сябрамі актыўна заняліся спортам, але іншым відам — бегам, каб Генік з Віцькам не маглі нас ні дагнаць, ні загнаць на футбольнае поле.

А. ЛІПЕНЬ, *Іўеўскі раён.*

ДАЙ, ДЖЫМ...

Як вядома, збан да пары ваду носіць. Ліфт пасажыраў возіць — таксама. Той раніцай адзін з двух пад'ёмнікаў у нашым пад'ездзе падазрона заскрыпеў і кабіна разоў колькі нядобра скаланулася.

Дыспетчару пра гэта ўжо, мусіць, паведамлялі, бо на мой выклік ён коратка сказаў:

— Механік у курсе. Будзе глядзець.

Глядзеў ці не, не ведаю. Аднак назаўтра тыя, старыя, непрыемнасці зноў паўтарыліся, горш за тое, да іх дадаліся новыя, бо паміж трэцім і другім паверхамі ліфт стаў падвісаць...

Дыспетчар быў, відаць, іншы — распытаў, што здарылася, паабяцаў прыслаць механіка...

Зноў жа, ці дайшоў ён, не ведаю — ведаю, што ў наступны раз, спускаючыся ў ліфце, адчула, як кабіна здрыгануласа і... стала — паміж паверхамі.

— Не можа быць! Да вас жа выходзіў механік, — здзівіўся дыспетчар і праз паўзу дадаў: — Колькі вас там?

— Двое.

— Мажныя?

— Ну... — мне стала смешна, — на дваіх кілаграмаў семдзесят...

— Вы з дзіцем?.. Дык, можа, ваш хлопчык сваволіў, падскокваў?.. Ліфт тады можа завіснуць...

— Не, — адказваю, — мой хлопчык калі і падскочыць, то ліфт не «заўважыць».

З дынаміка пачулася сапенне (як быццам дыспетчар хацеў унюхаць, чым у кабіне пахне).

— Паслухайце, вы там цвярозая? — строга запытаў ён.

Я засмяялася:

— Як шкло! Толькі ў кабінцы цяпер — з сабакам, з маленькай таксай-«хлопчыкам»... Так што пакуль ён шахту не затапіў, хутчэй прысылайце майстра.

Дыспетчар — добрая душа — усё зразумела і да прыходу механіка яшчэ двойчы выходзіла на сувязь. Пыталася, як сябе адчуваю я, ці не страшна? І ці сабака?

«Хлопчык», трэба сказаць, нерваваўся, скуголіў — ці то ад сваёй сабачай клаўстрафобіі, ці то ад прагі свабоды.

Яна да нас такі зазірнула — праз адчыненыя дзверы ліфта ў выглядзе вясёлага каржакаватага дзядзькі-механіка, які захацеў перш-наперш пацяснуць кароценькую лапку сабаку — «за добрыя паводзіны».

Знаходзіўся майстар у той стадыі падпітку, калі яшчэ можаш рабіць справу і не абурацца на тых, хто адарваў цябе ад добрай кампаніі.

С. Б., *г. Мінск.*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Змікіціць *— зразумець што-небудзь, здагадацца.*

Клаўстрафобія *— боязь закрытай прасторы.*

Плябанія *— дом, які належыць парафіі і ў якім жыве плябан (пробашч, які кіруе вясковай парафіяй).*

Украсціся *— непрыкметна ўвайсці, пранікнуць куды-небудзь.*

Цвічыць *(мясц.) — павучаць, настаўляць, сварыцца.*

АКСАКАЛА КІШЭННЫХ КРАДЗЯЖОЎ ЗАТРЫМАЛІ

У Віцебску ў самым цэнтры горада з доказамі злачынства затрымалі 65-гадовага «аксакала»-кішэнніка. У асноўным дзядуля «працаваў» у грамадскім транспарце. У чарговы раз гэты злодзей пенсійнага ўзросту вельмі прафесійна дастаў кашалёк 19-гадовай студэнткі з поліэтыленавага пакета.

Другі «майстар» кішэнных крадзяжоў прыцягнуў увагу міліцыянераў тым, што доўгі час праводзіў на аўтавакзале, але, па ўсіх прыкметах, ехаць нікуды не спяшаўся. У кавярні аўтавакзала выбіраў чарговага падвыпіўшага «кліента», якому хацелася пагаварыць па душах і працягнуць застолле. Самае дзіўнае, што будучая ахвяра сама аплачвала выпіўку незнаёмцу. Потым злодзей, калі даводзіў новага таварыша да дома, чысціў ягоныя кішэні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Розніца ў ліку была велізарная! Вядома ж, не ў нашу карысць. Пасля чаго «фанаты» зноўку паставілі нас на вароты. На гэты раз... задам да гульнёвага поля. І тую ж розніцу ў ліку прабілі — па тых месцах, якія таксама маюць па два паўшар'і, але не думаюць.

Пасля таго выпадку мы з сябрамі актыўна заняліся спортам, але іншым відам — бегам, каб Генік з Віцькам не маглі нас ні дагнаць, ні загнаць на футбольнае поле.

А. ЛІПЕНЬ, *Іўеўскі раён.*

НАША КУЛЬТУРА — НАШ ПАСОЛ

«Звязда» ўжо пісала пра ініцыятыву праўлення Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі распачаць распрацоўку канцэпцыі папулярызацыі беларускай культуры за мяжой. Нядаўна зноў у таварыстве адбылася цікавая і карысная размова на гэту тэму. Змест дыскусіі, калі казаць вельмі лаканічна, тычыўся таго, як зрабіць нашу краіну больш вядомай і прывабнай у свеце.

Уладзімір Гілеп, старшыня Беларускага фонду культуры ўпэўнены: у нас ёсць 20-гадовы вопыт папулярызацыі беларускай культуры за мяжой. І мінуў той час, калі кожны мастацкі калектыў імкнуўся пратурхнуць сябе ў Еўропу. Цяпер варта задумацца, і ў першую чаргу Міністэрству культуры і Міністэрству замежных спраў, над тым, а ці ёсць у нас дакладная палітыка культурнага засваення іншых краін? Калі няма, то настаў час яе выпрацаваць, а галоўнае, не цягнуць з гэтай справай.

Намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі быў менш катэгарычным. Ён лічыць, што культурная прысутнасць Беларусі ў свеце павінна быць больш шырокай. Гэты тэзіс нават не трэба абмяркоўваць. Бо сёння культура з'яўляецца найлепшым дыпламатычным сродкам. Тым больш што мы маем унікальную і адметную культуру, якая захавалася і адроджана ў нас, якая мала дзе ў свеце існуе. Асабліва гэта датычыцца багацця рамёстваў, фальклору. Далёка не ўсюды існуе такая сістэма падтрымкі таленавітай моладзі, як у Беларусі.

Тут узнікае пытанне аб каардынуючай ролі дзяржаўных арганізацый у справе папулярызацыі беларускай культуры за мяжой. І там сёння патрэбна прадстаўляць якасны культурны прадукт. Ужо проста выступленне сувенірна-фальклорных ансамбляў недастаткова. Іх канцэрты, па першае, ужо нецікавыя замежнаму гледачу, па-другое, яны не могуць даць больш-менш поўнае ўяўленне аб здабытках і традыцыях нашай культуры. А нам ёсць чым ганарыцца. Безумоўна, сёння дзяржава заахвочвае гастролі прафесійных калектываў. Дзякуючы гэтаму нашу нацыянальную оперу адкрылі ў свеце. Гастролі ў Германіі і Галандыі паказалі, што беларуская опера можа быць цікавай прыхільнікам гэтага мастацтва з розных краін.

Т. Стружэцкі не абышоў увагай «гарачую» тэму стварэння за мяжой беларускіх культурных цэнтраў. На яго думку, з гэтай справай мы спазніліся. Так, маем два цэнтры: у Польшчы і ва Украіне, але гэта для самастойнай еўрапейскай краіны з багатай культурнай спадчынай недастаткова. У Варшаве, напрыклад, дзейнічае 21 культурны цэнтр розных дзяржаў, а сама Польшча, дарэчы, далёка не самая заможная краіна Еўропы, мае за мяжой 17 такіх паўнацэнных прадстаўніцтваў. Яны актыўна рэалізоўваюць культурную палітыку сваёй дзяржавы. Т. Стружэцкі пагадзіўся з агульнай думкай, што павінны быць нейкі каардынацыйны цэнтр па папулярызацыі за мяжой культурных каштоўнасцяў беларускага народа. Паводле яго слоў, Міністэрства культуры робіць для гэтага ўсё неабходнае. Але рэсурсы ведамства абмежаваныя, таму дарэчы было б аднаўленне самастойнай дзейнасці Інстытута культуры Беларусі. І стварыць у яго структуры падраздзяленне, якое б мэтанакіравана займалася праблемамі культурнага супрацоўніцтва з блізкім і далёкім замежжам. Калі гэта ўдасца зрабіць, то можна спадзявацца на ўзнікненне такога каардынацыйнага механізму. Але тут, падкрэсліў Т. Стружэцкі, шырокае поле дзейнасці для грамадскіх арганізацый. На яго погляд, досвед работы Беларускага фонду культуры і шэрагу іншых грамадскіх аб'яднанняў сведчыць пра вялікі патэнцыял іх сувязяў і кантактаў з культурным асяроддзем замежжа.

Намеснік старшыні Беларускага фонду культуры Анатоль Бутэвіч у сваю чаргу таксама падтрымаў і развіў ідэю каардынацыі намаганняў усіх галін культуры на замежным кірунку. Назваў гэту прапанову вельмі слушнай. Інакш па-ранейшаму будзе назірацца распыленне сілаў і сродкаў. Ён падкрэсліў, што каардынацыя — гэта не цэнзура, а, хутчэй, дапамога ў згуртаванні творчых сілаў нашай мастацкай інтэлігенцыі. На погляд А. Бутэвіча, надышоў час больш уважліва паглядзець на сітуацыю са знаходжаннем помнікаў за мяжой нашым слынным дзеячам літаратуры, культуры і мастацтваў. Па вобразным выказванні А. Бутэвіча, гэта пакуль некранутае, не ўзаранае нікім поле дзейнасці. Тут, лічыць прамоўца, павінен быць свой план, распрацаваныя свае падыходы па яго рэалізацыі. І тут варта браць прыклад з украінцаў, якія здолелі ўсталяваць у свеце прыкладна пяць тысяч помнікаў Тарасу Шаўчэнку. Грунтоўнага пераасэнсавання патрабуе і работа з перакладчыкамі беларускай літаратуры на замежныя мовы. У гэтай сферы мы страцілі нават тое карыснае, што некалі было назапашана ў савецкія гады, канстатаваў А. Бутэвіч.

На яго думку, неабходны дакладны аналіз усяго больш-менш вартага ўвагі, што зроблена па папулярызацыі беларускай культуры за мяжой. І магчыма, плён прынесла б сумесная работа міністэрстваў культуры, замежных спраў і адукацыі. Паглядзець, у прыватнасці, як у гэтай справе задзейнічаны студэнты, ці пішуць курсавыя, дыпломныя работы па тэме беларускай культуры за мяжой. Яшчэ адну важную праблему закрануў выступоўца: у якіх фестывалях, конкурсах, мастацкіх выставах нам трэба ўдзельнічаць? Безумоўна, у тых, ад якіх найбольшая карысць Беларусі.

— Артыст, музыкант, як творчая асоба, не можа існаваць без гастроляў. Сёння ў нас няма такой арганізацыі, якая б займалася «вывазам» беларускіх артыстаў на канцэрты ў розныя краіны. Як вядомы дзеячаў, так і маладых талентаў, якім неабходна для творчага росту прызнанне за мяжой. Дзякуючы ўдалым выступленням беларускіх артыстаў многія тысячы жыхароў розных краін даведваліся пра Беларусь. Так, культура каштуе шмат, а бескультур'е абыходзіцца яшчэ даражэй. Нашы таленты — гэта залаты фонд краіны, які трэба выкарыстоўваць на яе карысць. Таму неабходна выпрацаваць дзяржаўную палітыку, якая заахвочвала б гастролі беларускіх артыстаў, праз іх майстэрства знаёміла б свет з нашай краінай, — разважаў прадстаўнік музычных колаў Валерый Уколаў.

Але трэба прызнаць, што дыскусія ішла няроўна. Часам складвалася ўражанне, што не ўсе выступоўцы дакладна ўяўляюць матэрыяльны бок рэалізацыі сваіх прапаноў. Напрыклад, усе ці амаль усе выказваліся за стварэнне культурных цэнтраў. Хто б спрачаўся наконт карысці гэтых замежных устаноў. Але ніхто не сказаў нават прыблізна пра тое, у якую капейчыну абыдзецца стварэнне станоўчага іміджу нашай краіны такім вельмі нятанным шляхам?

З гэтай нагоды мне ўспамінаецца даўняя размова з былым кіраўніком савецкага культурнага цэнтра ў Малі. Праўда, у тыя часы ў СССР хапала валюты на ўтрыманне гэткіх вельмі затратных устаноў у далёкай Афрыцы. У сталіцы Малі савецкі цэнтр уяўляў сабой прыкметную пабудову з невялікай кіназалай, класамі для заняткаў па рускай мове, адносна вялікай залай для канцэртаў. Тут даволі часта выступалі мастацкія калектывы, вядомыя артысты з СССР, якія рабілі турнэ па гэтым рэгіёне Афрыкі. Прыязджалі ў Малі пісьменнікі, паэты, мастакі.

А сам дырэктар цэнтра, як і належыць беламу чалавеку, прадстаўніку супердзяржавы, згодна з тагачаснымі ўяўленнямі, жыў у прасторных апартаментах, з садам і басейнам. Яго самога і яго сям'ю абслугоўвалі чарнакожныя прыбіральшчыцы, садоўнік, вадзіцель службовай машыны. Тады СССР літаральна ва ўсім канкурыраваў з ЗША за ўплыў на маладыя дзяржавы, а таму грошай Масква не шкадавала. Зразумела, сёння такія выдаткі, нават у некалькі разоў меншыя, наша краіна сабе не можа дазволіць. Але разам з тым перад ёй стаіць задача прасоўваць свае нацыянальныя інтарэсы сродкамі культуры і мастацтва. У гэтай сітуацыі пасол па асабліва даручэннях МЗС Беларусі Уладзімір Шчасны лічыць, што трэба больш актыўна і творча выкарыстоўваць магчымасці нашага інфармацыйнага часу, сучасныя тэхналогіі ў сферы тэлебачання, той жа інтэрнэт. Пры разумным выкарыстанні гэтых рэсурсаў можна дасягнуць значных вынікаў.

Увогуле, калі падводзіць рысу дыскусіі, то ўсе выступоўцы былі адзіныя ў думцы, што для надання працэсу ў папулярызацыі беларускай культуры за мяжой моцнага імпульсу неабходна супрацоўніцтва ўсіх зацікаўленых бакоў, як дзяржаўных ведамстваў і арганізацый, так і грамадскіх аб'яднанняў. З гэтай нагоды было выказана пажаданне правесці сумесную калегію Міністэрства культуры і Міністэрства замежных спраў, на якой будуць падведзены папярэднія вынікі дыскусіі, і распачнецца работа па стварэнні канцэпцыі папулярызацыі беларускай культуры ў свеце.

А пакуль будзе рыхтавацца гэта мерапрыемства, неабходна правесці шэраг «круглых сталоў», так бы мовіць, па інтарэсах прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі: мастакоў, літаратараў, музыкантаў, артыстаў фальклорных калектываў і г. д.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

БЕЛАРУСКІ ДЖАЗ: У ТРАМВАІ І НА ПАРАХОДЗЕ...

У Віцебску пачалі адраджаць вельмі багатыя беларускія джазавыя традыцыі. Старажылы горада, безумоўна, памятаюць, што ў 1970-я гады менавіта ў правінцыйным Віцебску праходзіў адзіны ў СССР фестываль традыцыйнага джазу «Парад дыксілендаў». У горадзе ў розныя часы хадзіў нават джазавы трамвай, а па хвалях Заходняй Дзвіны плыў «Джаз-параход». А дзякуючы фестывалю «Віцебская восень», арганізатарам якога быў цяпер добра вядомы спадар Бас — кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», і ўсяму віцебскаму джаз-руху, горад быў адзначаны на старонках «Вялікай энцыклапедыі джазу».

Цяпер спрабуюць вярнуць радзіме «базару» тое, што калісьці было страчана. У прыватнасці, нядаўна прайшоў першы джазавы вечар, галоўным героем якога стаў народны эстрадны аркестр «Дыксіленд» Цэнтра культуры «Віцебск». У канцэртнай праграме таксама ўдзельнічалі бард і кампазітар Уладзімір Цвікі, народны тэатр песні «Прасторы», уладальніца Гран-пры міжнароднага конкурсу вакалістаў «Залаты мікрафон-2010» (Казахстан) Даша Міхайлава, тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі Дыяны Юрчанка і іншыя.

Слухачоў і гледачоў многае ўразіла. Джаз можна і станцаваць. А яшчэ, аказваецца, і «Майдадыр» можна спець пад джазавую музыку.

Трамваяў у Віцебску хапае, параход пачне хутка курсіраваць. Дык прыязджайце ў Віцебск на джаз. А чаму б насамрэч падчас аднаго з будучых музычных «базараў» не правесці і джазавы фестываль?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ЗВЯЗДАРЫНАЧКА»

Працягваем вызначаць выбітных асобаў года і важныя гістарычныя даты нашай Бацькаўшчыны. Нагадаем, у адасланых нам лістах вам неабходна пазначаць усяго толькі тры адказы: якая легенда прадэманстравана на малюнку, выбітную асобу тыдня і значную падзею гістарычнага календара — у двух апошніх пунктах вы можаце прапаноўваць нават свае варыянты, што не ўваходзяць у наш спіс. Па жаданні можаце яшчэ дасылаць і адказы на пададзеныя падказкі, што таксама будзе адзначацца дадатковымі балами. Лісты ж з вашымі адказамі-прапановамі вы можаце дасылаць у рэдакцыю двума шляхамі: традыцыйна, праз пошту (з пазнакай «Звяздарыначка») на адрас рэдакцыі (220013 г. Мінск, вул. Б. Хмельніцкага, 10-а) і на рэдакцыйную электронную скрыню (info@zvyazda.minsk.by).

Вядучы рубрыкі Мікола ТАМАШЭВІЧ.

Малюнак Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.

Як вы думаеце, што за легенда адлюстравана на малюнку?

АДКАЗ НА МІНУЛУЮ ЛЕГЕНДУ

МАРЫСІН ПАРК. У легендзе апавядаецца трагічная гісторыя кахання князёўны Марысі Радзівіл і княжацкага конюха. Малады чалавек вучыў дачку ўладальніка Нясвіжскага палаца верхавой яздзе, і падчас навучання паміж 16-гадовымі падлеткамі ўспыхнула шчырае каханне. Аднак далейшы лёс князёўны ўжо быў вызначаны: яна павінна была стаць жонкай састарэлага аўстрыйскага прынца. Марыся доўга гаравала — і вырашыла ўцячы з бацькоўскага замка разам са сваім каханым. Але Радзівіл дазнаўся пра гэта і загадаў павесіць хлопца. У роспачы маладая княжна напярэдадні запланаванага вяселля з аўстрыйскім прынцам, у лютую студзеньскую ноч, патаемна збегла ў нясвіжскі парк, дзе і замерзла. Ад таго часу тое месца, дзе князёўна скончыла сваё жыццё, і называецца «Марысін парк».

ВЫЗНАЧАЕМ ПАДЗЕЮ ТЫДНЯ

Якая падзея гісторыі Беларусі з'яўляецца найбольш значнай на гэтым тыдні?

1 14 мая 1874 года ў Мінску каля гарадскога тэатра быў запушчаны першы фантан «Хлопчык з лебедзем». Скульптурную кампазіцыю планавалі ўсталяваць на год раней з нагоды правядзення мінскага водаправода з чыстай артэзіянскай вадой. Што цікава, арыгінал скульптуры быў створаны ў 1833-34 гг. майстрам па металу Тэадорам Эрнстам Калідам, за яго ён у 1851 годзе атрымаў медаль на выставе ў Лондане і замову асабіста ад самой каралевы Вялікабрытаніі. За ўсю гісторыю «Хлопчыка з лебедзем» не аднойчы спасцігалі няўдачы. Так, у 1930-х гадах «буржуазную» скульптуру новая ўлада вырашыла змяніць на «рэвалюцыйную» (што, на шчасце, не спраўдзілася), а падчас Вялікай Айчыннай сам фантан моцна пацярпеў, ад чаго Заіру Азгуру прыйшлося літаральна нанова яго перарабляць. Пазней некуды зніклі жабы, якія пускалі струмені вады на гаротную «скульптурную групу». Апошні экскцэс здарыўся ў 1981 годзе, калі нецвярозыя людзі, што купаліся ў фантане, адламалі шыю лебедзю і руку хлопчыку — так і стаіць цяпер лебедзь са скрыўленай шыяй.

2 14 мая 1995 года адбыўся першы рэферэндум у Рэспубліцы Беларусь. У якасці пытанняў былі вынесеныя тры абавязковыя і адно дарадчае. Так на рэферэндуме Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь прапаноўвалася надаць рускай мове аднолькавы статус з беларускай (зрабіць дзяржаўнай), устанавіць новыя Дзяржаўныя Герб і Сцяг Рэспублікі Беларусь, а таксама падтрымаць шлях да эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй. Дарадчае пытанне прапаноўвала ўнесці змены ў дзейную Канстытуцыю, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам. У Рэферэндуме прынялі ўдзел 64,8 % грамадзян Беларусі з правам голасу, сярод якіх адпаведна 83,3 (75,1; 83,3; 77,7) адсоткаў згадзіліся з пастаўленымі пытаннямі.

3 25 мая 1933 года пастаноўкай «Кармэн» быў адкрыты Дзяржаўны тэатр оперы і балета (сёння — Нацыянальны акадэмічны вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь). Хоць фактычна тэатр на розных пляцоўках існаваў яшчэ з 20-х гадоў, але па-сапраўднаму беларускай творчай эліце ўдалося пра сябе заявіць менавіта ў 30-я гг. першымі прафесійнымі спектаклямі «Пікавая дама», «Яўгеній Анегін» і «Чырвоны мак». Сам культавы тэатр быў збудаваны па праекце Іосіфа Лангбарда 10 мая 1939 года на Траецкай гары ў Мінску і ганарова адкрыўся айчыннай операй «Міхась Падгорны». Пасля вызвалення сталіцы ў 1944 годзе тэатр вярнуўся ў Мінск, дзе 21 снежня таго ж года распачаў сезон пастаноўкай «Алеся» на сцэне Дома афіцэраў — адрэканструяваны тэатр адкрыўся праз тры гады спектаклем «Кастусь Каліноўскі». За шматгадовую гісторыю тэатр пабываў з гастролямі ў дзясятках краін свету, чым заслужыў сабе гучнае імя «Вялікі акадэмічны». Чарговая рэканструкцыя тэатра паспяхова скончылася ў 2009 годзе.



ВЫЗНАЧАЕМ АСОБУ ТЫДНЯ

Хто з беларускіх культурных дзеячаў можа лічыцца самым выбітным у разрэзе гэтага тыдня?

1 Знакаміты кампазітар і лютніст «Залатога веку» (Рэнесансу) на Беларусі. Прыдворны музыка караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя (альбо Сцяпана Батуры, як яго называлі паміж сабой простыя людзі) нарадзіўся ў Польшчы, але яго творчы лёс звязаны ў асноўным з Вялікім Княствам Літоўскім. Верагодна, вучыўся музычнай навуцы ў кляштары, адкуль яго прагналі за «неадольную прагу да жыццёвых асалодаў». Пазней ўладкоўваецца ў двор Баторыя ў Гародні, дзе напісаў асноўныя свае творы ў папулярным на той час жанры вілянэлы. Найбольш папулярны твор — «Танец Баторы».

2 Геніяльны партрэтыст і нацюрмарыст першапачатковую мастацкую адукацыю атрымаў на факультэце вольных мастацтваў Полацкага ліцэя, па заканчэнні якога паступіў у прэстыжную Пецярбургскую Акадэмію мастацтваў, дзе навучаўся 9 гадоў. Дзякуючы сваім поспехам малады мастак неаднаразова атрымліваў медалі сваёй Акадэміі, а таксама быў узнагароджаны залатым гадзіннікам ад цара Мікалая I і стаў акадэмікам Акадэміі мастацтваў, пасля чаго вярнуўся на радзіму. У сваёй творчасці аддаваў перавагу нацюрмортам, у сюжэтах якіх ён выкарыстоўваў звычайную гародніну і садавіну: моркву, капусту, грушы, гарбузы... Мастацкі стыль мастака хутка займеў шмат прыхільнікаў і паслядоўнікаў, што паспрыяла развіццю нацюрморта ў Расійскай імперыі. У творчасці мастака ў апошнія гады жыцця пачынаецца перыяд рэлігійных твораў.

3 Мастак-авангардыст, «бацька» супрэматызму, мастацкія здольнасці якога многія параўноўвалі з творчасцю Льва Талстога, нарадзіўся ў Кіеве, дзе і вучыўся ў мясцовай Мастацкай школе. Першыя працы мастака былі напісаныя ў стылі імпрэсіянізму, пазней ён становіцца актыўным удзельнікам футурыстычных выстаў. Ад 1919 года выкладаў у Народнай мастацкай школе ў Віцебску, з'яўляўся дырэктарам Ленінградскага дзяржаўнага інстытута мастацкай культуры. Выставы мастака праходзілі ў многіх гарадах не толькі СССР, але і Заходняй Еўропы. А

Занатоўкі мастака

Манэ і Купала

Французы змаглі змінімізаваць сваю вялікую культуру да трох рэчаў: бардо, ракфор і Манэ. Чырвонае віно, блакітны сыр і святладайны жывапіс могуць годна прэзентаваць Францыю на любым узроўні. Пра тры асноўныя культурныя з'явы я згадаў, стоячы перад марскім краявідам Клода Манэ, што вісеў на выставе ў беларускім мастацкім музеі. А як можна мінімізаваць культуру Беларусі? Пасля доўгіх размоваў з сябрамі ў мяне склаўся такі спіс: дранік, «Белавежская» і Купала.

Прышвін і антывегетарыянства

Калі мой таварыш — Алесь Лось — абвясціў навіну, што ён становіцца вегетарыянцам і не будзе больш есці мёртвых жывёл і трупы пташак, я яму не паверыў. Лось без мяса пратрымаўся з месяц. Яму было соромна вяртацца да звычайных беларускіх страў, мне было няёмка назіраць за гэтым сарамлівым вяртаннем. Карацей, маё першае назіранне за вегетарыянцам стала малапрыемным успамінам. Такім жа непрыемным зрабілася і маё наведванне вегетарыянскай сталоўкі ў Барселоне. Нібыта ўсё выглядала прыстойна, нават смачнымі былі катлеты з морквы, нават вельмі бюджэтным па кошце атрымаўся абед, і разам з гэтым нешта малапрыемнае вісела ў сонечным паветры той сталоўкі. Толькі на выхадзе я зразумеў, што мой тонкаарганізаваны нос улавіў смурод ванітаў. Некага вывернула на выхадзе са сталоўкі, лужыну на ганку прыбралі і зацёрлі, але смурод яшчэ не выветрыўся. Так складалася, што сам я ніколі не хацеў стаць вегетарыянцам, а тыя вегетарыянцы, каго асабіста ведаў і бачыў, не былі шчаслівымі людзьмі. Таму, прачытаўшы ў кнізе Міхаіла Прышвіна «Вочы зямлі» такія словы: «...чыстыя істоты ў прыродзе толькі расліны, і найбольш нячыстыя — вегетарыянцы, якія жаруць самае чыстае», я парадаваўся, што знайшоў паплечніка ў сваіх антывегетарыянскіх настроях.

Шчасце і сінія тапкі

Бывае, што мне шанцуе. Заслужыў я тое шанцаванне, ці, як наш народ кажа: «Дурню шанцуе заўжды!», адразу і не вызначыш. Сваё шанцаванне я вызначаю тапкамі. Ёсць у мяне простыя тапкі adidas, звычайна-сінія, сорак трэцяга памеру. Імі я і вызначаю наяўнасць свайго персанальнага шчасця ў вялікіх гарадах. Калі я магу выйсці на галоўную вуліцу горада ў гэтых банальна-сініх тапках, значыць, мне пашанцавала, мне пакаціла, мне прэ! Зазвычай я ў гэтых самых тапках разгульваю ў мастакоўскім атэлье. А як якое падарожжа, яны выпраўляюцца ў вандроўку разам з гаспадаром, бо не люблю я хадзіць па гатэльным нумары ў шкарпэтках, а басанож зусім не хаджу, бо берагу скуру на ступаках. Таму па гатэлях у пластыкава-сініх тапках і разгульваю. Пахаджу па гатэлі, пагуляю і на вуліцу выйду. Народ увесь такі ўрачысты, народ такі парадны і радасны, народ на абцасах, а я шчаслівы і ў сініх тапках. Швейцар глядзіць на мяне і маўчыць. Швейцар у форменных бліскучых чорных чаравіках, а я ў тапках. І не соромна мне! Я ў гэтых тапках стаяў на пляцы Каталуніі ў Барселоне, бо мне моцна пашанцавала. Стаяў у Вільні на праспекце Гедыміна, бо мне крыху падфарціла. Стаяў у Мінску на праспекце Незалежнасці, бо я — незалежны паэт. А цяпер я спакаваў свае любіма-сінія тапкі, бо збіраюся пастаяць у іх на Неўскім. І пастаю, бо мне зусім мала трэба для поўнага шчасця. Абуў сінія тапкі і...

Андрэеў і «Ваўкі»

Вялікі горад нараджае вялікую літаратуру. Можа, пра якое іншае месца можна і падыскутаваць, але Санкт-Пецярбург падараваў свету найвялікшых літаратараў з напоўненымі паўночным вятрам паэмамі і аповесцямі. Адна з лепшых аповесцяў пра перадрэвалюцыйны і паслярэвалюцыйны Петраград — «Ваўкі» Васіля Андрэева. Аповесць прысвечана ўгарнаму жыццю і жудаснай пагібелі петраградскіх сладзеяў. Сам Андрэеў — асоба легендарная. Царскімі ўладамі ён быў высланы ў Туруханскі край, дзе пазнаёміўся са Сталіным, якога тады выпраўлялі па этапе ў Краснаярск. Андрэеў падарыў Сталіну свой кажух. Перад Другой сусветнай вайной Васіля Міхайлавіча Андрэева перасталі друкаваць. Ён застаўся без сродкаў. Казалі, што ён нагадаў Язэпу Сталіну пра падораны ў Сібіры кажух. Ці атрымаў пісьменнік ліст ад Язэпа? Невядома. Адно вядома, праз некалі месяцаў пасля распачатай фашыстоўскай Германіяй вайны супраць бальшавіцкага СССР Васіль Андрэеў прапаў. Як напісаў пра тое Данііл Гранін: «Выйшаў з дому і прапаў. Больш пра яго нічога невядома». Быў час у СССР, калі людзі прападалі тысячамі, знікалі без знаку і следу. Страшна, калі ты здалёк бачыш добра знаёмага чалавека і збіраешся яго паклікаць, ты адкрываеш рот, а чалавек заварочвае за рог будынка. Ён проста зайшоў за рог, ты проста не паспеў выгукнуць ягонае імя, а ўжо брэ страх і абдзімае цябе гіпербарэем. А тады выйшлі з дамоў тысячы і тысячы людзей, выйшлі і папрападалі. Сярод зніклых лічыцца і літаратар Васіль Андрэеў, які напісаў плач па зладзейскаму Піцеру і назваў яго «Ваўкі».

Чалавек з кайлом

Сімвал сучаснага Санкт-Пецярбурга — чалавек з кайлом. Жалезным ломам гэты чалавек сячэ, ломіць, крышыць лёд. Ён збівае той тоўсты лёд з ходнікаў і дахаў. Разам з лёдам кайло разбівае асфальт ходнікаў і дарог, прабівае і дзіравіць бляху на дахах, крышыць і нявечыць цэглу ды тынк карнізаў, сцен, фундаментаў. Чалавек з кайлом гучна працуе, ён б'е кайлом лёд, разам з лёдам пад ударамі кайла крышыцца, друзуецца і руйнуецца вялікі горад. Раней у Піцера меліся іншыя чалавекападобныя сімвалы: быў і цар на караблі, быў імператар на кані, быў і правадыр на браневічку, быў чалавек з ружжом, быў нават кілер з пісталетам. Цяпер паўднёвы чалавек з цяжкім кайлом зрабіўся сімвалам паўночнай расейскай сталіцы. Гэты чалавек прыехаў у белыя ночы і з-пад белага сонца Таджыкістана-Афганістана. Ён чарнавокі, цёмнаскуры, мае сінявата-чорныя валасы і руковыя пазногці. Таджык з кайлом — сімвал сучаснага ледзянога горада на Няве.

Вяртанне да будзільніка

Знудзіўся па будзільніку. Апошнім часам не бяру ў вандроўкі будзільнік, бо карыстаюся тым, што ў сотавіку. А той, які дзесяць гадоў стаіць на прыложкавай тумбачцы, цяпер, калі я выпраўляюся ў падарожжа, застаецца стаяць і чакаць. Стаіць, маўчыць, чакае... Нарэшце я прыляцеў з Санкт-Пецярбурга ў Мінск праз Маскву, бо не было прамога рэйса на Мінск. Стаміўся. Адразу лёг спаць. Прачнуўся рана. Пайшоў у лазенку апаласнуць твар і чую: ціўкае мой будзільнік, жыццярадасна так паціўкае. Я — дома! Трэба прызнацца, што я моцна сумаваў па будзільніку, а раней падавалася — не вельмі яго і люблю.

Адам ГЛОБУС.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (8 мая). Па гарызанталі: Пончык. Барытон. Лато. Кіно. Гну. Хала. Накід. Кекс. Рэтра. Вяз. Ранне. Танга. Руб. Язь. Лука. Пані. Кубак. «Церамок». «Оза». Армія. Чака. Катар. Дакар. Каса. «Нарзан». Талі. Мадальнасць. **Па вертыкалі**: Карыкатура. Кок. Ікона. Пуза. Абат. Варона. Аванс. «Ася». Ікар. Кулі. Зебу. Карта. Ангар. Імжа. Зад. Батон. Скала. Унт. Цяга. Ніл. Нарвал. Удача. Каньяк. Мак. Затока. Крэндзель. Карамель.

Сканворд + судоку (15 мая). Па гарызанталі: Спурт. Выступ. Ішак. Лал. Шво. «Яма». Гай. Харчо. Аргенціна. Аул. Мста. Пудра. Таск. Дно. Абкітоўка. Ліра. Іран. Кон. Кола. «Лес». Капуста. **Па вертыкалі:** Халадзільнік. Пешня. Мегаполіс. Ракша. Надар. Глог. Цурбак. Асілак. Оптыка. Валуй. Іон. «Хам». «Стоік». Таўро. Аскал. Памідор. Кана. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

1	7	8	2	4	5	6	9	3
9	5	6	8	3	1	7	2	4
2	3	4	6	7	9	8	5	1
7	1	2	5	6	3	4	8	9
6	9	3	1	8	4	5	7	2
8	4	5	9	2	7	1	3	6
3	2	1	7	5	6	9	4	8
5	8	9	4	1	2	3	6	7
4	6	7	3	9	8	2	1	5

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

АЎТАРСКІ-10

На гэтым майстар ФМЖД Віктар Шульга (Мінск) свой конкурс заканчвае:



№ 16. **Белыя:** a1, a7, b4, c5, d6, e1, f6, g5, h6 (9). **Чорныя:** a5, c3, d2, d4, d8, e3, f4, f8, g3, h4, h8 (11). Выйгрыш.

ПРЫСВЕЧАНЫЯ ПАМЯЦІ

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Міхаіл Міхайлавіч Станоўскі сур'ёзна займаўся не толькі рускімі шашкамі, але і міжнароднымі, не толькі самімі гульнямі, але і іх шашачнай кампазіцыяй. Дзякуючы сваім прыродным здольнасцям і працавітасці атрымаў высокія званні майстра спорту СССР, суддзі ўсесаюзнай катэгорыі. Нашы аўтары даслалі па электроннай пошце заданні, прысвечаныя яго добрай памяці, складзеныя імі як на 64-клетачнай дошцы, так і на большай, 100-клетачнай. Ва ўсіх іх белыя пачынаюць і перамагаюць:



№ 8 (Алігрант Лук'янаў, Тамбоў, Расія). **Белыя**: f6, g5, дамка a5 (3). **Чорныя**: a7, c7, d6, h4, дамка d8 (5).

№ 9-12 (Пётр Шклудаў, Наваполацк). **Белыя**: 7, 18, 19, 25, 30, 42 (6). **Чорныя**: 9, 15, 29, 31, 37, 41 (6).

Белыя: 29, 39, 40, 41, 42, 43, 44, 46 (8). **Чорныя**: 8, 9, 10, 18, 23, 28, 30, 31 (8).

Белыя: 15, 22, 23, 33, 41, 43, 47 (7). **Чорныя**: 8, 11, 14, 17, 20, 21, 24 (7).

Белыя: 26, 31, 34, 39, 40, 41, 42, 44, 48 (9). **Чорныя**: 8, 9, 10, 18, 28, 33, 38, 43 (8).

МАШТАБНАЯ КАМБІНАЦЫЯ

Дзмітрый Слячарчык (Гродна) за 12 кааператыўных хадоў прыйшоў да такой пазіцыі:

Белыя: 25, 26, 30, 35, 37, 39, 40, 41, 42, 43, 44, 45, 47, 50 (14). **Чорныя**: 7, 8, 9, 14, 15, 17, 19, 21, 22, 23, 27, 28, 29, 33 (14). Тут правадзіцца маштабная камбінацыя. Пашукайце яе ў рамках **бліца-54/2**.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскі-10/13 (В. Шульга): f6 (g5) e7 (c7) c5, g3, b8, g3, c3, g5x.

Мемарыял Станоўскага: № 2 (П. Шклудаў) — h6 (cb6) cd6 (c5) b4, fe3, e7, h6 (Панкратаў)x.

Бліц-53/6 (А. Рогач—А. Абрамаў): 19. ... ed2 20. c1:e3 f4:d2 21. cd4! з пагрозай 22. d4-e5=.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.01	21.12	16.11
Віцебск —	4.45	21.08	16.23
Магілёў —	4.51	21.02	16.11
Гомель —	4.55	20.51	15.56
Гродна —	5.17	21.26	16.09
Брэст —	5.25	21.19	15.54

Месяц

Першая квадра 21 мая.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Дзяніса.*

К. *Іны, Мікалая, Пятра.*

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+15..+19°С	КІЕЎ	+16..+18°С	РЫГА	+15..+19°С
ВІЛЬНЮС	+18..+24°С	МАСКВА	+16..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+20..+25°С

19 мая

1520 год — 490 гадоў з часу нараджэння Мацея Кавячынскага, беларускага кнігавыдаўца, перакладчыка, дзеяча Рэфармацыі. У 1540-х гадах вучыўся ў Вітэнбергскім універсітэце. З канца 1550-х жыў у Беларусі. Заснаваў порт на р. Узда, папяровую фабрыку ў Нясвіжы. Удзельнічаў у рэфармацыйным руху ў Літве, Польшчы і Беларусі, займаўся распаўсюджваннем выданняў сярод беларускага і ўкраінскага насельніцтва. У 1561-62 гадах сумесна з С. Будным і Л. Крышкоўскім заснаваў Нясвіжскую друкарню, дзе, сярод іншых, былі надрукаваны першыя пратэстанцкія выданні на беларускай мове «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам», пераклады «Святога Пісання». Аўтар прадмоў да некаторых нясвіжскіх выданняў. Памёр у 1572 годзе.

1888 год — у Злучаных Штатах упершыню была прадэманстраваная першая грамафонная пласцінка.

«Адна машына можа выканаць работу пяцярых звычайных людзей, але ніводная машына не выканае работу аднаго генія».

Лафает Рон Хабард (1911—1986), амерыканскі пісьменнік.

Карупцыі стане меней?

Нараканні на недахоп грошай у структурах культуры даводзіцца чуць часта.

Але калі пракуратура Брэсцкай вобласці правяла праверку ва ўпраўленні культуры аблвыканкама і падпарадкаваных яму арганізацыях, то выявіла парушэнні антыкарупцыйнага заканадаўства, якія былі дапушчаны пры правядзенні конкурсаў, тэндараў і аўкцыёнаў у аддзелах культуры Пінскага гарвыканкама, Іванаўскага, Жабінкаўскага райвыканкамаў, а ў Ляхавіцкім раёне 14 работнікаў прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці. Акрамя гэтага, у дачыненні да асобаў устаноў і арганізацый культуры было заведзена 9 крымінальных спраў. Гэта было ў мінулым годзе, але сёлетні відавочна будзе больш ураджайны, бо ўжо заведзена 5 крымінальных спраў, з якіх адна праходзіць як службовы падлог, а астатнія — крадзеж шляхам выкарыстання службовых паўнамоцтваў.

Цікавасць выклікае адзін эпізод з дзейнасці абласной пракуратуры.

На семінары, арганізаваным аблвыканкамам для галоўных архітэктараў гарадоў і раёнаў вобласці, начальнікаў аддзелаў архітэктуры і горадабудаўніцтва выступіў пракурор Брэсцкай вобласці С. Хмарук. Ён праінфармаваў прысутных пра тое, што ў першым квартале 2010 года на Брэстчыне было выяўлена 122 карупцыйныя злачынствы, 50 службовых падлогаў, 7 фактаў хабару, 44 крадзяжы... Загадаў пракурор і аб разнастайных парушэннях антыкарупцыйнага заканадаўства ў сістэме Мінбудархітэктуры.

Архітэктары выслухалі выступленне пракурора, а затым разам з ім пайшлі ў следчы ізалятар № 7 МУС па Брэсцкай вобласці і пазнаёміліся на месцы з яго дзейнасцю і ўмовамі ўтрымання ў ім.

Такім чынам пракуратура вобласці рэалізуе нетрадыцыйныя формы работы па прафілактыцы карупцыйных праяў і папярэджванні злачынстваў.

Можа, новыя метады работы пракуратуры неабходна праверыць не толькі на архітэктарах?..

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Спецыфічная фільматэка

На ждановіцкім рынку канфіскаваная буйная партыя фільмаў «для дарослых»

«Клубнічкай на любы густ на свой страх і рызыку падзараблялі на жыццё 24-гадовы прадавец гандлёвага пункта па продажы DVD-дыскаў і 22-гадовы гаспадар гэтага пункта. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, паводле аператыўных звестак, прадпрымальны бізнэсовец не толькі рэалізоўваў парнаграфію праз свой гандлёвы аб'ект, але і забяспечваў падобнай прадукцыяй калег «па цэху».

Пасля таго, як у ходзе праверачных мерапрыемстваў пацвердзілася інфармацыя наконт незаконнай дзейнасці згаданых дзялкоў, іх затрымалі. Пры вобыску пад прылаўкам у гандлёвым пункце была знойдзена асобная каробка з асартыментам з 19 відэадыскаў з парнаграфіяй. Пасля ў аўтамабілі прадпрымальніка было канфіскавана яшчэ 200 дыскаў, а ў шапіку, які выкарыстоўваўся пад склад, — 800. Калі супрацоўнікі міліцыі пабывалі дома ў гаспадара гандлёвага пункта — у кватэры дома 13 па вуліцы Русіянава, то там была знойдзена і камп'ютарная тэхніка, на якой, як мяркуецца, множылася забароненая прадукцыя. Акрамя непасрэдна камп'ютара з вялікай калекцыяй порнафільмаў быў канфіскаваны і прынтар, на якім раздрукоўваліся маляўнічыя вокладкі, спецыяльнае абсталяванне для абрэзкі ўкладышаў і партыя чыстых дыскаў. Затрыманым пагражае пазбаўленне волі да трох гадоў.

Ігар ГРЫШЫН.

Культасвета

БЕЛДЗЯРЖЦЫРК ЗАВЯРШАЕ СЕЗОН ЭКЗОТЫКАЙ І РЫХТУЕЦЦА ДА ПЕРАЕЗДУ

Клоўн Яўген ШМАРЛОЎСКІ.

21 мая сталічны цырк запрашае гледачоў на новую праграму «Міжнародны цырк экзотыкі». Паколькі гэта апошняя прэм'ера не толькі ў сезоне, але і на «палявой» пляцоўцы цырка-шапіто, артысты абяцаюць паказаць усё самае цікавае, яркае і разнастайнае. Напрыклад, адной з «разынак» праграмы стане выступленне патомнага клоўна з Германіі, рускага па паходжанні, таму яго жарты для беларускай публікі будуць бліскія і зразумелыя. Яшчэ адна адметнасць — вялікая колькасць акрабатаў і гімнастаў, у тым ліку нумар «Крумкачы» праслаўленых беларускіх турністаў, якія ў свой час упрыгожылі мюзікл «Прарок».

Бадай, самым відовішчным (хоць і самым дарагім) абяцае быць экзатычнае шоу факіра-араба з Егіпта, чый псеўданім — Osama Dangerous («Асама Небяспечны») — гаворыць сам за сябе. Гэты артыст за шэраг унікальных пастановак трапіў нават у Кнігу рэкордаў Гінеса. «У яго няма ілюзій, трукаў, як, скажам, у маёй прафесіі, — адзначае галоўны рэжысёр Белдзяржцырка Серж Бандарчук, — гэта сапраўдная барацьба за выжыванне: шаблі, глытанне агню, хаджэнне па шклу і г. д. Праўда, сярод нумароў у ягонай каманды ёсць шакіруючыя элементы, а ў нас усё ж асноўная публіка — маленькія дзеці, таму мы зладзім папярэдні прагон гэтага шоу, каб выключыць страту прытомнасці сярод гледачоў і магчымыя праблемы з пажарнай інспекцыяй». Усяго ж у праграме «Міжнароднага цырка экзотыкі» каля 20 нумароў на самыя розныя густы — ад гумарыстычных рэпрыз да цудаў сілы і спрытнасці, ад «прыземленых» конных скачак да палётаў пад купалам. Гэтая праграма працягнецца да канца чэрвеня.

Цяперашні намёт цырка-шапіто вернецца назад у Польшчу, але ўвогуле шапіто з беларускай прасторы не знікне — адзін з айчынных бізнэсменаў набыў новы італьянскі комплекс з вялікай глядзельнай залай і плануе ягоны пракат па рэспубліцы.

А потым... цырк рыхтуецца да пераезду: ужо ў верасні запланавана адкрыццё пасля капрамонту новага будынка, дакладней, цэлага комплексу, на які і адміністрацыя, і самі артысты ўскладаюць мноства спадзяванняў.

«У новым будынку будуць створаныя ўсе ўмовы для камфортнай работы трупы і ўсяго абслугоўваючага персаналу, — кажа Серж Бандарчук, — плануецца, што там зможа працаваць калектыў у 400—500 чалавек. У прыватнасці, пабудаваны ўжо другі, рэпетыцыйны, манеж, вакол якога размешчаны ўтульныя грымёрныя з душам, ёсць вялізная балетная зала на 300 квадратных метраў, ёсць трэнажорныя залы. А механіка асноўнай сцэны, прывезеная з Германіі і Чэхіі, дазволіць адначасова паказаць, напрыклад, цыркавое шоу на арэне, на лёдзе і на вадзе, а пры жаданні — эстраднае шоу на спецыяльнай падлозе, якая зіхаціць і пераліваецца, — уяўляеце? Я ўжо бачыў новыя крэслы — вельмі прыгожыя, аксамітныя, са зручнымі падлакотнікамі — ні ў адным цырку свету не бачыў такіх».

— У сувязі з тым, што цырк стане больш сучасным і камфортным, многія ўжо цяпер хвалююцца, што гэта адаб'ецца на цане білетаў...

— Мы неаднаразова абмяркоўвалі гэта пытанне (напрыклад, усе ведаюць, што пасля рамонту крыху падняліся цэны ў Оперным тэатры) і прыйшлі да высновы, што кардынальна цэны мяняцца не будуць. Магчыма, паспрабуем узяць сваё большай колькасцю спектакляў. Усё ж публіка, якая ходзіць у цырк, далёка не ўся належыць да катэгорыі забяспечаных. Разам з тым адзначу, што ў мінскім цырку — самыя танныя білеты ў свеце; для параўнання, на першы і апошні рад у еўрапейскіх цырках білеты каштуюць па 20—40 еўра, а ў нас самая высокая цана — 25 тысяч рублёў. Адчуйце розніцу.

— У новым будынку будзе больш месца не толькі для людзей, але, напэўна, і для артыстаў-жывёл. У сувязі з гэтым ці плануеце вы набываць новых жывёл, рыхтаваць з імі нумары?

— Ведаеце, каб сур'ёзна займацца жывёламі, патрэбны таленавітыя дрэсіроўшчыкі — калі такія аб'явяцца, натуральна, мы знойдзем магчымасці набыць тых ці іншых жывёл. Скажам, нядаўна нам прапаноўвалі двух слаоў, але мы адмовіліся, бо ў нас няма каму імі займацца. Патрэбны энтузіясты: так, адна з нашых дрэсіроўшчыц, Лілія Максіменка, шмат гадоў хадзіла ў цырк на вахту і літаральна праслася, каб ёй далі магчымасць працаваць з жывёламі. І дабілася свайго — сёння яна цудоўна працуе і з сабачкамі, і на слане верхам можа праехаць... А ў перспектыве мы хацелі б займацца не з экзатычнымі, а з нашымі, беларускімі жывёламі, якія водзяцца ў нашых лясах — стварыць нумар, скажам, з совамі, буслам, ваўкамі... Але гэта справа доўгая і карпатлівая, будзем развівацца, а там паглядзім.

— Ходзяць чуткі, што ў абноўленым цырку адкрыецца адмысловая студыя — каб улюбёным у цыркавое мастацтва на даводзілася штурмаваць вахту, а можна было адразу займацца абранай справай...

— Ведаеце, я нядаўна аб'ехаў шэраг цыркавых студый, але асабліва ўразіла адна — дзіцячая цыркавая студыя «Арэна» ў Мазыры, дзе зусім маленькія дзеці, якім 5—7 гадоў, выконвалі сапраўды прафесійныя трукі. У Белдзяржцырку таксама абавязкова будзе свая студыя, у нас ужо ёсць людзі, здольныя падрыхтаваць новае пакаленне цыркавых кадраў — думаю, запросім і педагогаў са студыі «Арэна», і ветэранаў цыркавога мастацтва з усёй Беларусі.

— Асабіста вы гатовы ўзяць да сябе вучняў?

— Я неяк рыхтаваў аднаго хлопца — паказваў трукі, даваў чытаць спецыяльную літаратуру. Але ён вельмі хацеў займацца, быў літаральна апантаны. Калі такія ахвотныя з'явяцца, з задавальненнем буду займацца.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прадастаўлена Белдзяржцыркам.



Гімнастка на трапецыі Кацярына ШАЎРЫНА.

Дзве даты

Цытата дня:

САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ФАКТАРЫ, якія ўплываюць на лёс чалавека

Акрамя важных фактараў часу, якія маюць як стабільны, так і дынамічны характар, на лёс чалавека могуць аказваць уплыў сацыякультурныя фактары, якія даволі шырока прадстаўленыя ў фальклорных крыніцах.

● Так, калі ў адзін дзень у сям'і хтосьці паміраў (праходзілі пахаванні) і нараджалася дзіця, то гэтае супадзенне ўспрымалася як прадказанне недаўгавечнасці нованароджанага. Парадзісе трэба было абавязкова раніцай і ўвечары на працягу дзевяці дзён пасля пахаванняў чытаць малітву Багародзіцы і разнастайныя словы-абярэгі.

● І наадварот, калі пры нараджэнні дзіцяці ў хаце пражываў чалавек даволі сталага ўзросту, так званы доўгажыхар, то жыццё ў дзіцяці будзе вельмі шчаслівым і даўгавечным.

● Шчаслівым лічылася і тое дзіця, у дзень нараджэння якога ў сям'і быў яшчэ які-небудзь прыбытак, напрыклад, ацялілася карова, ажарабілася кабыла, адбылася загадзя вызначаная вялікая купля і да т. п.

● Самым надзейным знакам шчасця, па народных паданнях, была так званая «дзіцячая кашуля» — фрагменты жывой тканіны ў выглядзе тоненькай плёнкі, якія маглі застацца на галаве або целе дзіцяці. Яе акуратна «здымалі», сушылі і захоўвалі як талісман, які прыносіць поспех. Пра людзей, у якіх у жыцці ўсё складваецца добра насуперак жыццёвым перыпетыям, у народзе гаварылі: «У кашулі нарадзіўся».

● Лічылася, што дзіця, якое нарадзілася з доўгімі валасамі, будзе багатым і шчаслівым.

● Нягоды абяцалі дзіцяці, калі яно з'яўлялася на свет уніз тварам, наперад нагамі або абвітае вакол шыі пупавінай. Лічылася, што ўсё жыццё яно будзе раздзіраць гэтыя нябачныя путы, якія будуць ускладняць пошук свайго месца пад сонцам (у сям'і, у вучобе, на працы). Маці неабходна «адчытваць» такое дзіцяці да года. Калі пупавінай была абкручаная дзяўчынка, то чытаюць малітвы і замовы-абярэгі ў жаночы дзень (серада, пятніца, субота), калі хлопчык — у мужчынскі дзень (панядзелак, аўторак, чацвер).

● Лічылася, што дзеці, народжаныя ў буру, будуць заўсёды стварацьвакол сябе перадумовы «буры» ва ўзаемаадносінах з людзьмі і ў сваіх паўсядзённых паводзінах: яны будуць крыклівыя, нявытрыманыя, непаслухмяныя і, як вынік, нешчаслівыя. Таму народныя лекары раілі падмешваць святую ваду пасля Вадохрышча ў ночы пры купанні.

● У народзе верылі, што незаконнанароджанае дзіця будзе ўдачлівым і шчаслівым. Мала таго, яно і навакольным будзе прыносіць поспех і шчасце. Да такога дзіцяці заўсёды з задавальненнем ішлі ў хросныя бацькі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дарагую **Ганначку ЯРАШЭВІЧ** з Астраўца, студэнтку Гродзенскага медуніверсітэта, віншуем **з юбілеем** і жадаем дзявочага шчасця, поспеху у вучобе.

Алена і Вольга.

Усміхнемся!

— Ды ну яго, гэты Егіпет! Ён мне Маскву нагадвае...

— У сэнсе?

— Ну, кожны пяты — рускі.

☺

Ходзяць чуткі, што на перадачы «Чакай мяне» ёсць адмысловы ангар, дзе трымаюць зніклых людзей.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2401. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12